Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Літаратура і Мастацтва

№ 33 (2976)
17 жніўня 1979 г.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

Выдаецца 1932 г.
Цана 8 кап.



ГАРЭЗНІЦА (салістка народнага ансамбля танца «Вязанка» інжынер Мінскага маторнага завода Ірына Папова ў танцы «Юрачка»).

Фота Я. МЯЦЕЛІЦЫ.

# ДЗЕЙНІЧАЙЦЕ, АРХІТЭКТАРЫ!

Дзяржбуд БССР, выканком Мінскага гарадскога Савета народных дэпутатаў, Саюз архітэктараў і Саюз мастакоў БССР аб'явілі рэспубліканскі конкурс на праект будынка філіяла Цэнтральнага музея У. І. Леніна. Яго намечана ўзвесці на Цэнтральнай плошчы Мінска.

Збудаванне гэта павінна быць унікальным як у горадабудаўнічым і функцыянальным, так і ў архітэктурна-мастацкім плане. Акрамя традыцыйных для музеяў экспазіцыйных залаў з зонамі адпачынку, рабочымі пакоямі, сховішчамі, тут неабходны кіналекцыйная зала, памяшканне для паказу тэлепраграм, аўдыторыя семінараў, бібліятэка з чытальнай залай, лабараторыі, майстэрні.

Для аўтараў лепшых праектаў, прадстаўленых на конкурс, устаноўлены адна першая, дзве другія, дзве трэція і тры заахвочвальныя прэміі і дыпломы.

Створана журы, у састаў якога ўвайшлі лаўрэат Ленінскай прэміі, прафесар Маскоўскага архітэктурнага інстытута Н. Н. Улас, старшыня Дзяржбуда Беларусі, народны архітэктар СССР У. А. Кароль, народны мастак СССР М. А. Савіцкі, народны пісьменнік БССР І. П. Шамякін і іншыя вядомыя творчыя работнікі і грамадскія дзеячы. Узначальвае журы намеснік старшыні Савета Міністраў рэспублікі М. В. Кавалёў.

Будынак музея У. І. Леніна і манумент барацьбітам за Савецкую ўладу, на праект якога аб'явіла конкурс Міністэрства культуры СССР, завершаць архітэктурна-мастацкі ансамбль плошчы — традыцыйнага месца народных шэсцяў, дэманстрацый і парадаў, грамадска-палітычнага цэнтра беларускай сталіцы.

Згодна з пастановай ЦК КПБ і Савета Міністраў БССР, на працягу 1980—1985 гадоў павінна быць ажыццёўлена праектаванне і будаўніцтва музея.

БЕЛТА.

# ЭКРАН МІРУ І ДРУЖБЫ

Вялікае ўздзеянне перадавога кінамастацтва на духоўны свет чалавека, на развіццё ўзаемаразумення і ўмацаванне давер'я паміж народамі і дзяржавамі. Іменна такім высокім мэтам служыць Маскоўскі кінафестываль, на сцягу якога напісана: «За гуманізм кінамастацтва, за мір і дружбу паміж народамі!».

Гэты высакародны дэвіз забяспечвае кінафоруму ў савецкай сталіцы велізарную папулярнасць ва ўсім свеце. 104 краіны, а таксама ААН, ЮНЕСКА, Арганізацыя вызвалення Палесціны, патрыятычныя сілы Чылі — такое кола ўдзельнікаў XI Міжнароднага кінафестывалю, які адкрыўся 14 жніўня ў Маскве.

Урачыстае адкрыццё фестывалю адбылося ў Дзяржаўнай цэнтральнай канцэртнай зале. Тут сабраліся вядомыя дзеячы сусветнага кіно, кіраўнікі нацыянальных кінематаграфій, прадстаўнікі савецкай грамадскасці.

Працяглымі апладысментамі сустрэлі прысутныя прывітанне таварыша Л. І. Брэжнева ўдзельнікам і гасцям XI Маскоўскага міжнароднага кінафестывалю. Прывітанне зачытаў старшыня аргкамітэта фестывалю, старшыня Дзяржкіно СССР Ф. Т. Ярмаш.

Ад імя савецкіх майстроў экрана з адкрыццём фестывалю яго ўдзельнікаў павіншаваў першы сакратар праўлення Саюза кінематаграфістаў СССР Л. А. Куліджанаў.

Затым старшыні міжнародных журы конкурсаў: кінарэжысёр С. І. Растоцкі (па мастацкіх фільмах), кінарэжысёр А. М. Згурыдзі (па кароткаметражных фільмах), пісьменнік А. Г. Алексін (па дзіцячых фільмах) — прадставілі гледачам арбітраў фестывальных аглядаў — вядомых кінематаграфістаў і грамадскіх дзеячаў з многіх краін.

Пад гукі ўрачыстага марша падымаецца флаг XI Маскоўскага міжнароднага кінафестывалю.

Конкурсны экран першага дня прадставіў работы мексіканскіх і шведскіх майстроў — карціны на сучасную тэму «Разарваны флаг» і «Сцены свабоды».

У гэты ж дзень у «Зараддзі» адкрыўся фестываль кароткаметражных фільмаў.

Нашай будучыні — дзецям прысвечаны дакументальныя фільмы, створаныя кінематаграфістамі Балгарыі, Венгрыі, ГДР, Калумбіі, Польшчы, Чэхаславакіі, паказаныя ў гэты ж дзень. Знамянальна, што да гэтай тэмы ў Міжнародны год дзіцяці звяртаюцца майстры экрана многіх краін.

Фестывальны марафон прыняў старт.

І. ВЕКСЛЕР,
В. ДЖАЛАГОНІЯ,
кар. ТАСС.

# ВІНШУЕМ!

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР за заслугі ў развіцці беларускага опернага і балетнага мастацтва, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці прысвоены званні народнага артыста Беларускай ССР:

ДЗЕДЗІКУ Аляксандру Аляксандравічу—салісту оперы.
ЕЛІЗАР'ЕВУ Валянціну Мікалаевічу—галоўнаму балетмайстру.
ТРАЯНУ Юрыю Антонавічу—салісту балета.

Заслужанага артыста Беларускай ССР:

ЗДАНЕВІЧУ Міхаілу Аляксандравічу—салісту оперы.
ІВАНОЎСКАМУ Уладзіміру Іванавічу—салісту оперы.
ПЯСЦЕХІНУ Сяргею Іванавічу—салісту балета.
СІНЕЛЬНІКАВАЙ Людміле Мікалаеўне—салістцы балета.

●

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР за вялікія дасягненні ў развіцці самадзейнай творчасці і актыўны ўдзел у рабоце па камуністычнаму выхаванню працоўных ганаровае званне заслужанага дзеяча мастацтваў Беларускай ССР прысвоена СМІРНОВУ Ігару Глебавічу — мастацкаму кіраўніку і балетмайстру народнага ансамбля «Палессе» Пінскага ГДК.

Ганаровыя званні заслужанага работніка культуры БССР:

БАЖЭЛКУ Аляксандру Апанасавічу — артысту народнага тэатра Пінскага ГДК.

ГАРБУКУ Вісарыёну Сцяпанавічу — пісьменніку.

# ІДУЦЬ СЮДЫ ЛЮДЗІ...

Старыя дрэвы берагуць памяць аб днях, што прашумелі над іх кронамі, аб падзеях, што пакінулі адмеціны-маршчыны на іх шурпатых камлях...

Ёсць такія дрэвы і ў парку імя Янкі Купалы. Старыя, ніцыя вербы памятаюць паэта. Яны бачылі, як выходзіў ён са свайго драўлянага дамка і паволі, пастукваючы кавенькай, аб нечым засяроджана думаючы, ішоў між іх. І, можа, таму мы з такім хваляваннем праходзім каля гэтых нешматлікіх дрэў, з хваляваннем падыходзім сюды, дзе стаяў дом Купалы, дзе цяпер знаходзіцца Літаратурны музей песняра.

З раніцы да вечара няспынна ідуць у музей людзі, ідуць у госці да паэта. Людзі розныя, з усіх куткоў нашай краіны, з усіх куткоў свету: з малдаўскага сяла і палескай вёскі, з кубанскай станіцы і горнага аула, са спакутаванага В'етнама і сонечнай Балгарыі, з далёкага Непала.

«Дзякуй за цудоўную, мілагучную, родную Купалаву мову. Яна наўздзіў блізкая і зразумелая нам», — чытаем у кнізе водгукаў запіс, пакінуты харкаўскімі рабочымі.

«Здаецца, што пабывалі ў гасцях у самога Янкі Купалы, сустрэліся з паэтам. Павязём у нашу маленькую сонечную краіну часцінку душы беларускага народа»,—запісалі ў гэтай кнізе балгарскія студэнты. А іх равеснік з далёкага Непала прызнаўся: «Я шчаслівы, што ў мяне на Зямлі з'явіўся яшчэ адзін блізкі і неабходны мне чалавек — беларускі пясняр Янка Купала».

Зноў і зноў бачу твары дзесяткаў людзей, бачу іх вочы. Вось цяплее позірк блакітных вачэй нямецкага рабочага, загараецца агеньчык цікаўнасці ў стомленых вачах пажылой японкі, сур'ёзнеюць усмешлівыя твары в'етнамскіх юнакоў... Зноў і зноў думаецца пра тое, якою магічнай сілай павінна валодаць слова чалавека, каб быць зразумелым, даступным і неабходным людзям усяго свету, каб яно знайшло шлях за межы свайго краю, стала духоўным здабыткам усяго чалавецтва.

Х. ЛЯЛЬКО.

# КОЛАС, УЗВАЖАНЫ СЭРЦАМ

Зараз жніво на палях Бярозаўскага раёна, як і паўсюль у рэспубліцы, у поўным разгары. Усе 18 гаспадарак жнуць збажыну. Выкарыстоўваюцца ўсе магчымасці, каб у полі не засталося ніводнага каласка.

Працаўнікі калгаса «Новы шлях» першымі ў раёне прыступілі да ўборкі хлеба. Высокі тэмп узяў мінулагодні пераможца камбайнер Мікалай Бранько. Яго экіпаж—сямейны. Разам з бацькам працуе і сын Мікалай. Больш важкім становіцца з кожным днём іх намалот.

На палях калгаса «Лескавічы» ўвесь дзень у полі працуе шэсць камбайнаў, дзе шырока прымяняецца іпатаўскі метад. І ў гэтай гаспадарцы ёсць перадавікі спаборніцтва. Выдатна працуе камбайнер Пётр Юркевіч. Яму не раз уручалі пераходны вымпел працоўнай славы.

На здымках: па-іпатаўску працуюць камбайны на палях Міхалінкаўскай брыгады калгаса «Новы шлях»; пераможца сацыялістычнага спаборніцтва на жніве камбайнер калгаса «Новы шлях» Мікалай Бранько; вымпел перадавому камбайнеру калгаса «Лескавічы» Пятру Юркевічу ўручае галоўны інжынер А. Вяршыка.

М. АСКІРКА.

## З КНІГАЙ ПА ЖЫЦЦІ

Падведзены вынікі Усесаюзнага спаборніцтва народных кніжных магазінаў. У ліку пераможцаў—калектыў такога магазіна Брэсцкага завода газавай апаратуры. Яму прысуджана ганаровая грамата Дзяржкамвыда СССР і ЦК прафсаюза работнікаў культуры.

Адзначана работа калектыву народнага кніжнага магазіна «Дзвіна» Віцебскага вытворчатэхнічнага аб'яднання «Маналіт» па прапагандзе і распаўсюджванні грамадска-палітычнай літаратуры.

БЕЛТА.

## ПАПАЎНЯЕЦЦА КНІЖНЫ ФОНД

З кожным месяцам папаўняецца кніжны фонд Клічаўскай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы. Так, толькі за першае паўгоддзе сюды паступіла 9449 кніг. У пераважнай колькасці гэта палітычная, тэхнічная, мастацкая, сельскагаспадарчая літаратура. 7766 кніг паступіла ў сельскія філіялы сістэмы. Асабліва папоўніліся кніжныя паліцы ў Бацэвіцкім, Нясяцкім, Дзмітраўскім, Акцябрскім філіялах.

Зараз у бібліятэчным фондзе Клічаўскага раёна — 329524 кнігі. Прыемна адзначыць і тое, што за гэты час значна павялічылася і колькасць аматараў кнігі.

І. СЦЯПУРА.

## НАВІНЫ БРЭСТА

У БРЭСЦЕ ПРАЙШОЎ ФЕСТЫВАЛЬ ваенна-патрыятычнай песні «Рытмы граніцы-79», у якім прынялі ўдзел вакальна-інструментальныя ансамблі гарадоў-герояў. Фестываль быў прысвечаны 35-годдзю вызвалення Брэста ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Галоўны прыз фестывалю журы аднадушна прысудзіла вакальна-інструментальнаму ансамблю «Арыён» з Севастопаля. Гэты калектыў, які носіць званне «народны», вылучае высокая вакальная і сцэнічная культура, яго ўдзельнікі пастаянна ўдасканальваюць сваё майстэрства.

Лаўрэатамі сталі таксама вакальна-інструментальныя ансамблі «Валгаградцы» з Валгаграда і «Рытмы граніцы» з Брэста.

●

ЖЫВАПІС, ГРАФІКА, СКУЛЬПТУРА, ПРЫКЛАДНОЕ МАСТАЦТВА — больш чым 80 работ маладых мастакоў Брэстчыны прадстаўлены на выстаўцы, якая адкрылася ў гарадской выставачнай зале. Ваенна-патрыятычная тэма, героіка працоўных будняў, прыгажосць роднай прыроды—такая асноўная тэматыка прадстаўленых на выстаўцы твораў. Выстаўка выклікала вялікую цікавасць у жыхароў і гасцей горада над Бугам.

У. МАКАРЭВІЧ.

# ЗБРОЯЙ СМЕХУ

Беларускія кінематаграфісты з пачатку дзейнасці нашай студыі вялі творчы пошук. І пяцьдзесят гадоў назад яны пазнаёмілі грамадскасць з творам у жанры сатырычнага гратэску на сучасную тэматыку. Гэта быў фактычна першы вопыт увасаблення палітычна надзённай праблемы ў кінасатыры. Мастацкая стужка ў шасці частках «Джэнтльмен і певень» сваім пафасам была скіравана супраць гістарычнай несправядлівасці—падзелу Беларусі граніцай, якая аддавала пад уладу пілсудчыкаў значную частку тэрыторыі. Сярод стваральнікаў гэтага арыгінальнага твора былі народны мастак РСФСР У. Ягораў, вядомы пазней аператар заслужаны артыст БССР А. Кальцаты, яго калега М. Казлоўскі, які быў вядомы тады як аператар, што рабіў здымкі выступленняў У. І. Леніна на III і IV кангрэсах Камінтэрна. Узначальваў кінаэкспедыцыю «Джэнтльмен і певень» вопытны мастак і рэжысёр Уладзімір Балюзак. Гледачы з цікавасцю сустрэлі савецкі сатырычны фільм, які з поспехам канкураваў з замежнымі камерцыйнымі камедыйнымі стужкамі. Смешныя пасажы і забаўныя сітуацыі, у якія траплялі персанажы, завастралі думку аб тым, што штучная граніца, цераз якую перагукаюцца пеўні, павінна знікнуць з карты адзінай Беларусі, роўнай сярод роўных рэспублік СССР. Умоўна-гратэскны стыль асабліва ўдала быў уплецены ў выяўленчую партытуру твора тагачаснага Белдзяржкіно. Прэм'ера фільма адбылася ў 1929 годзе.

В. ІВІН.

## ПРАПАНУЕ ВЫДАВЕЦТВА «НАРОДНАЯ АСВЕТА»

Побач з выданнем спецыяльнай вучэбнай і метадычнай літаратуры «Народная асвета» выпускае і мастацкую літаратуру, у тым ліку кніжкі беларускіх пісьменнікаў.

Серыя «Школьная бібліятэка» папоўніцца ў будучым годзе кнігамі Я. Брыля «Апавяданні», І. Навуменкі «Сасна пры дарозе», П. Панчанкі «Лірыка», К. Чорнага «Трэцяе пакаленне», а серыя «Народныя пісьменнікі БССР» — працай М. Яроша «Пятрусь Броўка» (нарыс жыцця і творчасці народнага паэта, лаўрэата Ленінскай прэміі).

У раздзеле «Літаратура для навучэнцаў» прапануюцца для пачатковых класаў творы пісьменнікаў: Я. Бяганскай «Зосіна зорачка», М. Герчыка «Дзе жывуць чараўнікі», Х. Жычкі «Дружбы прыклад яркі», В. Хомчанкі «Тваё чэснае слова».

У раздзеле «Наглядныя дапаможнікі» выйдуць «Альбом-выстаўка ў школе» Т. Шамякінай і кніга В. Каваленкі «Жыццё і творчасць Івана Шамякіна».

## У САЮЗНЫМ ДРУКУ

СЁМЫ НУМАР ЧАСОПІСА «ТЕАТР» змясціў пад рубрыкай «Праблемы музычнага тэатра» артыкул М. Эльяша «Патрабавальнасць» аб гастролях у Маскве Беларускага тэатра оперы і балета. Адзначыўшы наяўнасць сур'ёзнага рэпертуару, павагу да аўтарскіх задум і высокую музычную культуру калектыву, тэатразнавец падкрэслівае, што беларускім оперным спектаклям наканавана доўгае сцэнічнае жыццё, іх прэм'ерныя фарбы з гадамі не паблякнуць. Прычына таго — высокі артыстызм, зацікаўленасць дырыжораў не толькі ў стройным гучанні аркестра і хору, але і ў яркім сцэнічным дзеянні, у вобразным увасабленні музыкі. Аўтар падкрэслівае і яшчэ адзін важны момант у дзейнасці тэатра—выдатнае вытлумачэнне героіка-гістарычных твораў. Высокую ацэнку атрымалі і вядучыя артысты тэатра — С. Данілюк, А. Дзедзік, І. Шынунова, І. Сарокін, А. Саўчанка і інш. У заключэнне аўтар адзначае: «Мяняюцца выканаўцы, многія творы па розных прычынах не вельмі часта трапляюць на афішу. І тым не менш у беларусаў няма «неахайных» спектакляў, паспешліва складзеных выканаўчых ансамбляў».

●

У РАЗДЗЕЛЕ «РАЗБОРЫ і РАЗВАГІ» ў сёмым нумары часопіса «Литературное обозрение» В. Івашчанка рэцэнзуе кнігу А. Адамовіча «Кузьма Чорны», выпушчаную выдавецтвам «Художественная литература».

У гэтым жа нумары Н. Кодак разглядае даследаванне Н. Гілевіча «Верная вялікім запаветам. Сучасная балгарская паэзія. 1956—1976», што выйшла ў выдавецтве Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна.

## САМЫМ МАЛЕНЬКІМ

Самым маленькім адрасуецца казка «Мышка», напісаная лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі БССР і Міжнароднай прэміі імя Андэрсена Васілём Віткам, якая выйшла на Украіне ў выдавецтве «Веселка». Маляўнічa афармленая мастачкай Верай Марозавай, кніжка выпушчана ў выглядзе раскладнога альбома, што робіць яе асабліва цікавай для дзіцячага ўспрымання.

## У ЧАСОПІСЕ «КУБА»

Чарговы, сёмы, нумар грамадска-палітычнага і літаратурна-мастацкага часопіса «Куба» прысвечаны 26-й гадавіне Кубінскай рэвалюцыі. Шэраг матэрыялаў, змешчаных у ім, расказвае аб культурным жыцці Савецкага Саюза, аб дружбе савецкага і кубінскага народаў.

Сярод паэзіі ўвагу прыцягвае падборка твораў лаўрэата Дзяржаўнай прэміі БССР і прэміі Ленінскага камсамола рэспублікі Рыгора Барадуліна. Яго вершы «Віва, Куба!», «Падарунак камбрыга», «Плуг Фідэля» на рускую мову пераклаў Валянцін Тарас.

## ГАЛАСЫ МАЛАДЫХ

Дванаццаты нумар літаратурнага альманаха «Сузір'я», што выходзіць у кіеўскім выдавецтве «Дніпро», цалкам прысвечаны творчасці маладых пісьменнікаў братніх рэспублік Савецкага Саюза. У яго ўвайшлі творы, у якіх шматгранна раскрываецца багаты свет нашага сучасніка, дружба савецкіх народаў-братоў, імкненне іх да міру на зямлі. Змешчаны таксама артыкулы аб асноўных напрамках развіцця маладой шматнацыянальнай савецкай літаратуры і мастацтва.

Беларусь у альманаху прадстаўляюць С. Законнікаў, В. Казько, К. Камейша, Г. Каржанеўская, Г. Пашкоў, А. Салтук. Іх творы на ўкраінскую мову пераклалі Р. Лубкіўскі, В. Сідарэнка, А. Жолдак, У. Каламіец, В. Тэрэн.

І. ФЁДАРАЎ.

## ПАМЯЦІ ЦІМОХА СЯРГЕЙЧЫКА

На доме № 25 па вуліцы Суворава ў Віцебску адкрыта мемарыяльная дошка ў гонар народнага артыста БССР, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі СССР Цімоха Мікалаевіча Сяргейчыка. Яна гаворыць пра тое, што ў гэтым доме на рагу вуліц Урыцкага і Суворава вядомы беларускі акцёр жыў з 1955 па 1974 гады.

А. АРБЕНІН.

## ЧАЛАВЕК І ЯГО СПРАВА

Новы фільм «Задума», створаны ў творчым аб'яднанні «Летапіс» кінастудыі «Беларусьфільм», прысвечаны народнаму мастаку БССР А. А. Анікейчыку.

Гледачы «пабываюць» у майстэрні скульптара, пачуюць яго расказ аб творчасці, убачаць мемарыяльны комплекс «Прарыў» ва Ушацкім раёне, помнік Янку Купалу ў Мінску, скульптуру «Вясна перамогі» ў Дзяржаўным мастацкім музеі БССР, многія іншыя творы майстра.

Над стужкай працавалі — сцэнарыст А. Белавусаў, рэжысёры М. Заслонава, А. Гедравічус, аператары Ф. Кучар і С. Пятроўскі.

## З ДАЛЁКІХ ПАДАРОЖЖАЎ...

Калектыў народнага цырка Гомельскага шклозавода імя М. В. Ламаносава вярнуўся з гастрольнай паездкі па Чэхаславакіі. Самадзейныя майстры арэны два тыдні дэманстравалі сваё майстэрства ў Чэске-Будзёвіцы і іншых гарадах Паўднёва-чэшскай вобласці.

Заключнае выступленне гамяльчан паспяхова прайшло ў Пражскім палацы спорту.

## НАПЯРЭДАДНІ ПРЭМ'ЕРЫ

Пінскі народны тэатр працуе над пастаноўкай п'есы І. Гоф «Рамонак без пялёсткаў». Прэм'ера спектакля прымяркоўваецца да адкрыцця новага тэатральнага сезона.

Тэатр нядаўна адзначыў сваё 25-годдзе. У рэпертуары калектыву звыш шасцідзесяці спектакляў: «Паўлінка» Я. Купалы, «Рускія людзі» К. Сіманава, «Трывога» А. Петрашкевіча і іншыя творы.

## НА ТУРЫСЦКІХ МАРШРУТАХ

Вучні Брэсцкай сярэдняй школы № 14 — члены турыстычнай секцыі клуба «Алімпіец» — зрабілі паход па цэнтральнаму Каўказу. Ён быў прысвечаны Міжнароднаму году дзіцяці і 35-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Школьнікі перасеклі перавалы, дзе ў гады Вялікай Айчыннай вайны ішлі жорсткія баі, зрабілі цікавыя экскурсіі ў Сочы, Адлер, іншыя гарады.

Пасля завяршэння паходу быў арганізаваны працоўны дэсант у калгас «Расія» Адлерскага раёна. Школьнікі дапамаглі ва ўборцы садавіны, працавалі на палях.

БЕЛТА.

## НЕЗВЫЧАЙНЫЯ ВЫКАНАЎЦЫ

Савецкі кінематограф пачынаўся з творчых пошукаў. Жанравыя эксперыменты, наватарства ў мантажы, аператарская смеласць, выкарыстанне непрафесійных артыстаў — гэта здабыткі самых першых фільмаў нашай краіны. Дастаткова сказаць, што Белдзяржкіно ў 20-ыя гады знаёміла гледачоў з гісторыка-рэвалюцыйнымі драмамі «Кастусь Каліноўскі», «Яго яснавяльможнасць», «Атэль «Савой», з прыгодніцкімі стужкамі паводле мастацкай прозы «Лясная быль» (па аповесці «Свінапас» М. Чарота), «Песня вясны» (на сюжэт аповесці «На прасторах жыцця» Я. Коласа), з пазнавальным фільмам для дзяцей «Жывыя дамы». Імёны аператараў М. Казлоўскага, Д. Шлюглейта, А. Кальцатага, Н. Навумава-Стража вядомы кожнаму, хто цікавіцца гісторыяй экраннага мастацтва. Затое не ўсе помняць, што ў творах Белдзяржкіно даваенных гадоў і «Беларусьфільма» пасляваеннага перыяду здымаліся непрафесійныя выканаўцы роляў. І пачалося гэта з «Лясной былі», дзе Грышкам быў юны энтузіяст фотасправы Л. Данілаў, які браў удзел у дзесяці кінакарцінах, а потым быў вядомым фотажурналістам і стала працаваў у рэдакцыі часопіса «Советская женщина». У тым жа фільме рэжысёр Ю. Тарыч прыцягнуў да непасрэднага ўдзелу ў здымках тагачаснага старшыню Савета Народных Камісараў БССР І. А. Адамовіча, старшыню ЦВК БССР А. Р. Чарвякова і загадчыка агітпропа ЦК ВКП(б) В. Г. Кнорына, якія выступілі ў ролях кіраўнікоў штаба партызанскага руху часоў грамадзянскай вайны.

Іграллі ролі ў творах Белдзяржкіно маладыя тады рэжысёры У. Корш-Саблін («Лясная быль») і С. Сплашноў («Адбітак часу»); фільмаграфія далёка не заўсёды называе вобразы, створаныя славутым М. Чаркасавым на пачатку кар'еры ў кінакарцінах «Яго яснавяльможнасць», «Шчасце», «Хто твой друг?» (паводле аповесці П. Броўкі «Каландры»), «Першае каханне». Упершыню ў кінацітрах былі названы імёны знакамітых пазней майстроў эстрады К. Шульжэнка і У. Каралі (ролі Веры і Косці Мігуцкага ў «Хто твой друг?»), А. Райкіна (Рубінчык у фільме «Вогненныя гады»). Вядомы шахматыст і тэарэтык шахмат Марк Тайманаў быў надзвычай кінагенічным і натуральным Янкам у музычнай камедыі «Канцэрт Бетховена» (другая назва — «Юны прафесар»). Школьнікі прыцягваліся да здымкаў у галоўных ролях фільмаў «Палескія рабінзоны», «Дзеці партызана», «Дзяўчынка шукае бацьку», «Паланез Агінскага», «Іван Макаравіч», «Міколка-паравоз», «Вялікі трамплін». Вядомы артыст балета Вялікага тэатра СССР Марыс Ліепа сыграў сваю першую «размоўную» ролю ў «Магіле льва».

Л. ВАЛІГУРА.

## СЦІПЛАГА ТАЛЕНТУ ДАР

Будучыя ткачыхі.

Нядоўгім было жыццё беларускага мастака Пятра Раманоўскага, кароткі і яго творчы шлях. Аднак усё тое, што зроблена ім, пазначана сталым роздумам над жыццём, уменнем перадаць нашчадкам яркасць і непаўторнасць яго. Працуючы сціпла, але шчодра дорачы людзям свой талент, ён пакінуў многія карціны, якія ўспрымаеш як па-свойму прывабнае мастакоўскае сведчанне самога часу. Сярод іх такія творы, як «Партрэт рабочага Ю. Іванова», «Партрэт А. Г. Кір'янава», карціна «З дзядзькам на рыбалку» (аб маленстве народнага песняра Якуба Коласа), а таксама шматлікія пейзажы, якія адлюстроўваюць непаўторныя краявіды нашай зямлі.

Усё лепшае, што створана П. Раманоўскім, дэманструецца ў залах Саюза мастакоў БССР, на выстаўцы, прысвечанай памяці мастака. Першы сакратар праўлення Саюза мастакоў БССР Л. Шчамялёў, адзін са старэйшых мастакоў Х. Ліўшыц, наведвальнікі гаварылі ў час адкрыцця выстаўкі аб тым, што дар сціплага таленту П. Раманоўскага служыў і заўсёды будзе служыць роднаму народу, якому мастак прысвяціў сваё жыццё і творчасць.

## У ПРАЦЭСЕ СТАНАЎЛЕННЯ

У дваццаць дзевятым годзе дэбютаваў на сцэне драматург Дзмітрый Курдзін. Тагачасны Першы БДТ (цяпер Акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы) пазнаёміў грамадскасць з яго п'есай, прысвечанай будням Чырвонай Арміі, — «Міжбур'е». Свежасць назіранняў, каларытныя характары, надзённасць праблематыкі спрыялі шырокай папулярнасці спектакля, які неўзабаве быў з трыумфам паказаны на Усесаюзнай тэатральнай алімпіядзе 1930 года ў Маскве. Стары дзеяч бальшавіцкай партыі Фелікс Кон і вядомы кінарэжысёр Усевалад Пудоўкін на старонках маскоўскай прэсы выказвалі захапленне беларускай сцэнай і высока ацэньвалі «Гуту» і «Міжбур'е» ў рэжысуры Еўсцігнея Міровіча. Армейская тэматыка і жыццёвая сутнасць п'есы Д. Курдзіна вывелі яе на падмосткі Цэнтральнага тэатра Чырвонай Арміі, пасля чаго «Міжбур'е» ставілася ў Растове-на-Доне, Ульянаўску, Туле, Данецку, Баку, Казані, Сталінградзе, Благавешчанску. Гэта быў першы такі значны ўсесаюзны рэзананс на твор беларускага драматурга пяцьдзесят гадоў назад.

У 1932 годзе Трэці беларускі дзяржаўны тэатр у Гомелі паказаў другую п'есу надзённай тэматыкі Д. Курдзіна «Контратака» (рэжысёр К. Саннікаў), дзе канфлікт будаваўся на выкрыцці варожай агентуры, якая рыхтуе дыверсіі ў разліку на ваенную інтэрвенцыю супроць СССР. «Чалавек вырашае» — так называлася трэцяя п'еса гэтага аўтара, якую ў 1934 годзе рэжысёр В. Дарвішаў паставіў на сцэне Другога БДТ (Акадэмічны тэатр імя Якуба Коласа).

Названыя творы сведчылі аб плённым звароце беларускай савецкай драматургіі да актуальных праблем жыцця. Яны давалі багаты матэрыял для акцёрскіх работ, сярод якіх выдатнымі былі выступленні ў ролях У. Крыловіча, У. Уладамірскага, У. Кумельскага, А. Хахлова, Д. Ільчанкі, У. Дзядзюшкі, Б. Платонава, К. Быліча.

Маршал Савецкага Саюза Р. Я. Маліноўскі ў сваіх мемуарах, прыгадваючы ўражанні ад спектакля ЦТЧА «Міжбур'е», заўважыў, што п'еса і цяпер, у пасляваенныя гады, можа служыць выхаванню патрыятычных пачуццяў у гледача, асабліва армейскага.

А. ЛІПЕНЬ.

## НАШ ГОСЦЬ — НІКАЛАЙ ХРЫСТОЗАЎ

Нікалай Хрыстозаў — вядомы балгарскі паэт і празаік, лаўрэат Дзімітраўскай прэміі, заслужаны дзеяч культуры НРБ.

Нарадзіўся ён у 1931 годзе ў сяле Ракоўскі (цяпер Дзімітраўград). Закончыў аддзяленне балгарскай філалогіі Сафійскага універсітэта. Нейкі час выкладаў літаратуру ў школе, працаваў рэдактарам на радыё ў Сафіі і ў Маскве, быў намеснікам галоўнага рэдактара часопіса «Обзор» (выходзіць на замежных мовах) і часопіса «Септэмври». У апошнія гады з'яўляецца сакратаром партыйнай арганізацыі Саюза пісьменнікаў Балгарыі.

Нікалай Хрыстозаў выдаў кнігі вершаў «Першыя песні» (1958), «Сцягі не ацяжарваюць» (1965), «Дзевятнаццаць песень пра Цвятана Зангава і адна пра нас» (1966), «Нядрэмнасць» (1969), «Трэцяя планета» (1971), «Раннее маўчанне» (1975), дакументальныя аповесці «Абавязак жыць» (1968) і «Па слядах бясследна прапаўшых» (1972). Апошняя з названых кніг набыла вялікую папулярнасць, вытрымала ў Балгарыі ўжо чатыры выданні, перакладзена на рускую мову. Па сцэнарыі, зробленым Н. Хрыстозавым паводле гэтай аповесці, рэжысёр Маргарыт Ніколаў паставіў шматсерыйны тэлефільм, які атрымаў выключна высокую ацэнку грамадскасці. Кіраўнік партыі і дзяржавы Тодар Жыўкаў у студзені мінулага года адрасаваў аўтарам фільма спецыяльнае пісьмо, у якім назваў гэты твор «сур'ёзнай заваёвай сацыялістычнага кінамастацтва».

Нікалай ХРЫСТОЗАЎ

### *Радзіма*

А можа, я нямы, што дум замнога?
Што надта гукаў шмат — мой верш маўчыць?
Даўно за поўнач.
На лістку ж нічога —
адно вачыма спісаны, ляжыць.

Так,
голас твой я сёння ўчуць няздольны.
Ты не пазвала ў высь сваю мяне.
Там засталася, у акне бяздонным,
недасягальная,
як і раней, —
з крыламі белымі хрыбтоў паднебных,
з вянком лясоў зялёных пасярод,
з чырвонаю маўклівасцю, што ў нетрах,
як спадчына, зарыта ў дні нягод...

Такі ж твой сцяг — агромністы,
далёкі
ад мітусні пустой, ад гучных фраз,
які схіляецца над намі толькі
аднойчы:
калі ў дол хаваюць нас.

### *Заклінанне*

Не абмінай, не абыходзь «люблю цябе»,
прамоўленага шэптам ці вачыма.
Яно ідзе з пустынных далячыняў,
з ім — раненай зары праменні льюцца.

Не абмінай, не абыходзь «люблю цябе»,
бо як яно твайго не знойдзе сэрца —
сусвет ад смутку-жальбы здрыганецца,
ад крыўды зоры цемрай апаўюцца.

Вастры свой слых на боль і на трывогу,
усім нутром, усёй душой улоўлівай
блуклівы знак адданасці любоўнай...

А як не збудзіцца жаданы водгук?

Спыніся зноў — не абмінай: хай добра
запомняць вочы ўсё: і твар, і постаць,
хай на цябе нагледзяцца удосыць..

Каб хоць у снах пасля ляпіць твой вобраз.

З балгарскай пераклаў
Ніл ГІЛЕВІЧ.

# ЛЮБВІ МАЁЙ ВЫТОК

Мікола ФЕДЗЮКОВІЧ

●

О, колькі ўпала на зямлю лісця!
Калі б усё, што вырастае звеку,
было не падуладна чалавеку,
спыніўся б ход актыўнага жыцця?

Не, не! Такі наўкол кругаварот,
такая ўсюды прага раўнавагі,
што кожны ліст апалы без развагі
ўсё аддае наступнаму — штогод.

Ды новае, наступнае лісцё,
шкада, не помніць аб мінулагоднім,
прыбітым да зямлі дажджом халодным.

Мы — не лісцё. Аб продках забыцце
не стане нашай прышласці асновай
ні ў дзень асенні, ні парой вясновай.

●

Мне б вашы вусны — мёд бы піў
ды запіваў гарбатай,
адну-адзіную любіў
і быў бы тым багаты.

Мне б вашы вочы — іх, як вы,
не апускаў бы долу;
ад іх світальнай сінявы
не цьмеў бы свет ніколі!

Мне б вашы рукі — прад маной
іх не падняў бы ўгору;
сябры віталіся б са мной
у радасці і ў горы.

Мне б ваша сэрца — на далонь
не пакладу я сэрца.
Не для таго яго агонь,
каб мог нягоднік грэцца!

За кожны позірк свой і рух,
за думку ў кожнай фразе,
за чысціню душы і рук
я прад людзьмі ў адказе.

●

І думкам, і жаданням дома
ў дажджлівы дзень — маркотна, цесна.

Я ў лес іду, бо мне вядома:
там пошум дрэў развее стому,
там перальецца сум у песню...

## Вянок

Гваё аблічча,
голас за фіранкай —
як таямнічы
велічны матыў,
што на імгненне
выхаплен маланкай
з высокай
навальнічнай нематы.

Святло далёкіх
непарушных зорак
і сон
кароткі, —
як узмах павек,
духмян раллі,
звон коласа ў дазоры —
усё з табой,
спрадвеку
і навек!..

І ціша валасоў —
бы снег глыбокі,
і дотык пальцаў,
што на схіле дня —
як промні
ў запаволеных аблоках
знямела
заравеюць да відна;

і спёка вечаровых,
пекных вуснаў,
і ўзлёт
шчымлівай лёгкасці
ў руках —
усё табой
вянчаецца,
як вусцем
вянчаецца
майго жыцця рака!

●

Ні бляск маладзіковы на вадзе,
ні пах баравіковае паляны,
ні з клёна ліст, чырвоны і каляны,
што на змярканні долу ападзе,

ні золкі вецер, млявы кагадзе,
ні звон у садзе яблыкаў крамяных,
ні пошум ямбаў пад рукой рахманай,
якімі верш мой гутарку вядзе, —

нішто... ніхто сягоння ўжо мяне
сваім дыханнем, гукам не кране,
я сам, клянуся, з месца не скрануся,

пакуль не буду ведаць: ёсць адна
лагодная душа, што да відна
мяне чакае ў непрытворнай скрусе.

●

Я не магу, каханая, нічым
утаймаваць душэўную палярнасць;
ты — дня майго засмужанага радасць,
я — боль твае маланкавай начы.

Усё ў мяне з табой упершыню:
уранку — споведзь, вечарам —
прычасце...

Мы — дзве ракі, напоўненыя шчасцем,
мы—дзве рукі, што мкнуцца ў вышыню.

Я — сноў тваіх і летуценняў цень,
ты ж — зорка найвялікшае жадобы,
якая мне відна і ў хмарны дзень.

Яна гарыць агнём жывой аздобы,
каб я ніколі не губляў надзей —
ні ў час уцех, ні ў журны час жалобы!

●

Ізноў зіма скавала ў дрэве сок!
Адзін лісток, што нават вецер — міма,
прымёрз да дрэва... О, забыты ўсімі
адзін-адзіны леташні лісток!

Ці ж не такі маёй любві выток?
Бязмоўны лісцік — мне, як напамінак
аб навальнічна-велічных галінах...
За летам — восень. За вітком — віток.

Ізноў тваё, каханае, гарэнне
ратуе, ахвяруючы, карэнне
маіх садоў ад маразоў глухіх...

Я бласлаўляю рух, як чалавечнасць.
Маё жыццё — кароткае, як міг,
твая любоў — бясконцая, як вечнасць!

На возеры Мястра.

Фота А. ГЛІНСКАГА.

Хведар ЧЭРНЯ

## Мой сад

За яблыкамі у чарзе стаю,
Забыўшыся пра нудны час і цэны.
І ўспамінаю вёсачку сваю —
Маленькую, як ручаёк вясенні.

Бліжэй да лесу, можа, каб вятры
Страху не задзіралі і не дзёрлі,
Хаціна наша. Побач клён стары
Ды кветнікі, акружаныя дзёрнам.

І так у кожнага: то вяз, то бэз.
Казалі, на сады зямля не родзіць.
А так хацелася... І цераз лес
Хадзілі мы ў сады чужыя шкодзіць.

І я надумаў: дубчыкі ўсяго
Высаджваў асцярожна і захутваў,
Выпрошваў у зімы для іх снягоў,
А на прадвесні дрэўцы ўсе адхукваў.

Цяпла ж хапіла, мусіць, не для ўсіх,
А можа, так чаго ім не ставала.
Астатнія ўзраслі. Нехай там іх
І па-суседску бульба абганяла.

Цяпер ён сад. І шчодры, што купец,
Які не прадае, а аддае ўсё.
На столькі вёсак — першы маладзец,
І прыгажун. І з пчоламі ўжо спеўся.

І сёння, сад мой, мне сказаць пара
(Не часта бачымся, і я сумую),
Ніколі людзям не шкадуй дабра,
Таксама, як і я ім не шкадую.

## Галасы на плёнцы

Маёй радні нядрэнна поле родзіць:
Прывецяць хоць у Таліне ці ў Мінску.
Радня. Але не тая, што знаходзіць,
Каб вымучыць сталічную прапіску.

Няма ўжо многіх, як не стала дзеда.
А для мяне іх свет — адушаўлёны,
Бо скуль было ім ведаць за бяседай,
Што ёсць падслухачы-магнітафоны.

І ў час, калі душу нуда з'ядае,
Ці надакучыць гарадская проза,
Я слухаю радню сваю, якая
У застоллі гаману вядзе цвяроза.

Я слухаю.
А вочы ясна бачаць,
Як за грашок мяне бабуля цвічыць,
Як дзядзька на дрывотніку ішачыць,
А цётка штось у бражніку хімічыць.

Я слухаю — і на душы святлее.
Другі настрой. Другі жыццёвы тонус.
Шкада, што дзеда, скрыпача-Мацея,
Ні музыку не запісаў, ні голас.

І так заўжды.
І горкай сірацінай
Сябе я не лічу: радні багата.
І ўсё ж прыходзіць, нібы стрэл, часіна...
І плёнкі застаецца малавата...

## Медыцынская сястра

А мне ўяўляецца: паранены ляжыць
І побач з ім дзяўчынка-невялічка.
І трызніць ён, і стогне, і крычыць,
І раптам — ціха, ласкава: сястрычка.

Напэўна, быў ён чалавекам дабраты
І самым міласэрным быў, напэўна.
...Нашэсці ворага, грымотныя франты,
А галасок сястры спяваў напеўна.

Пасля вайны Айчыннай...
Колькі год прайшло!
І хей не знае свет нейтронных штучак.
Сястрычкі пастарэлі. Даўняе сплыло.
Пра тое — толькі ў памяці для ўнучак.

Сястра, сястрычка. Слова гэта і цяпер
Ласкае слых у больніцах, палатах.
...Яшчэ зусім дзяўчо. І, можа, кавалер,
Калі ён ёсць, дык служыць у салдатах.

Яна ж лятае, кружыцца, як матылёк,
Да кожнага і ўсюды паспявае.
Каму глыток вады, ці ўкол, ці парашок,
Каго пяшчотай слова сагравае.

І я назваў яе сястрычкай. Залатой!
І хвор прайшла, і на душы лагодна.
І гэта гаварыў дзяўчыне той,
Хто ні адной сястры не мае роднай.

# НА ВЫСОКАЙ ТРАГІЧНАЙ НОЦЕ

ПРАЗ УСЮ ТВОРЧАСЦЬ Івана Навуменкі, кранаючы нас глыбока асабістай усхваляванасцю розуму і сэрца, то заціхаючы, то набіраючы новую сілу, праходзіць адна звонкая, трывожна-шчымлівая нота, адна душэўная дамінанта ў славу гераічнага пакалення семнаццаці- дзевятнаццацігадовых, «якое смела хадзіла ў атакі і хораш кахала». Зноў і зноў вяртаецца пісьменнік у сваё гераічнае і трагічнае юнацтва, да свайго любімага героя, рамантыка і жыццялюба, ідэаліста ў лепшым сэнсе гэтага слова: не баючыся паўтарыцца, працягвае традыцыю праўдзівай, задушэўна-пранікнёнай размовы пра хлопцаў самай вялікай вайны. І прычына гэтага звароту не ў зведанасці і абжытасці матэрыялу, яна больш глыбокая і сур'ёзная.

«З майго класа на фронт пайшло шаснаццаць чалавек, вярнулася толькі чатыры», «...ляжаць яны, хлопцы дваццаць чацвёртага і дваццаць пятага года нараджэння, у брацкіх магілах ля вёсачак і безыменных вышынь ад Дняпра да нямецкай Эльбы...» Гэта з біяграфіі пісьменніка. І гэта не забываецца. Асабістая жыццёвая драма, якая ў І. Навуменкі зліваецца з драмай народнай, святая памяць пра загінуўшых таварышаў не даюць яму права маўчаць, яны выклікаюць да жыцця яго прозу, з кожным новым творам узмацняючы яе трагедыйна-паэтычнае гучанне.

Трагічна склаўся лёс і герояў новага рамана пісьменніка «Смутак белых начэй». На Карэльскім перашыйку, дзе вяла баі Савецкая Армія ў пераможным сорак чацвёртым, многія з хлопцаў-местачкоўцаў, былых школьных дружбакоў, прынялі свой апошні бой. На жорсткай, камяністай зямлі, кожны метр якой «прашываўся мінамі і кулямі, успорваўся снарадамі і асколкамі жалеза і каменю», у імя Радзімы і будучых пакаленняў, у імя велічнай перамогі здзейснілі яны свой неўміручы подзвіг. І далучаючы нас да бессмяротнасці тых, хто аддаў сваё жыццё ў імя жыцця на зямлі, смуткуе аўтар аб кожным загінуўшым...

Новы раман — гэта і праўдзівы дакумент, і споведзь-роздум. У ім узнаўляюцца рэальныя факты і падзеі на Карэльскім фронце, які ў 1944 годзе здымаў пятлю блакады з Ленінграда з заходняга і паўночнага, фінскага боку, вызваляў Петразаводск, старажытны Выбарг, вёў зацятыя баі на Вуоксе. Адсюль ідуць праўдзівыя, як бы дакументальна зафіксаваныя сцэны баёў, ва ўсіх дэталях і падрабязнасцях, у суровых фарбах паказваецца быт ваеннага часу.

Аднак раман не абмяжоўваецца толькі рэальна ўбачаным. Яго значна пашырае споведзь аўтара, удзельніка тых падзей, спаўна ацаніўшага гераізм навекі дзевятнаццацігадовых юнакоў, яго роздум аб адказнасці чалавека перад будучым, яго пратэст супраць вайны.

Аблічча вайны заўсёды крывавае, жорсткае, бязлітаснае. Таму пры яе адлюстраванні пісьменнік не мог не паказаць пакут, смерцяў, пагібелі людзей. На самай высокай трагічнай ноце абрываецца жыццё спагадлівага і добрага сэрцам Косці Русаковіча, гінуць у пякельным агні філосаф і «стратэг» Васіль Лебядзь, перасмешнік і балагур Косця Ціток, далікатны, з уражлівай душой Ладураў... Але трагічнае гучанне лёсу маладых хлопцаў пераадольваецца (і ў гэтым заключаецца аптымізм рамана) сцвярджэннем сілы іх духу, правоты справы, за якую яны аддалі жыцці, сцвярджэннем тых ідэйных і духоўных каштоўнасцей, якія робяць чалавека героем.

Трагічны лёс герояў рамана ўспрымаецца намі як лёс гераічны, бо ён асветлены высокім сацыяльным сэнсам. Ідэя абароны Радзімы, яе ідэалаў, народжаных Кастрычнікам, стала для герояў Навуменкі той вялікай ісцінай, якая дапамагла пераадолець жаданне захаваць сябе — для сям'і, маці, любімай.

Толькі на адно імгненне перад тым, як закрыць вогненны струмень кулямётнага агню, пахіснулі Косцю Русаковіча прамільгнуўшыя ў памяці словы Насці: «Сцеражыся на вайне. Вярніся. Увесь век буду любіць. Даражэйшага чалавека, чым ты, у мяне не было і не будзе».

Іншага выйсця, чым пайсці на свядомую смерць, не знайшоў і Рагамед. «Наперадзе ажывае не знішчаны, абыдзены танкамі, самаходкамі браніраваны каўпак. Сее смерць. Вакол голы, як бубен, пляц — не падабрацца да каўпака... Рагамед ні страху, ні жалю да сябе не адчувае. Настала яго чарга... На вайне часта бываюць моманты, калі, каб выратаваць другіх, астаецца самому памерці...»

Разумеючы небяспечнасць задання, якое выконвала штурмавая група па вызваленні астравоў Б'ерскага архіпелагу, напрошваецца ў добраахвотнікі і таксама гіне малодшы лейтэнант Мамедаў...

Гераічныя паводзіны юнакоў не становяцца для чытача нечаканасцю, а набываюць псіхалагічную пераканаўчасць, дзякуючы таму, што аўтар змог на працягу рамана паказаць, як спакваля прарастала гераічнае ў іх характары, прасачыць сувязь гераічных паводзін юнакоў з іх даваеннай біяграфіяй.

І маналогі герояў, якія звернуты ў мінулае (аўтар шырока карыстаецца прыёмам рэтраспекцыі), і іх шчымліва-пакутлівыя ўспаміны пра бацькоўскі дом, школьныя гады, першае каханне, і лірычныя адступленні ў многім раскрываюць вытокі гераічнага.

Праўда, аўтару часам бракуе строгага адбору фактаў. І ў канву твора трапляе неабавязковае, малазначнае. Відаць, гэта абумоўліваецца тым, што пісьменнік не можа выкрасліць з сваёй удзячнай памяці нават самага дробязнага. Для яго ўсё, што звязана з біяграфіяй яго пакалення, мае сэнс. І гэта ў пэўнай ступені апраўдвае мастака.

Па характары кампазіцыі раман адносіцца да так званага «жывапісальнага» тыпу. У ім няма развіцця дзеяння ў «эпічным» разуменні, няма ярка акрэсленай канфліктнай сітуацыі, жорстка арганізаванага сюжэта, як гэта мы звычайна бачым у В. Быкава ці Ю. Бондарава. Ход падзей пісьменнік узнаўляе непаспешліва, імкнучыся як мага паўней паказаць жыццё ў яго «непасрэднай зададзенасці». Аўтарскае апавяданне як бы складаецца з асобных мініяцюр, аб'яднаных адной думкай-ідэяй — раскрыць паэзію звычайнага, выявіўшы ў ёй істотныя заканамернасці. (Дарэчы, такі падыход да рэчаіснасці, а менавіта апафеоз яе без вымыслу і домыслу — адна з асаблівасцей эстэтыкі пісьменніка).

Вось чаму так многа ўвагі аддадзена ў творы (асабліва ў яго першай частцы) раскрыццю паэзіі паўсядзённага ва ўмовах ваеннага быту, характарыстыкам кожнага з герояў, выяўленню іх настрояў, думак, эмоцый, перадачы гутарак, спрэчак, паказу будняў вайсковай падрыхтоўкі і г. д. Усё гэта дапамагае пісьменніку пазнаць чалавека, даследаваць рух яго характару, адшукаць у ім ісціну.

Несумненна, найбольш выразна гэта ісціна выяўляецца ў эпізодах самога бою. Умела спалучаючы прыватнае з агульным, выпадковае з неабходным, мастак здолеў паказаць у іх чалавека ва ўвесь рост. Такім, якім ён можа і павінен быць у выключных абставінах. У гэтым сэнсе псіхалагічна пераканальныя паводзіны Мялешкі, Чубукова, Русаковіча, Сяргея.

Не толькі сілу, але і слабасць свайго героя вытлумачвае мастак праўдзіва і доказна. Даведзены да адчаю смерцю сваіх сяброў. Сяргей забывае на ўсё. Востры боль і невыносны сум «скоўваюць яго ланцугамі халоднай абыякавасці да жыцця». У свядомасці пульсуе толькі адна адчайная думка — памерці. «Думка прарэзалася назаўтра: ён не хоча жыць. Навошта жыць? Агітаваў таварышаў ехаць на фронт у адной маршавай роце. Паслухалі яго. Цяпер яны мёртвыя, ён жывы. Не мае права жыць.

Ён не можа ўявіць, як прыедзе ў мястэчка, што скажа, калі сустрэне маці Васіля Лебедзя, Косці Цітка ці іншых таварышаў. Таварышы ляжаць у зямлі, ён прыедзе. Дзеля чаго?..

Думка аб тым, што сёння ці заўтра ён загіне, прыносіць задавальненне. Дзіўна ён сябе адчувае: няма жаданняў, крыўд, страху, чаго-небудзь другога, што б звязвала яго з пясчанай, камяністай зямлёй, на якой ліецца кроў, людзі бязлітасна забіваюць адзін другога.

Ціўкаюць, свішчуць кулі. Высунуўшыся з траншэі, ён чакае... Стаіць і нецярпліва чакае, калі гарачы асколак нарэшце ўвап'ецца ў грудзі, прынясе збавенне ад халоднага, невыноснага суму...».

Матыў смерці, разбуранага чалавечага шчасця і надзей гучыць у рамане сурова і драматычна, і, на першы погляд, ён нават мацнейшы, за матыў жыцця. Здавалася б, чаму не паказаць пісьменніку лёс герояў не такім трагічным. Але тады была б парушана жыццёвая праўда. Амаль усё яго пакаленне засталося там, на палях Вялікай Айчыннай. Таму і выбраў пісьменнік самы бязлітасны, самы горкі варыянт і для героя, і для сябе як аўтара, і для чытача, вышэйшым прынцыпам адлюстравання ў творы зрабіўшы праўдзівасць, праўдзівасць «да немагчымасці схлусіць — не толькі ў чымсьці істотным, але нават у самым малым». Але менавіта гэта нараджае высокую чалавечнасць твора, яго высокі аптымізм, усяляе веру ў чалавека, яго сілу і жыццяздольнасць.

Раман «Смутак белых начэй» —адкрыццё яшчэ адной невядомай старонкі ў гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, арыгінальны, выпакутаваны аўтарам твор. Ён сведчыць аб тым, што мастацкі свет пазнання ў творчасці Івана Навуменкі пашырыў свае граніцы. І тэматычна, і стылёва яго проза ў многім узбагацілася, набыла большую ёмкасць і эмацыянальную выразнасць. Стала відавочным імкненне празаіка да аб'ектывізаванага пісьма, да сінтэзу лірычных форм тыпізацыі з эпічным спосабам індывідуалізацыі і абагульнення. Іншым стаў сам лад твора. У ім пераважаюць драматычныя інтанацыі, напружанае, дынамічнае дзеянне.

Па-іншаму падыходзіць празаік і да вырашэння праблемы гераізму. Калі ў папярэдніх творах пра Вялікую Айчынную вайну, у прыватнасці, у апавяданнях і трылогіі, ён паказаў свайго героя ва ўмовах цяжкага працяглага гераізму падпольнай барацьбы, прасачыў сам працэс выспявання гераічнай свядомасці, то ў новым рамане пісьменнік выпрабоўвае трываласць героя на фронце, на пярэднім краі барацьбы, у жорсткіх і бязлітасных сутычках з ворагам, раскрывае яго паводзіны ў хвіліны гераічнага парыву, вышэйшага напружання думкі і гранічнага абвастрэння маральных пачуццяў.

Усё гэта дае падставу сцвярджаць, што пісьменнік у пошуку яшчэ не выкарыстаных ім магчымасцей адлюстрагання падзей Вялікай Айчыннай вайны, а значыць, наперадзе — новыя творы, новыя дасягненні.

**Любоў КАРНІЛОВІЧ.**

І. Навуменка. Смутак белых начэй. Раман. «Полымя», 1979. №№ 5—6.

# ТАКІЯ ІМ ВЫПАЛІ ГАДЫ

Гэта калі не першая ў Беларусі, дык, ва ўсякім разе, рэдкая кніга — пра ваенных журналістаў. «...Заслужаны дзеяч культуры БССР Міхаіл Шыбаліс сорак пяць гадоў прапрацаваў у друку, з іх больш як дваццаць—у беларускай «Сельской газете». У час вайны быў франтавым газетчыкам, адным з летапісцаў народнага подзвігу. Ён бачыў вайну з дывізійнага КП і з салдацкага акопу...» — так прадстаўляе аўтара ў прадмове да яе народны пісьменнік Беларусі Іван Шамякін.

Міжволі думаеш аб тым, як цікава будзе газетчыкам і студэнтам факультэта журналістыкі сустрэцца з гэтай кнігай, уяўляеш, як на сустрэчах з аўтарам прагучаць вынашаныя і праверaныя словы: «Журналістыка — гэта род літаратурнай дзейнасці, які не дазваляе адвольна маніпуляваць падзеямі і фактамі. Яна ў сутнасці сваёй дакументальная, домысел тут вельмі абмежаваны, і калі пераступаеш яго межы, табе перастаюць верыць». Цікава журналістам — так, але і ўсім іншым чытачам розных узростаў і прафесій — таксама. Таму што кніга М. Шыбаліса «Такія нам выпалі гады»— гэта расказ пра гераізм народа, а сам апавядальнік умее пісаць проста, шчыра і разам з тым захапляюча.

Кніга пачынаецца «спачатку»: Арол, трыццатыя гады, ФЗН, шматтыражка «Резец», раёнка, Курск, Далёкі Усход... Здзіўляючыя сустрэчы з Пятром Заломавым — горкаўскім Паўлам Уласавым; маршалам Блюхерам, Аляксеем Стаханавым, пра якога М. Шыбаліс напісаў брашуру. Гэта — першыя раздзелы, а потым — тры чвэрткі кнігі — вайна.

Вайна ў кнізе «Такія нам выпалі гады» —не канстатацыя і пералічэнне. Чытач разам з аўтарам перажывае смерць таварышаў, клапоціцца ў цяжкіх умовах аб паперы для газеты, «круціць» на старой машыне тыраж. А калі трэба, бярэ ў рукі вінтоўку.

М. Шыбаліс не проста расказвае, ён абагульняе перажытае, убачанае і пачутае, тым яшчэ больш павялічвае каштоўнасць сваіх успамінаў. Асэнсаваныя факты тых гадоў становяцца старонкай гісторыі, своеасаблівым «падручнікам жыцця». Народная трагедыя і народны гераізм, сумленная «няправільнасць» і «правільны» фармалізм, сціпласць сапраўднай смеласці і парадная гучнасць фальшу — і праз усё гэта бачацца людзі, людзі, людзі...

Ва ўспамінах шмат газетнага матэрыялу тых гадоў: заметкі, інфармацыі, пісьмы байцоў, расказы жыхароў вызваленых сёл і гарадоў. Гэта — не пераказаць, гэта трэба чытаць. Гэта —аблічча вайны, гэта людзі — жывыя ці мёртвыя, гэта — ўсё сапраўднае. Сёння яно — бясцэннае.

А вось радкі, якія ўспрымаеш з асаблівай цеплынёй: «Калі-нікалі да нас заглядвалі таварышы - беларусы. Так паважна называем мы супрацоўнікаў газеты «За Савецкую Беларусь», што жывуць побач, і якая выдаецца для населеных пунктаў акупіраваных раёнаў. Зацягнутыя ў рамяні Міхась Лынькоў, Пятрусь Броўка, Кандрат Крапіва, Максім Танк, Алесь Кучар, Давід Пінхасік, іншыя беларускія пісьменнікі і журналісты — народ гаваркі, іх заўсёды цікава слухаць. Калі-нікалі яны спяваюць беларускія песні, і чамусьці становіцца сумна»...

«Такія нам выпалі гады» — гэта кніга аб мінулым. Але ёсць у ёй радкі і пра дзень сённяшні, якія набраны іншым шрыфтам, але ва ўспамінах яны — не «іншыя» — гэта таксама «гады жыцця» тых самых людзей, што прайшлі вайну, страцілі родных, блізкіх і сяброў.

Прывабнасць успамінаў М. Шыбаліса і ў тым, што са старонак яе добра бачны сам аўтар, чалавек, які прысвяціў журналістыцы сваё жыццё. Часам дастаткова толькі аднаго, нават невялікага эпізода, каб адчуць творчую атмасферу ў ваеннай газеце. Як, напрыклад, вось гэтага: «Рэдакцыя панесла ўжо страты. Паранены Іосіф Уткін. Рэдактар загадвае напісаць вершы. У ельніку саджуся на пянёк, пішу, пакутую, але загад ёсць загад. Вершы напісаў. Іх нават надрукавалі...».

Па-мужчынску сціпла, па-ваеннаму сурова, «сваім голасам», спакойна расказвае бывалы журналіст пра ваенных газетчыкаў:

«— У баі патрэбны байцы, а не летапісцы...

— Памыляецеся, таварыш брыгадны камісар. І летапісцы патрэбны. Я пайду з батальёнам.

— Пра вашу ўпартасць ведае ўся армія...

— Дзякуй за кампліімент».

Рышын пайшоў з батальёнам і загінуў. Загінуў з вінтоўкай у руках — блізарукі, неваеннаабавязаны ваенны карэспандэнт. Ён, як і многія іншыя, хто «ў рэдакцыю не вярнуўся», былі не толькі летапісцамі, але і газетчыкамі.

Кніга Міхаіла Шыбаліса — гэта кніга-памяць пра тых, хто пяро сваё прыраўняў да штыка.

**Навум ЦЫПІС.**

М. Шыбаліс. Такія нам выпалі гады. На рускай мове. Мінск. «Мастацкая літаратура», 1979.

# ДА ПРАЎДЫ І ДАБРА

Сцвярджаюць, што паэзія — найбольш індывідуальная, асабістая справа. Аднак сапраўдны мастак у той жа час павінен быць паўпрэдам не толькі ўласнага сэрца, але і гаварыць ад імя свайго пакалення, ад імя свайго часу, эпохі.

У новай кнізе С. Грахоўскага «Зачараванасць» адчуваецца якраз злітнасць і неаддзельнасць асабістага свету аўтара ад вопыту яго пакалення. Перад намі менавіта кніга — цэласная, прадуманая, завершаная. Пра час і чалавека ў гэтым часе, пра багаты ўнутраны свет нашага сучасніка. Ад пачатку да канца не прападае ў чытача зацікаўленасць, кніга гучыць, калі так можна сказаць, на адным дыханні, бо вершы і паэмы звязвае ў адно цэлае асоба самога паэта, яго філасофскія адносіны да жыцця. Паэт верыць у «дабрату і праўду, а не ў злосць», і на гэтай веры трымаецца яго паэзія. На гэтай веры трымаецца зямля. З яе, гэтай веры, вырастае эстэтычнае асэнсаванне жыцця, прыгажосці навакольнага свету.

Своеасабліва праламляецца ў сённяшніх вершах Грахоўскага тэма Вялікай Айчыннай вайны. Гэта лішні раз сведчыць аб тым, што яна невычарпальная, што існуюць магчымасці ўсё паўней і больш шматбакова, новымі гранямі адкрываць для сябе, узнімаць гэту тэму. Верш «Каб расказалі...» — сапраўдны рэквіем, прысвечаны памяці тых, хто па-геройску загінуў, абараняючы Радзіму, памяці хлопцаў, «што пад бляшанай зоркай і пад Палярнай зоркай спяць». У ім не можа не кранаць, не ўражваць шчымлівая інтанацыя незваротнасці страты, па-чалавечы пакутлівы боль за тых, хто застаўся «на апошнім рубяжы»:

**На Волзе, Вісле ці на Сене,**
**У спёку ці сярод зімы**
**Упаў неразгаданы геній,**
**Якога ўсе чакалі мы.**

Такой жа высокай нотай чалавечнасці прасякнуты і верш «Апошні ветэран». А яшчэ жыве ў гэтым вершы пачуццё нязломнасці, жыццястойкасці...

Унутраную цэласнасць кнігі пацвярджаюць і паэмы, якія, асабліва «Бяссмертнікі», натуральна працягваюць вершы. Вобраз Маці — гэта сімвал памяці аб тых, хто аддаў сваё жыццё за Радзіму. Паэма гэтая — высокага гучання, адметнасць і своеасаблівасць яе ў спалучэнні, перапляценні сімвалічнага, умоўнага і рэалістычнага, рэальнага пачаткаў.

**Гады мінаюць.**
**Болей свой парог**
**Не затрымае ў апусцелай хаце.**
**На скрыжаванні веснавых дарог**
**Стаіць адна, як тая дзічка, Маці.**

Маці, якая чакае свайго сына. Маці ўсіх сыноў чалавечых. Шматлікія дэталі, канкрэтныя падрабязнасці не перашкаджаюць, а, наадварот, дапамагаюць разуменню таго, што воблік Маці збіральны, абагульнены.

Побач з «Бяссмертнікамі» (і не толькі ў літаральным сэнсе) стаіць паэма «Спаленыя масты» — таксама твор аб мужнасці і велічнасці жанчыны — А. Мураўёвай, — якая паехала ў Сібір за мужам - дзекабрыстам.

«Трывожны маналог зямлі» зусім не падобны ні на «Бяссмертнікі», ні на «Спаленыя масты». Іншы жанр, іншая, ужо сучасная тэматыка. І ўсё ж гэтыя тры творы нітуе адно: высокі напал грамадзянскасці, трывога за лёс чалавецтва, за яго сумленне.

...Паэт абавязаны бачыць ярчэй, бачыць і чуць, адчуваць больш і глыбей за іншых. Ён павінен схапіць на ляту мелодыю, імгненне, нейкі штрых, нюанс, дэталь. І данесці гэта да чытача, перадаць з рук у рукі. У гэтым вялікі сэнс і прызначэнне паэзіі. І прыемна, што Грахоўскі якраз валодае такім талентам. Дзякуючы яго паэзіі, яго бачанню свету, мы адчуваем жыццё ва ўсёй яго шматстайнасці, адчуваем, як «дыхнула недалёкім летам дажджом абмытая зямля», чуем «плач скамянелы» помнікаў ахвярам вайны і як «рыпіць у разорах капуста».

Складаная сімволіка верша «Ветразь». І пластыка гэтага твора зрокава адчувальная, узрушальная. Трэба ўсё гэта чытаць па парадку, спачатку (пустынны прыбалтыйскі бераг...), каб адчуць, успрыняць усё (мора, бераг, пясок, шквальны вецер, смуга), і каб уразіцца ўрэшце гэтай пластычнай, гэтай вельмі рэальнай (вось яна — амаль што побач!) карцінай: «А з хмары, як з глыбокай раны, зара барвовая цячэ».

Або прыгадаем вершы «Рэзеда», «Колішнія рынкі», выразныя менавіта сваёй пластычнай напоўненасцю. Тонка і адчувальна перададзены ў іх своеасаблівыя нюансы разнастайных пахаў.

Паэт па-сапраўднаму зачараваны жыццём, з натхненнем будуе інтанацыю верша, яго мажорны лад і тон. Гэта можа адбывацца і пры дапамозе такога стылістычнага сродку, як традыцыйны эпітэт народнай паэзіі. Пры тым традыцыя пераўвасабляецца, трансфармуецца, пераасэнсоўваецца, ствараецца нешта новае, не падобнае на ранейшае, сугучнае новаму часу. Так і вее высокай паэзіяй, яе па-добраму высокім «штилем» ад верша пра маленькую пташачку — шпака:

**І выпырхнуць у СІНІ РАНАК,**
**У ЗОРНЫ ВЕЧАР прыляцець**
**І, сеўшы на ВЫСОКІ ГАНАК,**
**Пра ВОЛЮ ВОЛЬНУЮ запець.**

Музыка верша Грахоўскага... Па-сапраўднаму яе адчуеш толькі пры ўважлівым чытанні вершаў.

**Адчай з жалобай нечуванай моцы**
**Жыццё і смерць паставілі на кон,**
**І ў кожным гуку ажывае Моцарт,**
**Бязлітасна асуджаны на скон.**

Заўважце, што тут ад музыкі, ад гучання верша неаддзельны яго сэнс, яго значэнне.

Дэталь, нейкая рысачка, штрых, тое легкавейнае, ледзь заўважнае, што робіць паэзію паэзіяй — усё гэта ў вершах, у паэмах Грахоўскага рассыпана шчодрай рукою. Возьмем для параўнання дзве страфы з верша «Мне сняцца суніцы»:

**Мой друг і пяе і рагоча,**
**Аж рэха ў гладышцы звініць,**
**Блакітныя свецяцца вочы,**
**І вусны ў крывінках суніц.**
. . . . . .

С. Грахоўскі. Зачараванасць. Вершы і паэмы. Мінск. «Мастацкая літаратура», 1978.

# ВЕЧНАЕ НЕ СТАРЭЕ

«На фоне той усё яшчэ шматлікай псеўдаманументальнай прозы, якая бярэ галоўным чынам памерам і шырынёй «ахопу» Янка Брыль — пісьменнік, можна сказаць, архаічна сціплы»,— пісаў з дасціпнай усмешкай напярэдадні пяцідзесяцігоддзя Я. Брыля вядомы крытык Л. Навічэнка.

Прайшло больш як дзесяць гадоў, а з-пад пяра Я. Брыля выйшла ўсяго некалькі сапраўды вельмі сціплых памерам кніжачак. Усё тыя ж невялікія аповесці, апавяданні. А найчасцей — «карацелькі», мініяцюры, часам у адзін-два абзацы.

Якую ж трэба мець мастакоўскую смеласць і, калі хочаце, мужнасць, цвёрдасць характару, веру ў сілу свайго выпакутаванага, прапушчанага праз сэрца слова?! І якое шчаслівае разуменне таго, што не шырыня «ахопу»— галоўнае ў мастацкай літаратуры.

І ці ж не сціплы памерамі «Акраец хлеба» быў адной з тых кніжак, што наталялі наш голад па вялікай праўдзе жыцця і высокай праўдзе мастацтва? Ці ж не пераважылі на шалях сапраўднага мастацтва прозы бессмяротныя «Байдуны» і лірыка-філасофскія эцюды аўтара многія нашы «буйнафарматныя», з прэтэнзіяй не менш, як на «філасофскае асэнсаванне», кніжкі?

І вось перад намі новая, яшчэ больш сціплая памерам і вонкавым афармленнем кніга — аповесць «Золак, убачаны здалёк». Аповесць такая ж цікавая, праўдзівая, сумленная і шчырая, такая ж вясёлая і адначасна самотная, як і «Ніжнія Байдуны». І на дзіва зямная, хоць пры яе выключнай сіле вобразнага слова і задушэўнасці тону аўтарскай «споведзі», бачыш і тое галоўнае, больш за ўсё неабходнае любому твору — аўтарскі «перст указующий, высоко поднятый» (Дастаеўскі), выразна ўяўляеш той ідэал, з вышыні якога пісьменнік асэнсоўвае жыццё дарагіх яму людзей, у аснову якога кладзе не што іншае, як усё тую ж чалавечую дабрыню, праслаўляць якую не стамляецца ні ў адкрыта публіцыстычнай форме, ні мовай мастацкіх вобразаў.

І ў гэтай аповесці, як слушна сказана ў анатацыі, аўтар вядзе нас у далёкае маленства, «якое акрамя свае першароднасці і харастава нясе на сабе адбітак страшнае вайны, яшчэ той, першай сусветнай».

Праўда, не кожны чытач гэтага твора адразу, з першай старонкі, як гэта было ў «Ніжніх Байдунах», пойдзе «ўслед» за аўтарам. Пачатак крышку нейкі «занадта лірычны», трошкі нейкі млявы. Але магія брылёўскага слова, мяккасць, шчырасць, душэўная цеплыня аўтарскага голасу, у інтанацыі якога шырокая амплітуда — і замілаванне, і ноткі настальгіі, і шкадаванне, і горыч, і многае іншае — бяруць сваё. Уваходзіш у многім вельмі прывабны, у нечым проста страшны, але — галоўнае — у натуральны, непрыдуманы, жывы свет жывых людзей.

Аўтар далучае нас да няхітрай гісторыі духоўнага станаўлення адной трапяткой дзіцячай душы, якая і нам робіцца і цікавай, і дарагой. Але найдаражэй, што перад намі кніга роздуму над тым, што мы, цяперашнія, набываючы, страчваем — у сваіх узаемаадносінах, у сваіх імкненнях, парываннях, жаданнях і намаганнях, у сваім светапоглядзе і светаўспрыманні.

Кніга заканчваецца прызнаннем, што яна, мо, і не напісалася б, калі б не пранёс аўтар у сэрцы, не чуў усё сваё свядомае жыццё той «дзікі рогат» старэйшых і горкі, «безабаронны, беспрасветны» плач сваіх таварышаў дзяцінства, вымушаных ні за што ніякае няўмела і неахвотна збіваць адзін аднаго.

Там, у тым далёкім жыцці было шмат беспрасветнага і сапраўды не надта высокага — у побыце, у норавах, у духоўных запатрабаваннях. Прыгадаем хоць бы тыя ж «пацяробкі» з салдацкага фальклору часоў першай імперыялістычнай, тыя «аб'едкі», што траплялі ў духоўны набытак дзяцей. А ці ж не скаланешся, успомніўшы таго Гаўрылу Тарапача, дурнога дзецюка, што пёр на жарабцы па вясковай вуліцы, па-мацерынску лаючыся, а пазней уланам «з белым аколышам у даўгім шынялі і з шабляй» прыйшоў «на «ўрлёп» (на пабыўку) і, «пастукаўшы раненька ў шыбу з двара, па-свойму важна сказаў, на новы лад абкультураны дурань...»

А ўзяць такое відовішча, як калектыўныя бойкі. «...З апошняй лаянкай, са страшэнным крыкам, з віскам і галашэннем дзяўчат і цётак, з крывёю на тварах, з цеганінай загрудкі, з глухімі ўдарамі па целе, з тупатам уцёкаў і пагоні. Каго паднімалі, каго адлівалі вадой, каго нават везлі ў Мілтачы да доктара, каб потым было як падавацца ў суд...»

Дарослай дзяўчыне доктар выразае апендыцыт. Калі яе прывозяць дахаты, брат нясе яе з воза на руках. У парыве ўдзячнасці тая цалуе брата ў шчаку. Той не вытрымаў, заплакаў. «А ўсё-такі яе, тую спраўную і вясёлую Ліду, празвалі потым Рэзаны Жывот.

Не дабітая выбухам Маня стала Варонай, Шура — Сцягачом, Глушаком. У каго баляць вочы — Сляпы, трохі сутулішся — Гарбач, накульгваеш — Клышаногі, Кандыба...

Што гэта — натуральны адбор, ці проста грубая, бязлітасная цемра?..»

Так, усё гэта было. Асабліва звярэў чалавек на вайне. Выключнай сілай душэўнага ўзрушэння, эмацыянальнай перакананаўчасцю насычаны расказы пра яе дзядзькі Алеся.

Але ж... было і другое. Не ўсе азвярэлі, не ўсе здзічэлі. Вось выходзіць, бывала, у нядзелю ці ў свята на грудок перад сваім гародчыкам цётка Анэта, садзіцца на зямлі і «абняўшы аберуч калені худых босых ног» доўга сядзіць і маўчыць.

«Анэта тужыць,— казала мама, гледзячы ў акно.— Зноў тужыць, бедная. Ды што ты хочаш?— пыталася яна ў кагосьці непрысутнага і тут жа адказвала яму: — Беднасць такая, поўная хата дзяцей... Сядзі, глядзі... Хоць ты і дзірку ў небе праглядзі — нічога добрага не ўбачыш...»

Я. Брыль у сваіх лірычных запісах неяк прывёў радасны вокліч А. Куляшова, прачытаўшага адзін з вершаў У. Караткевіча: «Гэта вельмі асабістае — гэта вельмі здорава!» Аповесць «Золак, убачаны здалёк»— кніга вельмі асабістая, інтымная, спавядальная. Не трэба надта напружвацца, каб у Юрыку пазнаць малога Івана Брыля, а ў Рамане — яго старэйшага брата Мішу, любоў і замілаванасць да якога, пранесеныя праз усё жыццё, саграюць старонкі і гэтай кнігі.

І мама з аповесці — гэта рэальная, непрыдуманая маці, якая так шмат уклала ў сэрца пісьменніка, і якая тут, у самых звычайных праяўленнях сваёй дзівоснай, жыццярадаснай, чалавечнай натуры вырастае ў сімвал усяго таго лепшага, што было ў нашым народзе.

На тэму «Маці і дзеці ў творчасці Я. Брыля» можна гаварыць шмат. Не так ужо многа старонак аповесці аддадзена вобразу Маці з вялікай літары і паўстае яна перад намі ў самых звычайных душэўных «жэстах». Але давайце прыгледзімся да іх — якая прыгожая чалавечая душа высвечваецца ў гэтых жыццёвых драбніцах.

Вось Раман сячэ капусту незвычайнай прыладай — казацкай шашкай, «сцішана бліскучай», такой прынаднай і недасягальнай. «Я толькі пазіраў, а мама ківала галавою на Рамана.

— І ты як блазен, гаспадар!...
— А потым нечакана дадала:— Даў бы ўжо й гэтаму секануць. Бачыш, як уталопіўся?

Раман мне даў, і я тады ссек ажно чатыры качаны».

Толькі і ўсяго, здаецца. А хіба ж не ёкае ў сэрцы ў кожнага з нас?..

Ці сядзяць, скажам, хлапчукі-сябрукі ў Юрыкавай хаце і ядуць падсмажаную мамай рыбу, што нядаўна самі налавілі. «Звычайна ж бывала так, што «пойдзем да вас — ты паабедаеш, а потым да нас — я паабедаю», а тут — Шура ў нас, і мы сядзім, ямо, а наша мама сядзіць і ўсміхаецца: «Во, рыбакі!..» А ў Шуры ж мамы няма, і наогул... ну гэта так добра, што мы вось у нас, за нашым сталом, і ямо, і гаворым. А мама нам і чаю яшчэ дала салодкага, ліпавы цвет, запараны ў гаршку,— і хлеба маслам памазала».

А як не прыгадаць мудрае маміна казанне пра тое, што «як жанчына вылаецца матам, дык пад ёю на цэлы сажань углыбіню загарыцца зямля — такі грэх». І тое, як мама корміць гаротніцу бабу Роху і «паніча», яе пляменніка Тэофіля.

Цяжка ўтрымацца ад спакусы працытаваць хоць трошкі і другую маці, што гаварыла «густым гучным і смачным голасам вясковай дабрадушнай цёткі», у словах якое і горкая іронія над самой сабой, і ўдзячнасць за чалавечую спагадлівасць і дабрыню: «Ганко-сястрыцо, здрастуй! Мала было табе майго пляменніка, дык на яшчэ і ўнука. Куды нянька, туды і лялька. Самому ж вельмі захацелася, як пра твайго яму расказала. Зяма, скажы добры дзень!».

Усё тое добрае, што пасеялі ў чулым сэрцы малога хлопчыка перш за ўсё мама і брат, рана дало дружныя ўсходы. Сэрца Юрыка адразу адгукаецца другому добраму сэрцу. Паміж Юрыкам і Зямай узнікае шчырая дзіцячая дружба, памяць пра якую саграе сэрца героя-

Я. Брыль. Золак, убачаны здалёк. Аповесць. Мінск. «Мастацкая літаратура», 1979.

**Туманам сплылі спадзяванні,**
**Упаў, як падстрэлены птах,**
**Мой друг у глухім катлаване**
**З крывінкай на сцятых губах.**

Дзве карціны, вельмі розныя па танальнасці, і ўсё ж нешта іх злучае, а менавіта: гэтая самая крывінка, след расціснутай на вуснах суніцы. Гэта тая самая дэталь, якая хапае за сэрца, не пакідае раўнадушным. Які доўгі, да немагчымасці цяжкі і страшны, неверагодны шлях паміж дзвюма гэтымі строфамі, якая бездань іх раздзяляе. І злучае іх... усяго толькі «крывінка» суніцы.

Грахоўскаму ўласцівы талент эпіка, які праявіўся на поўную моц у паэмах, у вершах. Але не трэба забываць і пра талент Грахоўскага-лірыка. І, напэўна, усё-ткі ў першую чаргу лірыка. Нельга не захапляцца гэтым талентам, уменнем паэта глыбока інтымнае, асабістае выкласці як агульназначнае, агульначалавечае.

Праз усю кнігу праходзіць чырвонай стужкаю адзін скразны матыў — вернасць высокім ідэалам, вера ў перамогу дабра над злом, вера ў гармонію свету. Пра гэта лепш за ўсё сказаў сам паэт:

**Мы да вышыняў зорных**
**узняліся,**
**Адолелі і жорсткасць,**
**І бяду.**
**Да Праўды і Дабра,**
**Як па карнізе,**
**І я не пахіснуўшыся**
**Дайду.**

**Яўген ГАРАДНІЦКІ.**

---

апавядальніка да гэтага часу. Пачалася дружба з узаемнай цягі да незвычайнага, ды прыгожага — ну, хоць бы таго ж умельства страляць з бізуна альбо іграць на гармоніку, якое дэманструе ім пастух, дзядзька Шыман, «быўшы сын, ныне яфрэйтар утарога Туркестанскага палка...»

Калі гаворыш пра такія рэчы, як аповесць «Золак, убачаны здалёк», перадаць яе змест «сваімі словамі» проста немагчыма.

«Народ і ў грубасці сваёй мудры»— да такой высновы прыйшоў у гады сталасці герой аповесці. Навука мудрасці, як і чалавечай дабрыні, была нялёгкай, затое грунтоўнай і трывалай. Вучыла само жыццё... І ў няпростай навуцы жыцця вучылі ўсе. І бацька няшчаснай Мані Вароны, прастадушны дзядзька Цыбук, які неяк гаварыў маме: «Бяда такая, Ганко. Каб гэта ж цяля ці аўца, то чалавек прадаў бы, ці дарэзаў бы, а гэта ж дзіця...». І добры, разумны і смелы дзед Богуш, які некалі рускаму афіцэру, што ўсё свістаў у хаце, сказаў: «— Свішчы, свішчы,— сказаў,— ўжо семнаццаць губерняў прасвістаў, васемнаццатую свішчаш?

— Молчи, старик!— уз'еўся той капітан.

А дзед:

— Вось давай мы з табой, як людзі, і памаўчым».

І той жа дзед Богуш, польскаму каменданту паліцыі, які абурыўся, што сяляне першыя не павіталіся з ім, спакойна адказаў, што ў іх спрадвеку добры чалавек, падыходзячы да людзей, вітаецца першы:

«— Цо, цо ты мувіш, стáры галгáне?

— А ўжо ж, калі я цябе разумею, дык і ты падвучыся, і будзеш ведаць, што я гавару».

Неяк Янка Брыль запісаў: «Пішучы пра другога, не бойся быць самім сабою». І яшчэ адзін вельмі важны вывад: «Вечны крытэрый: калі ёсць што сказаць, калі хочаш, каб цябе зразумела, каб табе паверыла, як мага больш людзей,— мудрагеліць не будзеш.

Вечнае не старэе».

Доказ таму — аповесць «Золак, убачаны здалёк».

**Генадзь ШУПЕНЬКА.**

# СТАРОНКІ ЎСПАМІНАЎ

ЁН ДЛЯ МЯНЕ ЖЫВЫ — Сямён, Сымон, Аксенцій Паўлавіч, як мы з паважлівым жартам называлі яго студэнтамі.

У ім спалучыліся чыста і ўзнёсла прыгажосць унутраная з прыгажосцю юнака, маладога мужчыны.

Ён ніколі не быў апрануты, што завецца, з іголачкі, але заўсёды акуратна, з густам. Не мог першакурснік Сымон Блатун прайсці спакойна каля люстэрка, каля шкляных дзвярэй нават, каб крадком не зірнуцца, каб лёгкім рухам, нібы пасуючы мяч, не ўскінуць чарнявы мысік сваёй лагодна-даверлівай, як і характар Сымонаў, рассыпістай шавялюры.

А калі смяяўся Сымон, то неяк светла рабілася. Смяяўся ён шчыра, непасрэдна, не вымучана. Бо смех — адна з праяў натуры чалавечай, смех выдае чалавека, ягоную непасрэднасць, унутраны стан, унутранае святло.

Да яго хінуліся, да яго гарнуліся сябры, аднакурснікі і, вядома ж, не абы-як пазіралі дзяўчаты.

Ужо ў сваіх першых вершах хацеў ён вясёлку «выкаціць цалюткім абручом», хацеў так пісаць, так ісці па жыццёвых сцежках — каб аж гай шумеў!

Жыццё, як і вясёлка, складаецца з тых жа фарбаў, з тых жа адценняў. Цалюткі абруч вясёлкі жыцця не доўга каціў Сымон Блатун. І колеры былі розныя.

Малавата было вясёлых, святочных. Пераважалі сумнавата-цьмяныя, будзённыя. Але жыццёвая проза не азмрочыла позірк жыццялюба, не прыземліла юначыя парыванні, не ачэрсцвіла сэрца паэта рамантычнага складу, не зняверыла шчырага давер'я да людзей чалавека, які вышэй ад усяго цаніў таварыскасць, сяброўскасць, чалавека, які ніколі не насіў камень за пазухай, які ні на кога не таіў злосці, паэта, у слоўніку якога не было слова зайздрасць.

Як прадстаўнік пасляваеннага пакалення нашых літаратараў, Сымон добра ведаў цану жыцця. І з першага курса самому даводзілася яму зарабляць на хлеб надзённы. Бо смак скарынкі з мякінай, праснака з лебяды быў не паэтычнай фігурай, не той дэталлю, якую іншыя бяруць, каб чытача расчуліць.

Калі і прыходзіла пасылка восенню з духмянымі правобразамі зямнога шара, а зімой з трывалым касцоўскім папасам у інтэрнат на Свярдлова, а пасля на Бабруйскую, гэтая жаданая вестка з палескай вёскі Кувака ў дружнай і галоднай не толькі на рыфмаванае слова кампаніі хутка знікала. Пасля такіх сябрын і пісаліся радкі:

Гады прамільгнуць... І мо ў
новай кватэры.
Як нейкае дзіўнае цуда,
З нас кожны прыпомніць вось
гэту вячэру...
«А хто ж будзе мыць нам
пасуду?»

На аддзяленні журналістыкі Сымон Блатун з першых дзён звярнуў на сябе ўвагу як самы здольны, баявіты, апантаны саўдзельнік падзей сучаснасці. Рана пачаліся дарогі ў самыя далёкія куткі Беларусі, нялёгкая газетная праца, што карацей называецца заданнем рэдакцыі, камандзіроўкай.

Я з першых вёрстаў палюбіў
дарогі,
Глухія зненавідзеў тупікі.
У мітусні перонаў і вакзалаў
Я адчуваў імклівы пульс
жыцця...

Гэта не дэкларатыўныя радкі. Гэта хутчэй думкі ўслых. Гэта рэальнасць, якая рабіла са студэнта-першакурсніка, юнака, што з залатым медалём закончыў школу на Брагіншчыне, актыўнага летапісца часу, рашучага і прынцыповага паэта.

А Сымон Блатун як чалавек, як паэт быў асобай, цікавай з'явай. Здзіўлялі і выклікалі добрую зайздрасць шырокае і разнастайнае поле ягонай цікаўнасці, цяга да ведаў, упартае жаданне ў любой рэчы дапасці да сутнасці, да глыбіні, да вытоку. Займаўся спортам, вывучаў гісторыю мастацтва, а разам з тым не грэбаваў самай што ні ёсць чарнавой працай журналіста: апрацоўваў пісьмы, пісаў рэпартажы, нататкі, замалёўкі, рэцэнзіі, узнімаў нялёгкія скібы на здзірванелым палетку праблемнага нарыса.

Сымону да ўсяго была справа. Яго ўсё цікавіла.

Запомнілася заклапочанасць і ў вышэйшай ступені адказнасць, з якой ён як прадстаўнік «Звязды», як сын партызанскага краю, уключыўся ў абмеркаванне праекта помніка абаронцам Брэсцкай крэпасці. Бываў Сымон у майстэрнях скульптараў, адстойваў у гарачых спрэчках сваю пазіцыю, сваю прыхільнасць да праекта Андрэя Ануфрыевіча Бембеля.

Разам з Ігарам Краўчанкам, які працаваў пасля інстытута ў майстэрні народнага мастака Беларусі Аляксея Канстанцінавіча Глебава і шмат чаму навучыўся ў яго, Сымон Блатун ездзіў у Брэст, каб з мясцін, дзе яшчэ камяні не астылі ад болю, напісаць пераканаўчы матэрыял для газеты.

Маладыя мастакі, скульптары, вучоныя былі сталымі сябрамі маладога паэта, вострага журналіста. Дружба іхняя была ўзаемна жаданай, узаемна цікавай сваёй неабходнасцю. І не таму, што і рэдакцыі, дзе працаваў Сымон Блатун, і кватэра ягоная ў тады новым журналісцкім доме на самым высокім паверсе, былі побач з тэатральна-мастацкім інстытутам і Акадэміяй навук. Ён на любыя тэмы мастацтва і нават дакладных навук мог весці — не ветліва падтрымліваць! — і гутарку, і дыскусію, тактоўна, дасведчана, палемічна - заахвочвальна.

Паэзію Сымон любіў, ведаў на памяць і класіку, і самыя апошнія навінкі. Яшчэ дасюль здзіўляюцца многія празаікі з прыемных для іх нечаканасцей, калі Сымон ці ў тралейбусе, ці проста на вуліцы хваліў той ці іншы раман, аповесць, цытуючы пры гэтым цэлыя абзацы, смакуючы асобныя асабліва ўдалыя выразы, словы, павароты сюжэта.

Стараўся паспець усё прачытаць, пра ўсё дазнацца — і паспяваў. Паспяваў шмат зрабіць, некаму памагчы парадай, спагадай, словам падтрымкі і вусна, і ў друку.

І калі казаць пра стыль Сымона Блатуна, пра манеру пісьма, то ў першую чаргу трэба падкрэсліць натуральнасць, непасрэднасць, адсутнасць літаратурных хадуль, лёгкасць майстра і вясёлага субяседніка.

Шчырасць і нявымучанасць радка праявіліся і ў лірыцы, і ў гумары Сымона Блатуна, гумары дасціпным і інтэлектуальна-віртуозным.

На памяць часта прыходзіць цяпер далёкі ўжо эпізод.

Пасля заканчэння універсітэта мы яшчэ доўга хадзілі ў інтэрнат да сваіх на курс маладзейшых аднакурснікаў: да Янкі Сіпакова, Барыса Сачанкі, Івана Пехцерава. Сымон працаваў у «Звяздзе», я — у «Бярозцы», кожны здымаў прыватны куток, але болей мы начавалі ў інтэрнаце, бо і каменданту, і вахцёрам так прымільгаліся, што за студэнтаў нас усё яшчэ лічылі. Па заданні «Маладосці» пісаў я рэпартаж вершам з Бярозаўскай ДРЭС. Як заўсёды зацягнуў, здаваў у апошні дзень. І ніяк не мог паставіць ударную, ці што, кропку. Пісаў усю апошнюю ноч у рэдакцыі «Бярозкі», а раніцай мыцца пабег у інтэрнат. Тут ва ўмывальніку Сымон з ходу і параіў мне:

Запырскан вапнаю прараб.
Шпакамі ён расчулен:
— Вам рэпартаж канчаць
пара б,
Таварыш Барадулін!

Наогул, распасоўка экспромтамі, эпіграмамі была ў нас у тыя часы своеасаблівай гімнастыкай. Жартавалі з сябе, з сяброў. Нават са смерцю вясёла жартавалі, бо яна тады для нас хадзіла дужа далёка.

Як звычайны верш успрымаліся тужліва прачулыя, абвострана выразныя радкі Сымона Блатуна:

І скажуць: «Быў яшчэ ж ён
малады...»
Паўстану я ў кагосьці прад
вачыма..
Зязюлямі падлічаць мне гады
Суцішана трывожныя
жанчыны.

І скажуць так: «Ляжаў ён, як
жывы...» —
Упершыню спагадліва і шчыра.
Цішэй вады, ніжэй травы..
Бывайце, гоні, рэчкі,
паплавы,—
Я адлятаю ў свой далёкі вырай.

Чалавек, а мастак асабліва, адчувае загадзя свой скон. Гэта зразумеў я пасля. Трэба прызнацца, што «ўпершыню спагадліва і шчыра» пачалі мы казаць пра сябра свайго тады, калі адчулі, як нестае ягонага глухавата-радаснага голасу, ягонага добрага пагляду, ягонай постаці ў нашым жыцці, у нашай паэзіі.

Не думалі мы тады, маладыя і шчодрыя на час, што два апошнія радкі будзе адліваць у метале Ігар Краўчанка надпісам да надбронзавага барэльефу на Чыжоўскіх могілках.

«Гоні, рэчкі, паплавы» — гэта дакладна выпісаныя родныя мясціны. Калі быў я пасля на Брагіншчыне, пераканаўся ў гэтым. У галасах брагінцоў (яны самі націск робяць у слове гэтым на апошнім складзе) чуўся мне голас Сымона, сына Ціхана.

Пра характар палешукоў шмат напісана і сказана, шмат праўды, а легенд болей. Адно неаспрэчна падкрэсліваецца — цягавітасць і працавітасць, уменне чакаць радасць, быць гатовым зрабіць радасць іншаму, любоў да сваёй небагатай зямлі, любоў, карані якой трымалі гэты край, каб выраі заўсёды дамоў вярталіся. У сваіх землякоў узяў Сымон Блатун усё самае лепшае. Не адрываючыся ад зямлі, паэт у той жа час не любіў прыземленасць думкі, бяскрыласць слова.

Сурова патрабавальны да слова свайго, сам зняў з выдавецкага плану свой першы зборнік, хаця ў рукапісе былі вершы друкаваныя, станоўча ацэненыя і чытачом, і крытыкай. Няшчадны да сябе, Сымон Блатун быў вельмі чулы і шчодры на падтрымку маладзейшых калег па пяру, калі кансультаваў у «Чырвонай змене», рыхтаваў літаратурныя старонкі маладой беларускай паэзіі.

У шэрай папцы на «маланцы», у якой звычайна Сымон насіў дадому па вуліцы Друкарскай рэдакцыйныя матэрыялы, зараз захоўваецца своеасаблівы архіў паэта: рукапісы, выразкі, адказы пачаткоўцам, бланкі газеты «Звязда».

Трэба бачыць, колькі варыянтаў, колькі рэдакцый мае амаль кожны верш, кожны радок. Пераклады белых вершаў Яна Судрабкална толькі ад рукі перапісаны тры разы — і кожны раз па-новаму.

Паэзія Сымона Блатуна яшчэ чакае свайго даследчыка, свайго крытыка, свайго зорнага часу. І яны будуць! Выток узнёслага слова Сымона Блатуна па-ранішняму празрысты і крынічна-жывучы. Без яго не зразумець усёй шырокай плыні сённяшняй нашай паэзіі. А выток гэты дакладна і шматзначна называецца адным словам— чысціня.

Вяртаючыся да радасных дзён нашых сустрэч, нашай дружбы і да сумных часін заўчаснай смерці майго незабыўна дарагога сябра, зноў не веру, што яго няма. Ён жыве і яшчэ доўга будзе жыць сваёй паэзіяй, сумленнай, мужнай, неабходнай.

**Рыгор БАРАДУЛІН.**

— Ты паедзеш са мной на балота?— пытаўся Рыгор Лінь у Барыса. Яны сядзелі ў летнім кафэ «Вецярок», якое толькі што адкрылася пасля зімы, і пілі халоднае піва.

— І думаць нечага...

— Гэта ж у палявых, не ў балотных умовах. Жыць і працаваць.

— З табой хоць у пекла...

— Глядзі. Там цяжэй, чым на вайсковых вучэннях. Склаўшы рукі сядзець не будзем.

— Гаворыш так, нібы хочаш, каб я адмовіўся,— разславаўся Барыс.

Барыс абрадаваўся па-сапраўднаму, што яму давядзецца працаваць цэлае лета на нейкім глухім балоце, далёка ад свае вёскі, дзе пакуль што ўсё вельмі нагадвае яе, Ніну. А за лета ён, як кажуць, перарасце сваё няўдалае каханне, загоіцца ягоная рана...

Лагер быў на востраве. Яшчэ па замёрзлым балоце туды завезлі тэхніку, бочкі з саляркай, вагончык для жылля, слані, нават машыну дроў. Вясной, калі вада крыху апала і можна было пачынаць капаць канал, хлопцы ледзь дабраліся да свае стаянкі.

Барысу падабалася на востраве. Яму яшчэ помнілася вайсковая служба з яе дысцыплінай, а тут ніхто іх не кантраляваў, нават ніхто з начальства не заглядваў. Жыві як хочаш!

Акрамя іх, на востраве пасяліліся Гаварушка са сваім памочнікам, а потым далучыліся і дрывасекі, што зводзілі лес на пясчаных выспах між балот, дзе планаваўся магістральны канал. Адным словам, сумаваць хлопцам не даводзілася. З вечара доўга сядзелі ля кастра, гаварылі пра рознае. А раніцай спалі, пакуль і сонца не прыгравала.

Канал пачалі капаць ад самага глыбокага і топкага балота да рэчкі, каб яна сцягнула часткова ваду з балота, а потым ужо весці магістральны канал на Прыпяць, якім вырашылі замяніць спрамленне ракі Альхоўкі. Весці канал ад балота да ракі трэба было праз балоцістую мясціну. Трапляліся даволі топкія балотцы-вокны, былі, праўда, і сухадолы з чырвонымі смалянкамі. Ды такіх узвышшаў выпадала зусім мала. Так што ў асноўным рабілі на сланях.

За каўшом цягнуўся брудны паток вады. Вада залівала выкапанае. Патрэбна было сапраўды ювелірнае майстэрства, каб і адкосы рабіць роўненькімі, і шырыню дна аднолькавай трымаць.

Цяжкасці сустракаліся на кожным кроку. Нават дабрацца да экскаватара было праблемай. Кавал'еры былі такія топкія, што па іх ісці было немагчыма. Гэта потым, праз колькі дзён, калі вада сцячэ болей, яны зацвярдзеюць і змогуць трымаць чалавека. Пакуль жа карысталіся кладкамі—доўгімі абапалкамі, збітымі папарна. Пройдзеш па такой кладцы да яе канца, пакладзеш перад сабой тую, што нёс у руках, а потым выцягнеш з топкага глею першую, па якой толькі што ішоў, і пакрочыш з ёй у руках далей. І так да самага экскаватара, ці ад экскаватара да вострава, дзе атабарыліся.

На экскаватары, які быў у Рыгора Ліня, прадугледжвалася працаваць удвух. Першыя дні яны так і рабілі. Рабілі не ад зары да зары, як абяцаў Барысу Рыгор Лінь, а нават меней за восем гадзін у дзень.

— А гаварыў — ад цямна да цямна,—неяк сказаў Барыс. — Я дык ніколькі не стамляюся...

— Усё яшчэ наперадзе,—усміхнуўся Рыгор. — Трэба, каб ты асвоіўся, уцягнуўся. Рванеш адразу — надарвешся. Тады ніякай выпрацоўкі, і смак да работы згубіш.

Прыйшлі ў свой лагер рана, перакусілі, потым падаліся на балота цягаць лінёў. На вячэру была юшка.

Прачнуўшыся раніцай, Барыс нікога не ўбачыў у лагеры. Экскаватаршчыкі былі на балоце. Працаваў і Рыгор Лінь. Барыс зразумеў, што раскачка кончылася. Паснедаўшы ўчарашняй юшкай, ён пайшоў да экскаватара. Кладкі былі ў Рыгора Ліня, і таму Барыс скіраваў у абход. Дзе па сухадолу, дзе абыходзячы топкія мясціны, дзе перескокваючы з купіны на купіну, ён дабраўся ледзь не да самага экскаватара. Засталося якіх метраў дзесяць, але адолець іх нельга было. Рыгор якраз праходзіў «акно». Працаваў на сланях. Тоўстыя дубы пад цяжарам машыны пагрузіліся ў твань, што так і гусеніцы былі ў вадзе. Барыс стаяў колькі мінут, але Рыгор Лінь яго не заўважаў. Тады Барыс заклаў пальцы ў рот і свіснуў некалькі разоў. Рыгор прыглушыў матор, вылез з кабіны, крыкнуў, каб узяў правей, абагнуў «акно» і выйшаў да экскаватара спераду. Хутка Барыс быў на паляне, парослай высокай травой, рэдкімі кусцікамі. Пайшоў насустрач экскаватару, але Рыгор махнуў рукой, каб пачакаў. Барыс нагнуў альховы куст і ўсеўся на спружыністае голле. Сядзеў і глядзеў, як працаваў яго сябра. Страла хадзіла раўнамерна, без рыўкоў, не спыняючыся ні на секунду. Можа, замірала толькі на якое імгненне, калі коўш угрызаўся ў размяклы торф. Разгружаў коўш на хаду. Падыме стралу, нават дасць ёй у бок невялічкі разгончык, адпусціць коўш—і твань ляціць па інерцыі далей ад таго месца, дзе страла пачынае рух назад. Экскаватар у руках Рыгора быў жывой істотай. Гэта быў вышэйшы клас. Так Барыс не ўмеў. І ён сядзеў і сачыў за кожным рухам экскаватара, бачыў, які засяроджаны Рыгор у сваёй кабіне. Часам іх позіркі сустракаліся, і тады Рыгор задаволена ўсміхаўся, ведаючы, што Барыс не толькі сочыць за яго працай, а і любуецца ёй.

Праз які час Рыгор Лінь мінуў «акно» і з'ехаў са сланяў на цвёрдае. Відаць, раней яшчэ прайшоў па трасе і ведаў, дзе якая зямля.

— Здаецца, топкія мясціны мінулі,—вылез з кабіны Рыгор і, стоячы на гусеніцах, моцна і са смакам пацягнуўся. — Цяпер да самай рачулкі без сланяў поидзем.

Ён паглядзеў наперад, дзе, можа, за які кіламетр і была рачулка, схаваная высокім алешнікам, а потым спытаў у Барыса:

— А як там Гаварушка?

— Ён болей пракапаў...

— Вядома, па сухадоле. Але, як дойдзем да рэчкі, мы таксама пяройдзем на сухадол. Пачнём ад старыцы і да Прыпяці. Там кубоў насількаем, бо амаль адзін пясочак... Ну, садзіся за рычагі, і пакуль не стомішся. Галоўнае, не спяшайся, каб не перарабляць. А хуткасць прыйдзе сама...

Калі Барыс сеў за рычагі, ён яшчэ пастаяў, паглядзеў, як у яго атрымліваецца.

— Чуеш, Барыс, я адскочу дамоў. Калі спазнюся, выйдзеш з раніцы.

— Добра.

Барыс нетаропка чэрпаў каўшом зямлю, адносіў яе ўбок, спыняў стралу, разгружаў коўш. Калі Рыгор адышоўся далёка, паспрабаваў разгружаць на хаду, як рабіў Рыгор. Першы раз зямля высыпалася з краю канала, частка яе трапіла назад у канал—паспяшаўся коўш адкрыць. Другі раз надаў хуткасць страле, а коўш адкрыць затрымаўся. Стралу так матнула па інерцыі, што ледзь не пераламала. І Барыс мусіў адмовіцца ад сваіх эксперыментаў. Капаў, як умеў, сачыў, каб адкосы былі роўныя да самага дна, каб меней потым папраўляць іх рыдлёўкай.

Барыс намеціў наперадзе альховы куст і задумаў сёння ж дацягнуць канал да яго. Працаваў спакойна, як і вучыў Рыгор. Не аглядваўся, ці многа зроблена, не падлічваў, колькі засталося да канца дня, а глядзеў, каб атрымлівалася добра, роўна, прыгожа. І ўсё ж паглядваў на альховы куст, асабліва тады, калі сонца пачало ніжэй і ніжэй апускацца. А калі яно павісла над самым лесам, чырвонае, астылае, Барыс заспяшаўся і адзін раз грабянуў каўшом лішняга, — цяпер будзе ў адкосе як раўчак. Аж настрой у хлопца прапаў. А тут яшчэ пару метраў не дацягнуў да намечанага куста: пачало змяркацца. Таму без адчування задаволенасці заглушыў матор, шкадуючы, што няма на небе месяца, а то б свайго абавязкова дамогся. Прыйшоў у лагер прыцемкам. Рабочыя павячэралі, палеглі спаць. Вогнішча ледзь дымілася. Ля яго стаяла вядро з цёплым супам. Супу было небагата, на дне толькі. Барыс сеў на паленца, між ног паставіў вядро і пачаў чэрпаць лыжкай суп якраз так, як Рыгор Лінь працаваў стралой свайго экскаватара. Павячэраўшы, адчуў, як моцна стаміўся. Ногі самлелі, сталі як акамянелыя, самлела і сярэдзіна. Ён ледзьве падняўся, зайшоў у вагончык і кінуўся на свой тапчан. Ужо лежачы, раздзеўся, нацягнуў на сябе коўдру. Заснуў амаль імгненна.

Недзе ў падсвядомасці яго жыла пакутлівая думка, што не зрабіў намечанага, а, галоўнае, сапсаваў адкос. Відаць, гэтая думка і падняла яго яшчэ на досвітку. Барыс адзеўся, узяў кавалак хлеба, адрэзаў сала, наліў у бутэльку вады і, абіваючы гумавікамі буйную расу з травы, паспяшаўся да экскаватара, які вытыркаў з ранішняга туману сваю стралу, нібы аглядваў, што навокал яго робіцца.

На экскаватары на які момант спыніўся, прыслухаўся. Хмызнякі і куп'ё хаваліся ў тумане, усход ледзь ружавеў, недзе зусім блізка залопала крыламі і крыкнула качка, як хто яе спужаў. Мо бабёр. Ля экскаватара паднялася вялікая птушка, лена махнула

---

**Леанід ГАЎРЫЛКІН**

# Дранікі

Свой новы раман я прысвяціў беларускім меліяратарам, людзям, якія сваёй нялёгкай працай пераўтвараюць край спрадвечных балот у край квітнеючых калгасных ніў.

Прапаную чытачам урывак з твора, які я назваў: «Зямля дзяцей нашых».

Цалкам раман будзе надрукаваны ў часопісе «Полымя».

Аўтар.

---

# ПАСЛАННЕ ДРУЖБЫ З АЎСТРАЛІІ

«Нашым беларускім сябрам з найлепшымі пажаданнямі ад Алана Маршала; чэрвень 1979 г.». Такі надпіс зроблены аўтарам на тытуле кнігі «Людзі здавён-даўніх часоў» («People of the Dreamtime»), уручанай актывістамі Таварыства «Аўстралія—СССР» прадстаўнікам Беларускага таварыства дружбы і культурнай сувязі з зарубежнымі краінамі для перадачы беларускім пісьменнікам. Праз членаў дэлегацыі памянёнага таварыства А. Маршал — даўні друг нашай краіны і прэзідэнт гэтай арганізацыі ў Аўстраліі — накіраваў асабістае пасланне ў адрас Саюза пісьменнікаў Беларускай ССР, у якім выказвае пачуццё глыбокай прыязні і павагі да сваіх беларускіх калег па пяру, гэтых, як ён адзначае, «дастойных сыноў і дачок гераічнага народа» і не без жалю прызнаецца, што ў час свайго прыезду ў нашу краіну «не змог наведаць легендарную партызанку — Беларусь...».

Алан Маршал — сусветна вядомае імя. Ён славуты прадстаўнік прагрэсіўнай літаратуры пятага кантынента, палымяны абаронца міру і дружбы паміж народамі. Аўтар больш як дваццаці зборнікаў навел, апавяданняў, нарысаў і публіцыстыкі, у тым ліку і самай папулярнай не толькі ў англамоўных краінах, а і ў перакладах амаль на трыццаць моў народаў свету кнігі для дзяцей малодшага і сярэдняга школьнага ўзросту «Я магу скакаць і цераз лужыны», — даўно вядомы і чытачам нашай краіны. Яго зборнікі апавяданняў неаднаразова выходзілі ў перакладах з англійскай мовы на мовы братніх народаў СССР.

У 1977 г. за сваю актыўную дзейнасць у справе развіцця і ўмацавання дружбы паміж народамі Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР Алан Маршал быў узнагароджаны ордэнам Дружбы народаў.

«Людзі здавён-даўніх часоў» — кніга міфаў, легенд і казак, запісаных пісьменнікам ад абарыгенаў - сказіцеляў Арнемленда — графства на паўвостраве Арнемленд на поўдні Аўстраліі. Яна ўпершыню была апублікавана ў 1952 г. Паўторнае яе выданне з самабытнымі і каляровымі ілюстрацыямі Марыям-Роўз Анганмер, мастачкі з племя абарыгенаў-мойма, выйшла ў гэтым годзе ў выдавецтве Хайленд-Гаўз у Мельбурне. З гэтага выдання кнігі з аўтарскім падарункавым подпісам зроблены і пераклад прытчы «Дынга і Кенгуру».

Зберагаючы ўзор рытмічнай апавядальнасці, уласцівы вуснай перадачы зместу кожнай з легенд як носьбітамі сваёй вусна-паэтычнай творчасці — сказіцелямі-абарыгенамі Аўстраліі, так і яе збіральнікамі — у тым ліку і самім Маршалам, — я, перакладчык, па магчымасці стараўся ўзнавіць яе разнастайную рытмічна - вершаваную форму. Як гэта атрымалася, хай судзіць паважаны чытач.

**Язэп СЕМЯЖОН.**

**Алан МАРШАЛ**

## ДЫНГА І КЕНГУРУ

Здавён-даўна, у першабытны час,
калі ўсе дынга — дзікія сабакі —
і кенгуру былі яшчэ людзьмі,
сустрэўся Кенгуру на сцежцы з Дынга.

— Куды бяжыш? — пытаецца ў суседа
цікаўны Кенгуру, зірнуўшы з хмызу.
— На паляванне, — прастадушна Дынга
адказвае, паказваючы коп'і.
— І я пайду з табой, калі ты згодны, —
напрошваецца той і ўжо рукою
абмацвае калчан, як пыскай самка
між кенгуру сваю калыску-сумку.
— Чаму ж не згодзен? — заспакоіў Дынга. —
Удвух надзейней. Будзеш мне таварыш.

Злічылі перш прыпас—дубінкі, коп'і,
намазалі атрутным сокам стрэлы, —
тады напарнік зноў пытае ў Дынга:
— Куды патупаем?
— Во ў тыя горы, — адказвае сусед,
і з гэтым словам
абодва дружна рушылі ў дарогу.

Падскокам Кенгуру, а Дынга рыссю
мінаюць хмызнякі і так, як бачыць,
спыніліся пры топкай ручаіне.
Чырвона-жоўты глей, разводдзе крэйды
ўтваралі твань, застыглую па ўскрайку
затокі, высмажанай ярым сонцам...

Паўтыкалі лаўцы ў тое багнішча коп'і —
каляровыя фарбы. Стаяць і гамоняць:
— Ты вазьмі намалюй мяне, — лашчыцца Дынга, —
намалюй, як сабаку.
— А што ж, намалюю.
Калі так табе хочацца, будзеш сабакам, —

доўгімі крыламі і, як планер, бясшумна паплыла над зямлёй, хаваючыся ў белых палосах туману. Ці не шэры то жораў быў? Барыс ведаў, што жоравы тут жывуць, ды ніколі яшчэ не даводзілася іх бачыць. У бліжэйшых кустах ціхенька ціўкала ці не слаўка якая, а далей, недзе ля ракі, нешта ўздыхала, як у бочку ўсё роўна. З дзяцінства чуў Барыс, што такія гукі падае вадзяны бык. Адтуль жа, ад ракі, далятаў і салаўіны пошчак, гучны, з рознымі каленцамі. У канале ў чорнай вадзе гуляла рыба-маляўка, ганяючы па вадзе кругі. Таўкліся камары. Праз якую хвіліну Барыс завядзе матор, і ўсе гэтыя балотныя гукі знікнуць на ўвесь дзень, будзе толькі гурчэць матор ды плюхацца вадой і гразёю коўш экскаватара...

Шызы дымок ад матора паплыў над вадой. Барыс сеў на астылае за ноч сядзенне, узяўся за рычагі, упёрся нагамі ў педалі. Страла ўздрыгнула, нібы прачнулася, кінулася ўбок, завісла над купінай, абшчэрыла яе зубастай зяпай, падняла ўверх, — з доўгіх, як распушчаныя косы, каранёў сцякала вада, — аднесла і кінула купіну, і тая лягла набок. Хутка на яе плюхнулася другая, трэцяя, а потым іх усіх засыпала белым пяском і паліло чорнай з разбоўтаным маладым торфам вадой...

Барыс не заўважыў, колькі часу мінула, аж пакуль сонца не прыпякло яму ў спіну. Ён насцеж адчыніў дзверцы кабіны, падняў перад сабой шкло—дыхнула балотнай сырасцю, водарам нагрэтых траў, тым цёплым балотным духам, які заўсёды трымаўся над разагрэтай багнай.

Ён падняў стралу, затармазіў, скінуў абароты. Вылез з кабіны. Адчуў, як зайшліся ад стомы ногі і спіна. Пахадзіў вакол машыны, паглядзеў, ці ёсць масла ў маторы, даліў крыху саляркі, сеў на разагрэтую раму, выняў хлеб, сала. Перакусіўшы, запіў вадой. Вада ў пляшцы паспела добра ўжо нагрэцца.

Барыс хацеў ісці ў кабіну, ды раптам згледзеў у балоце злева, бліжэй да ракі, як нібы вялізная птушка ўзмахнула крыламі і зноў схавалася. Прыгледзеўся—яшчэ мільганула ў лазняках. Але цяпер гэта не было падобна на крылы, а як хто ў чорным выскачыў з-за куста. Барыс зразумеў, што ад ракі па балоце прабіраецца чалавек, пераскокваючы з купіны на купіну. Пакуль што нельга было пазнаць, мужчына гэта ці жанчына.

Чалавек які час стаяў, здаецца, выбіраў, на якую бліжэйшую купіну скокнуць. Барыс падумаў, што, можа, хто заблудзіўся ці цялё шукае... Праз колькі мінут стала бачна, што гэта была жанчына, акурат як Ніна. Няўжо Ніна? Барыс не верыў сваім вачам. Адкуль яна тут? Яна падышла бліжэй. Цяпер іх аддзяляла вузкая балацянка. Ніна наважылася скокнуць праз яе.

— Стой і ні з месца!—закрычаў Барыс.—Чуеш?

— Чую, чую!—яна радасна замахала рукамі.

— Сядзі, я пакажу, як ісці. А то толькі булькнеш...

— Ну, паказвай...

— Ідзі туды,—ён кіўнуў у бок ракі, а сам паспяшаўся ёй насустрач.

— Куды ты выбралася? — сустрэў яе якраз у канцы балацянкі. Яна была ў сінім трыко, мокрая па самую шыю.

— Да цябе.

— Як?—не зразумеў ён.

— А вось так... Хіба не бачыш?

— І як ты тут толькі прабралася? Такія балоты...

У голасе заклапочанасць і трывога.

— А на крылах,—Ніна абрадавалася ягонай заклапочанасці.

Яны пайшлі да экскаватара.

— Нічога не разумею.

— Я ж сказала, да цябе. Не прагоніш? —і так паглядзела на яго, што ён усё зразумеў.

— Я ж...—Барыс спыніўся, узяў яе за плечы. Ніна прыхінулася да яго і расплакалася. Ён маўчаў і толькі рукой гладзіў яе валасы, адчуваючы, як з яе мокрага адзення сцякае цёплая вада.

— Ты ж загінуць магла...

— Убачыла экскаватар і напрамкі...

— А як даведалася?

— Там яшчэ адзін экскаватар...

— Гаварушкі.

Яна выцерла, як малое, кулаком мокрыя вочы, насцярожана глянула на яго, спрабуючы ўсміхнуцца.

Яны вярнуліся на экскаватар.

— Мая змена, Ніна, яшчэ не скончылася, але...— ён хацеў сказаць, што гатоў зараз жа ісці ў лагер, на востраў.

— Ну і цудоўна!—Ніна абрадавалася. — Ты рабі сваё, а я гразь хоць абмыю ды пасушуся.

Барыс залез у кабіну, узяўся за рычагі. Але ніяк не мог цяпер засяродзіцца. Разы два зачарпнуўшы няўдала, вылез з кабіны. Ніна, адышоўшыся далей, уніз па каналу, раздзелася, вымыла адзенне і на альховым кусце павесіла сушыцца. Сама ж голая сядзела на купіне і боўтала ў вадзе нагамі. Паглядзець збоку—дык забаўляецца сабе малое, ды і толькі. Барыс зноў сеў за рычагі. Крыху супакоіўся і працаваў, пакуль і не падышла да яго Ніна. Яна была ў чыста вымытым і амаль сухім трыко, валасы падабрала ў вузялок на патыліцы.

— Стамілася?

— Трохі. На сонцы прыгрэлася, ледзь не заснула.

— Зараз пойдзем у лагер.

Рыгор Лінь на вогнішчы варыў у вядры капусту. Водар яе разліваўся наўкола.

— Прывітанне!—крыкнуў Барыс. — Як з'ездзіў?

— Выдатна,—Рыгор не падымаў галавы. — Вось жонка качан перадала, дык...

Убачыўшы Ніну, ён пачаў папраўляць на жываце майку, затым спытаў у Барыса:

— Адкуль?

— У балоце вылавіў. Зачапіў каўшом, падняў. Думаў, чорт які. Прыглядзеўся — дзеўка, — Барыс гучна засмяяўся.

— А можа, і сапраўды я чорт балотны? Ты перахрысціся,—Ніна таксама смяялася.

— Тапілася? — строга дапытваўся Рыгор Лінь.

— Ага, ледзь не ўтапілася,—Барыс абняў Ніну.— Бегла напрамкі праз балота.

— Не, я сплю ці не? — усё не верыў Рыгор.

— Можа, укусіць?—спытаў Барыс.

— Укусі,— і Рыгор падаў руку.

Барыс добра-такі хапіў яе зубамі, Рыгор ажно войкнуў.

— Ну, прачнуўся?— адскочыў Барыс.— Калі прачнуўся, то даставай, што там прывёз. Жонка, можа, не толькі качан дала? Адзначым паспяховыя ўцёкі з няволі нашай зямлячкі.

— Не толькі качан, але і свінінкі пару кілаграмаў і каўбаскі, а вось таго, што ты маеш на ўвазе, не дала.

— Тады свята адкладваецца,— уздыхнуў Барыс.— Перанясём на вечар. Я збегаю ў вёску...

— А я абяцаю гэтую падзею азнаменаваць працоўным рэкордам,— паабяцаў Рыгор Лінь.

Пасля абеду ўсе разышліся працаваць. У лагеры засталіся толькі Барыс з Нінай.

— Можа, хочаш адпачыць?—спытаў ён.

— Не.

— Давай так... Я збегаю ў вёску, а ты што прыдумай... Харч у яме за вагончыкам...

— А мне можна з табой?

— Я ж сказаў,— у голасе строгасць. Аднак, адчуўшы, што ён залішне ўжо строгі, сказаў мякчэй:— Да вёскі няблізка, буду спяшацца, а ты і так стамілася.

Ніне на хвіліну падалося, што Барыс не рады яе прыходу, таму і строгасць такая.

— Можа, я дарэмна, Барыс, прыбегла?

— Ты што? Я ў балота палез далей ад людзей, каб цябе забыць... Вось так. Колькі разоў хацеў табе напісаць, ды...

— Даруй мне, Барыс.

— Ладна. Ведала, што робіш...

— Спачатку нічога не ведала. Сядзела дома. Была на гародзе. Як пачула яго матацыкл, то і пабегла ў лес. Пабаялася, што не змагу адмовіцца, паеду з ім. Ведаеш, пры маці... А ў лесе надумалася вось да цябе,— яна памаўчала, пасля дадала:— Прагоніш, назад дамоў не пабягу. Дзе-небудзь у балоце...

— Пакуль не развядзешся, не зможам запісацца.

— Хіба гэта галоўнае, Барыс?

— Хачу, каб грунтоўна, каб ты не думала...

— Я нічога і не думаю. Прыйшла, каб назаўсёды з табой... Калі не супраць...

— Я — за!— Барыс радасна прытуліў яе і пацалаваў.

—Вось што,— пачала яна заклапочана, як гаспадыня.— Пойдзеш у вёску, пазвані там, каб маці перадалі, дзе я, а то з міліцыяй шукаць будуць.

Барыс вярнуўся гадзіны праз тры. Ніна на кастры пякла дранікі. Іх багата было ў вялікай каструлі. На патэльні, што стаяла на цаглінках, цвірчэла свініна з цыбуляй. Барыс выняў бутэлькі, а потым не стрымаўся, схапіў адзін дранік, макнуў з патэльні, падзьмухаў трохі і ў рот.

— Ну, я табе скажу!—захапляўся Барыс.— Чаму ты раней не прыбегла?

Ніна, расчырванелая ад вогнішча, увагі не звярнула на яго пахвальбу.

— Пазваніў?

— Пазваніў.

— Каму?

— У калгасную кантору. Там якраз быў брыгадзір з нашай Альхоўкі.

— Добра. А хлопцы хутка будуць?

— У прыцемках...

— Дранікі астынуць. Іх свежанькія трэба.

— Зараз усе будуць на месцы,— Барыс узяў сякеру, высек альховую жэрдку, павесіў на яе белую майку, жэрдку прымацаваў над вагончыкам.— Зараз збягуцца. У нас такая дамоўленасць, як трэба ўсім сабрацца, падымаем што-небудзь.

І сапраўды, хутка пачалі збірацца рабочыя. Прыйшоў Гаварушка са сваім памочнікам, прыйшлі і дрывасекі, а потым — Рыгор Лінь.

— Я чую, цягне цыбулькай,—сказаў ён і пахваліў Барыса.— А ты, дзед, нядрэнна папрацаваў. Ніна, можаш ганарыцца ім.

Толькі ўселіся ля самаробнага стала, на якім у місах дымяліся яшчэ гарачыя дранікі, стаяла шырокая патэльня з падсмажанай цыбуляй і свінінай, узвышалася вядро з юшкай, лусты хлеба, бутэлькі з гарэлкай, не паспелі выпіць і па першым разе, як з хмызнякоў нечакана з'явіліся Катлоў і Люда Гусак. Абое былі ў гумовых ботах, у саламяных капелюшах.

— Яны во што робяць, а мы думалі, ад світання да світання за рэкорды змагаюцца,—павітаўся з усімі за руку Катлоў.

— Просім да стала,— запрасіў Гаварушка.

— Калі ласка, калі ласка,— падала Ніна гасцям відэльцы.

— Начальства хочаце ўлагодзіць,—смяяўся Катлоў.

— У нас урачыстасць,— сказаў Лінь. —Барыс Малюк у балоце знайшоў гэтую русалку. Яна пагадзілася стаць яго жонкай,— ён паказаў на Барыса.— Так што за шчасце маладых!

— Дваццаць пяць год у меліярацыі, а першы раз бачу, каб вяселле вось так, у балоце...

— Не вяселле, а рэпетыцыя,— удакладніў Барыс.

— Выдатная рэпетыцыя... З радасцю прыму ўдзел, —пагадзіўся Катлоў.—Вось толькі з чобатаў ваду...— ён адышоўся, разуўся, выліў рыжую ваду з чобатаў, адкінуў іх убок і сказаў Людзе Гусак:— Пайшлі, прараб, калі запрашаюць...— ён пасадзіў Гусак, а потым сеў і сам побач.—Глядзі ты, у іх дранікі, юшачка, і наогул...

— За здароўе маладых!— падняўся Гаварушка.

— Запісаліся?— спытаў Катлоў.

— Не,— сказаў Барыс.— Потым.

— А то прывезлі б сакратара сельсавета.

— Яна і так не збяжыць,—засмяяўся Барыс.

— Адсюль не збяжыш,— пагадзіўся Катлоў.— Хіба на верталёце... Ну, за шчасце?—ён пачакаў, пакуль выпе Люда Гусак, а потым і сам перакуліў са шклянкі ў рот.

---

Кенгуру не ўпіраецца і падыходзіць
да завоіны з багнаю белага глею.

— Не, ты рыжым малюй. Я ж і пэйсамі рыжы,
так што масці паджарай мне быць і сабакам.
— Будзеш рыжым, — адказвае і пачынае
маляваць галаву, к галаве ўвачавідкі
прысабачвае тулава, лапы і нават
хвост калматы. — Ну вось, палюбуйся — гатовы!
Я стараўся як мог. Калі сам быў няздатны
асабачыць сябе, дык сябрук асабачыў.

— А нішто сабе, — скаліцца радасны Дынга. —
Што ўнутры — не відно, а на выгляд — сабака.
— А цяпер ты мяне, як і я, намалюеш, —
Кенгуру папрасіў. — За паслугу — паслуга.
— Паспрабую, — згаджаецца Дынга, — ды толькі
ты цыбаты занадта. Прысядзь ці прыкленчы.
— Пастарайся ж, рыжун, каб было падабенства, —
просіць Кенгуру. — Род наш — зусім не пачварны.
— Упадобню па вобразу і падабенству, —
заспакойвае Дынга. — На кукішкі сядзь ты.

Дынга ўраз наканечнікам паліцы ў глеі
начарціў галаву, вушы, доўгую шыю,
потым тулава з сумчатым чэравам, лапкі.
Стан гатовы, і стан гэты, як на трыножнік —
доўгі хвост і магутныя заднія лапы —
асадзіў гэты рыжы мастак.

— Пацалуйся
сам з сабой на гразі,—выскаляецца Дынга.—
Як жывы! Я ўпісаў там усё, як належыць.

— Калі ўсё з Кенгуру — чалавека ты здолеў
неяк выявіць там, у сваёй мазаніне,
значыць я там увесь, — пагаджаецца сябра. —
А цяпер, — ён загадвае рыжаму, — будзем
да звяроў прымяркоўваць і звычкі, і голас.
Пачынаем з цябе: гаўкай, вый і грызіся.
— Паспрабую, — згаджаецца Дынга і сумна
заскуголіў, як дзікі сабака ў саванне.

Кенгуру не здаволіўся, зноў патрабуе:
— Увяжыся за мной у пагоню і яхкай.
— Добра, — яхкаць дагэтуль не ўмеў, але буду
гнаць і яхкаць. Пускайся ж, пачвара, наўцёкі! —
Кенгуру паскакаў, Дынга — услед з яхкатаннем.

З той хвіліны яны быць людзьмі перасталі.
Кенгуру кандыбаў праз хмызы, а сабака —
гэтаксама пярэварацень з чалавека —
гнаўся ўслед. Прыбягаюць, нарэшце, да рэчкі,
адпачыць і вадою адхаяць знямогу.
Пастаялі. Вады пахлябтаўшы, сабака
зноў пытае: — Скажы мне, якое найменне
мы дадзім той гляістай крынічнай мясціне,
дзе з табою адзін аднаго выяўлялі?

Кенгуру не здаўмеўся: — Не ведаю, — кажа, —
Я не здатны на выдумку. Ты прыкумекай,
Бо сабакі ж з звяглівай пароды.
Сабака нездаволена зрэнкамі бліснуў і гыркнуў:
— Гыргыргыра — найлепшая ўрочышчу назва. —
Пасядзелі б, ды дзе там жывёле да седні!

—Пабяжым,—Кенгуру падшыхае сабаку.
— Пабяжым,—пагаджаецца Дынга.
Пабеглі.

Кенгуру над кустоўем шыбуе скачкамі,
а за ім, апантана якокучы, — Дынга.
Перасеклі ручай, праз другі прамахнулі,
выбягаюць на ўзлобак — падножжа высокай
камяністай гары аж пад воблакі ў небе.
—Улягаў, улягаў, — прызнаецца сабака, —
а яшчэ не ўзбягаў на падобную кручу.
— Не ўзбягаў, то ўзбяжыш,—Кенгуру абяцае.
Ты паменей бы гаўкаў, а лепей вось цяпні
мне за кончык хваста.
Дынга цяпнуў. Стралою
мільгануўся сябрук яго ўгору, а следам
ад натугі без гáласу гнаўся сабака.

Як на крылах — і дзе толькі бралася сіла? —
схіл круты праскакалі — і ўжо на вяршыні.
Дынга жаліцца:—Рыжы, у мяне закружыла
ў галаве: хараство ж тут якое наўкола!
Як жа мы назавем гэта месца, што ўправа,
і вунь тое, што шчэ прыгажэйшае, злева?
— Назавем Намілукары * тое, што справа,
Бінамінамі * тое, што злева, — з уцехай
Кенгуру прапануе і горда канчае:
— Тут нам жыць з роду ў род і ад веку да веку!

** Намілукары, Бінамінамі — на мове абарыгенаў назвы горных кражаў на поўдні Аўстраліі. (Заўвага перакладчыка).

# ОПЕРА СЁННЯ, ОПЕРА ЗАЎТРА...

**«Дон Карлас» Дж. Вердзі ў Дзяржаўным тэатры оперы і балета БССР**

Увагу ўсіх тых, хто нават вёс ад часу цікавіцца жыццём беларускага опернага тэатра, не можа не прыцягнуць шэраг яркіх выканаўчых імёнаў на яго афішы. Тут і творчая моладзь — А. Дзедзік, А. Рудкоўскі, Н. Казлова, В. Скарабагатаў, В. Цішына, Я. Пятроў, і прызнаныя майстры беларускай опернай сцэны, таленты якіх знаходзяцца цяпер у стане найбольш поўнага раскрыцця,—С. Данілюк, А. Саўчанка, В. Чарнабаеў.

А як многа значыць уменне гэтыя творчыя сілы выкарыстоўваць, канцэнтраваць! Правільна разумець задачы кожнага сённяшняга дня магчыма толькі тады, калі добра ўяўляеш, якім павінен быць заўтрашні дзень тэатра. Вось ужо які сезон музычнае кіраўніцтва многіх спектакляў ажыццяўляе галоўны дырыжор Дзяржаўнага тэатра оперы і балета БССР Я. Вашчак, а рэжысуру большасці новых оперных пастановак — С. Штэйн. Сцвярджаючы сваё крэда — выбарам тэмы, яе рашэннем, — яны робяць уплыў на сённяшняе творчае аблічча тэатра, дзе класіка і сучаснасць — побач. «Барыс Гадуноў», «Залаты пеўнік», «У буру», «Дон Карлас»... А яшчэ па афішы можна меркаваць, што добра разумеюць тут адказнасць за сучасны нацыянальны рэпертуар. Нядаўнія пастаноўкі «Джардана Бруна» С. Картэса і «Сівой легенды» Д. Смольскага выклікалі ўвагу тэарэтыкаў і практыкаў мастацтва да праблемы суадносін дзеяння і музыкі ў оперы. І не толькі да гэтай праблемы.

Святлана Данілюк

Аляксандр Дзедзік
Фота А. ДЗМІТРЫЕВА.

Сённяшнюю нацыянальную беларускую оперу нельга ўявіць без шырокага гістарычнага фону, без вострых ідэйных калізій і сацыяльных канфліктаў. Але і без моцных пачуццяў асобных герояў, без тонкіх эмацыянальных фарбаў, укладзеных у музычнае дзеянне, оперу таксама нельга ўявіць. А для магчымых апанентаў — паборнікаў музычнага мадэрну— хацелася б падкрэсліць: у якіх бы адносінах ні былі ў оперы сцэнічнасць (тэатральнае дзеянне) і канцэртнасць, нягледзячы на прыватнасці жанру — лірычнага або драматычнага, усё ж такая форма, як арыя, застанецца назаўсёды найбольш характэрнай для опернай спецыфікі. Менавіта дзякуючы сваёй найбагацейшай арыёзнай прыродзе і не старэе, скажам, музыка вердзіеўскіх опер, і пры сённяшняй пастаноўцы вымагае яна мінімум рэжысёрскіх рэформ. Оперы Дж. Вердзі паранейшаму, як і сто гадоў назад, вучаць выканаўцаў спяваць, у спевах адчуваючы і ўвасабляючы рух драмы.

Невыпадковае з'яўленне на сёлетняй афішы беларускага тэатра оперы «Дон Карлас» Дж. Вердзі. У папулярнасці гэты твор нельга суаднесці, скажам, з геніяльнымі, але «запетымі» ўсімі вялікімі і малымі тэатрамі «Травіятай», «Рыгалета»; ён гучыць нават радзей, чым «Трубадур», «Атэла». Таму «Дон Карлас» для мінчан — тое сапраўднае новае, што вабіць чароўным водарам адкрыцця. Створаная ў час кампазітарскай сталасці, гэта опера Вердзі каштоўная відавочным драматургічным майстэрствам італьянскага кампазітара.

Бадай, у кожным спектаклі ёсць адзін герой (а калі два ці тры), без якога не ўявіць сабе ўвесь твор. Мы ідзём у тэатр, усхваляваныя чаканнем сустрэчы з Барысам Гадуновым, з Лізай і Германам, з Аідай, Радамесам і Амнерыс. Але бяруся сцвярджаць, што мала ў якой оперы сустрэнеш гэткае суквецце характараў, як у «Дон Карласе».

Зразумела, абмежаваныя спецыфікай опернага жанру, кампазітар з лібрэтыстам вымушаны адмаўляцца ад шматлікіх сюжэтных і вобразных падрабязнасцей першакрыніцы: адны героі шматпланава раскрываюцца ў музычнай драматургіі, іншыя толькі акрэслены. Вось і Дж. Вердзі разам з лібрэтыстамі М. Мэры і К. дзю Локлем адмовіўся ад такіх каларытных персанажаў драмы Ф. Шылера, як герцаг Альба і яго прыслужнік Дамінга, пэўным чынам замяніўшы іх вобразам Вялікага Інквізітара. Затое — Філіп, Елізавета, Эбалі, маркіз дзі Поза, Карлас! Зыходзячы з музычных характарыстык, цяжка вылучыць адзін з пяцярых вобразаў як «найбольш галоўны», найбольш значны і глыбокі за іншыя.

Трагедыя іспанскага караля Філіпа II, які імкнецца да сусветнага ўладарства, каралякрывасмока і гвалтаўніка, які адабраў нявесту ў роднага сына, а самога прынца аддаў у рукі інквізіцыі, трагедыя яго у помсце ўласнага сумлення, рэўнасці і падазронасці да ўсяго і ўсіх, у рабскай залежнасці ад Інквізітара, у вострай тузе па хоць якім блізкім чалавеку. Ні кроўю Карласа і дзі Позы, ні жыццём Елізаветы ён не набывае спакою, трапляе ў новыя бясконцыя пакуты. Як уражвае слухача арыя Філіпа ў пачатку трэцяй дзеі! Уражвае багаццем і пранікнёнасцю інтанацыйных рысаў, нечаканых для злоснага, помслівага Філіпа. Разам з каралеўскай веліччу — чалавечая бездапаможнасць, адзінота.

Каралева Елізавета ў оперы (як і Філіп) не супярэчыць шылераўскай гераіні. Елізавета — гэта стрыманасць, затоены боль, дзівосная мужнасць пры душэўнай тонкасці. Музычны апафеоз «вечнай жаноцкасці»... А побач — Эбалі, якая таксама належыць да вышэйшага свету іспанскага каралеўскага двара. Дзёрзкая прыгажуня за кароткі час перажывае вялікую трагедыю, мужна прымае адплату за здрадніцтва. Музыка Эбалі, спачатку экзатычная, аздобленая іспанскім нацыянальным каларытам, «капрызнымі» інтанацыямі, паступова набывае трагедыйную сілу.

Высокі маральна-патрыятычны пафас маркіза дзі Позы як бы напаўняецца новым сучасным зместам. Захапляе нас мяккая паэтычнасць і цеплыня ў яго невялікіх арыёза, яго высакародная непахіснасць у сцэне з каралём. Драматызм вобраза дзі Позы асабліва кранае, бо ў яго музычным матэрыяле значнае месца займаюць лірычныя інтанацыйныя фарбы. Але найбольш драматычная і складаная ў оперы характарыстыка інфанта Карласа.

Акрамя таго, што Карлас непасрэдна ўдзельнічае амаль ва ўсіх сцэнах оперы, ён яшчэ вельмі адчувальна нагадвае аб сабе ў партыях іншых дзейных асоб. Імкненні іх усіх так ці інакш скіраваны да Карласа. Яго палымяна кахае Эбалі, ім жа ахвяруе, ратуючы сваю чалавечую годнасць. Трагічным каханнем звязана з прынцам яго былая нявеста Елізавета, Філіп — сваёй пагардай, рэўнасцю, помстай і страхам, Радрыга — найвышэйшымі грамадзянскімі і сяброўскімі парываннямі.

А зараз — некалькі слоў аб гісторыі стварэння оперы «Дон Карлас». Твор быў заказаны кампазітару вялікім французскім тэатрам (Grand opera), умоўнасці якога патрабавалі «вялікіх опер», абавязкова аздобленых балетнымі сцэнамі і адзначаных даволі павярхоўным зместам. Хаця ў сюжэце «Дон Карласа» багатыя акалічнасці дзеяння, Вердзі лічыў аднаго гэтага недастатковым для оперы як для музычнай драмы: патрэбны і ўнутраныя «рухавікі»—чалавечыя характары, вялікія ідэі — што і ўвасобіў ён у музыцы. У выніку замест чаканай пампезнай маштабнасці (маштабнасці ў шырыню) опера набыла глыбокі сэнсавы і ідэйны маштаб. Ды інакш гэта не быў бы «вялікі Вердзі». Але менавіта з-за сваёй сур'ёзнасці і змястоўнасці опера была дрэнна ўспрынята на першай прэм'еры ў Парыжы (1867 год). Больш прыхільна сустрэлі яе ў Італіі, якая змагалася ў той час супраць каталіцызму.

Сам аўтар пры жыцці зрабіў, акрамя французскай, іншую, італьянскую рэдакцыю, потым яшчэ адну, дзе адкінуў першую дзею і балетныя сцэны. У наш час (1952 год) з'явілася нямецкая рэдакцыя Ю. Капа і К. Золтана, якой трымаліся пастаноўшчыкі ў беларускім тэатры (пэўныя тутэйшыя варыянты амаль што не маюць прынцыповага значэння для драматургіі цэлага).

Спектаклем «Дон Карлас» адкрываўся ў Мінску II Усесаюзны фестываль творчай моладзі тэатраў оперы і балета. Гэта было адказнае прадстаўленне мастацкіх магчымасцей і прынцыпаў нашага тэатра. «Дон Карлас» захапіў усіх не толькі музычным хараством, але і высокім артыстычным густам і майстэрствам усіх удзельнікаў спектакля.

Калі пазней у тэатральнай гасцінай абмяркоўвалася гэта работа, хтосьці з мастацтвазнаўцаў пажартаваў: маўляў, самым маладым у гэтым спектаклі выглядаў дырыжор Я. Вашчак. Можна было толькі пазайздросціць яго эмацыянальнаму напалу і ўлюбёнасці ў музыку. Усіх зачаравала сваім дзівосным тэмбрам, вакальнай тэхнікай, сцэнічнай грацыяй С. Данілюк у партыі Эбалі. Сапраўднай мастацкай з'явай стала выкананне партыі Філіпа маладым спеваком Я. Пятровым. Яго багаты і прыгожы бас «маляваў» каралеўскі воблік, здавалася, без аніякай заўважальнай натугі.

На дзіва арганічна спалучылася з вобразам Елізаветы творчая індывідуальнасць Н. Казловай — яе вельмі лірычны, крыху звончаты і ў той жа час мяккі тэмбр, пранікнёныя піянісіма ў верхнім рэгістры. Маркіз дзі Поза запомніўся ў выкананні А. Саўчанкі, а ў ролі Вялікага Інквізітара адметнымі падаліся два выканаўцы — А. Лакшын і М. Дружына.

Найбольш складаная задача выпала на долю А. Дзедзіка. Спявак мае найбагацейшы вакальны матэрыял і драматычны талент, а вобраз Карласа вымагае якраз мноства фарбаў і нюансаў. Здаецца, што артыст тут знайшоў ужо вельмі многае, але здаецца таксама, штосьці яшчэ выношвае, вывярае. Пажадаем яму поспеху!

Цікава і знамянальна, што праца рэжысёра і мастака ў гэтым спектаклі была накіравана на тое, каб не парушыць той дзівосны «акорд», які складаецца з усёй раскошы вердзіеўскай музыкі. Такая пазіцыя не забяспечыла поспех кожнаму паасобку, а спрыяла поспеху ўсяго спектакля. У калектыўнай, сумеснай творчасці надзвычай важна мець дакладнае разуменне сваёй ролі ў кожнай «частцы цэлага». Лаканізм — вось, бадай што, галоўнае патрабаванне да опернага рэжысёра, як і для мастака.

Малады рэжысёр-пастаноўшчык «Дон Карласа» М. Ізворска-Елізар'ева пачала працу над сваім мінскім дэбютам з наведвання ў тэатры ўсіх класаў, дзе рэпеціравалі музыканты. Таму і на сцэне яна здолела «паставіць» музыку, а не опернае лібрэта. У гэтым прынцыповы поспех працы М. Ізворска-Елізар'евай, нягледзячы на дробныя рэжысёрскія хібы.

На афармленне оперы быў запрошаны ў Мінск А. Арэф'еў—дырэктар і мастацкі кіраўнік Днепрапятроўскага тэатра оперы і балета. Мастак разумеў, што рэалістычную сілу спектаклю нададуць не з канкрэтнасцю пастаўленыя канкрэтныя сцэны, не шматлікія музейныя падрабязнасці быту Іспаніі часоў Адраджэння — з гэтага ён пакінуў толькі раскошу тагачасных касцюмаў. У дэкарацыях жа А. Арэф'еў скарыстаў вельмі лаканічную метафару, дзе колер і контур характарызуюць эпоху Філіпа II эмацыянальна і ёміста.

У свой час Ф. Шылер, напісаўшы драму «Дон Карлас», увасобіў у ёй роздум аб лёсе радзімы, пратэст супраць антынароднай формы праўлення. Ён так вызначыў сваю задуму: «Лічу сваім абавязкам адпомсціць у гэтай п'есе сваім паказам інквізіцыі за зняважанае чалавецтва, прыгваздзіць да ганебнага слупа яе злачынныя дзеянні. Я хачу, каб меч трагедыі ўвайшоў у самое сэрца той людской пароды, якую ён да гэтага часу толькі злёгку кранаў...». Калі праз некалькі гадоў прагучала аднайменная опера Дж. Вердзі, французскі крытык Ж. Кларэці напісаў: «Шылер не мог бы паскардзіцца на тое, што яго не разумеюць!».

А поспех сённяшняй пастаноўкі «Дон Карласа» на опернай сцэне? Гэта не толькі сведчанне высокага прафесійнага ўзроўню ўсіх творчых сіл тэатра. Гэта і падтрымка, і разуменне, і прызнанне беларускім слухачом асноўнай рэпертуарна-тэматычнай лініі, якая акрэсліваецца ў апошніх оперных і балетных спектаклях: «Стварэнне свету», «Джардана Бруна», «Ціль Уленшпігель», «Сівая легенда»... Тут выкрыццё прыгнёту і цемрашальства ва ўсіх праяўленнях, сцвярджэнне гуманістычных ідэалаў. Пастаноўка «Дон Карлас» прадаўжае гэтую лінію.

**Наталля ІУЧАНКА.**

# ДЗЕЦІ БЕЛАРУСІ, ДЗЕЦІ ГАЛАКТЫКІ...

ДВАЦЦАЦЬ ГАДОЎ НАЗАД, у 1959 годзе, стартавала на Месяц першая савецкая навуковая касмічная станцыя. 12 красавіка 1961 года першы ў свеце касманаўт Юрый Аляксеевіч Гагарын здзейсніў аблёт Зямлі на касмічным караблі «Усход». Пачалася эра асваення космасу. Адначасова пачалося асваенне касмічнай тэмы ў кіно і на тэлебачанні. Рэпартажы Цэнтральнага тэлебачання пра палёты савецкіх касманаўтаў сталі неад'емнай часткай праграмы кожнага палёту. З цягам часу з'явіліся фільмы, прысвечаныя асобным касманаўтам, навукова-тэхнічным, сацыяльным і псіхалагічным праблемам касманаўтыкі. У іх ліку—дакументальныя фільмы «Першы рэйс да зорак», «Юрый Гагарын», «Расказ пра майго сябра», «Набліжэнне да неба» (пра Ю. Гагарына); «Валянціна Церашкова», «Палёт працягваецца» (пра Г. Грэчку і Ю. Раманенку); «Галоўны канструктар» (пра С. П. Каралёва); «Абняць неабдымнае» (аб праблемах касмалогіі). Сярод гэтых твораў — і стужкі, прысвечаныя нашым землякам, беларускім касманаўтам Пятру Клімуку («Шлях да Арыёна», «Звычайны космас», навелы ў фільмах «Пра маці можна расказваць бясконца» і «Зямля мая, лёс мой») і Уладзіміру Кавалёнку («140 сутак над планетай», «Хлопец з вёскі Белае»).

Тэлебачанне ў серыях касмічных рэпартажаў выконвае сваю непасрэдную задачу — інфармаваць нас аб ходзе палёту, аб стане здароўя касманаўтаў, аб выкананні імі запланаваных даследаванняў і эксперыментаў. Мы ў «рэальным» часе перажываем разам з касманаўтамі тут, на зямлі, усе перыпетыі іх касмічных вандраванняў. Для тэлегледачоў у касмічных рэпартажах інфармацыя і эмоцыя неадрыўна злітыя—і ў час адлёту экіпажа на Байкануры, і ў час іх вяртання на зямлю, святочных сустрэч з паплечнікамі, прэс - канферэнцый у Маскве.

Потым, калі пройдзе пэўны час, экран ізноў звяртаецца да гэтай тэмы, але ўжо інакш. Галоўнае ў дакументальных стужках, у адрозненне ад тэлеперадач, — не сама па сабе інфармацыя (вынікі палёту ўжо шырока вядомы), а аналіз, псіхалагічнае даследаванне непаўторнай чалавечай асобы, роздум аб прафесіі, аб жыцці, аб праблемах часу. Чалавеказнаўства — вось мэта дакументальнага фільма, які ў адрозненне ад хронікі, не проста дае нам звесткі пра падзеі, а па-мастацку вобразна даследуе характары.

Беларускія «зорныя браты» Пётр Клімук і Уладзімір Кавалёнак сталі героямі касмічных тэлерэпартажаў і дакументальных стужак у апошнія гады, калі да касмічнай тэмы ў дакументалістыцы гледачы ўжо прызвычаіліся, убачыўшы нямала цікавых рэпартажаў і фільмаў. Таму стваральнікам гэтых фільмаў патрэбна было асаблівае майстэрства, каб раскрыць новыя грані ў пачэснай, славутай і цяжкай прафесіі і паказаць чалавечую адметнасць герояў космасу.

У фільме «Шлях да Арыёна» (рэжысёр Б. Сарахатунаў, аператар А. Алай), створаным у 1974 годзе ў аб'яднанні «Летапіс» студыі «Беларусьфільм», была ўпершыню ў рэспубліканскай кінадакументалістыцы закранута тэма «зямнога прыцягнення» ў космасе. Пётр Клімук быў зняты ў хуткім часе пасля яго першага палёту на касмічным караблі «Саюз-13» сумесна з Валянцінам Лебедзевым. Аўтары зрабілі жывую рэпартажную замалёўку святочных сустрэч Клімука з роднымі і аднавяскоўцамі ў вёсцы Камароўка, са студэнтамі Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна ў Мінску. Касманаўт, крыху саромеючыся сваёй касмічнай славы, шчыра ўсміхаўся, адкрыта і проста адказваў на шматлікія пытанні. Прываблівалі яго шчырая ўсмешка, даверлівасць, адкрытасць і пэўная, мабыць, разгубленасць ад такой вялікай увагі, яшчэ нечаканай, нязвыклай. Сам фільм нагадваў эмацыянальны рэпартаж з месца падзей сваёй асаблівай праўдзівай атмасферай, мноствам выразных жыццёвых дэталей.

Зварот да тэмы Радзімы, тэмы Беларусі быў у фільме не «фармальнай прывязкай» да касмічнай тэмы, а ўнутранай неабходнасцю, якая вынікала з самой структуры твора. Як ядома, у беларускім пасляваенным кіно адной з вядучых тэм стала тэма памяці, тэма ваеннага дзяцінства. Набрала сілы, пасталела пакаленне, якое прыйшло ў жыццё ў жорсткія і гераічныя дні Вялікай Айчыннай. Духоўныя вытокі фарміравання іх характараў — менавіта адтуль. Пра «дзяцей вайны» створаны дакументальныя і мастацкія фільмы для вялікага і малога экранаў. Іх героі — сыны палкоў, юныя разведчыкі, проста падлеткі, што зусім малымі падзялілі з краінай, народам іх лёс.

Сёння ў гэтае кола тэм упісана яшчэ адна старонка. Дзеці вайны, дзеці гераічнай Беларусі-партызанкі сталі «зорнымі братамі», узняліся ў касмічныя далі. І таму натуральна, што кінематаграфісты імкнуцца расказаць не толькі пра іх касмічныя трасы, але і пра іх сувязь з роднай зямлёй, гісторыяй яе народа. Працавіта, шчырасць, адкрытасць, сардэчнасць — характэрныя рысы беларускіх «касмічных братоў». Бадай, самае цікавае для нас у створаных пра іх фільмах — менавіта гэтае іх «зямное прыцягненне», тое асяроддзе, якое выхавала беларускіх касманаўтаў.

І натуральна, што ў экранных творах мы бачым не толькі саміх касманаўтаў, але і іх родных, сяброў, аднавяскоўцаў — тых, хто сёння радуецца, ганарыцца поспехамі сваіх касмічных пасланцоў.

Маці Клімука, Марфу Паўлаўну Клімук, мы ўбачылі ў яе доме 10 ліпеня, у дзень нараджэння сына, у фільме «Пра маці можна расказваць бясконца». Сын у гэты час быў у космасе, на арбіце станцыі «Салют-4». Рэжысёры фільма І. Вейняровіч, П. Аліфярэнка, Р. Ясінскі знайшлі патрэбную танальнасць, каб перадаць цеплыню мацярынскага дома, прыгажосць роднай зямлі, яе квітнеючую непаўторнасць. Якраз у гэты час, калі адбываліся здымкі маці касманаўта, па тэлебачанні ішоў рэпартаж пра тое,як адзначаўся дзень нараджэння яе сына ў космасе. Яго сябра Віталій Севасцьянаў пачаставаў яго вырашчанай на борце карабля зелянінай і з жартам пракаменціраваў: «Пеця ходзіць у гарох і цыбуляй закусвае». А маці, якой паказалі гэты тэлерэпартаж, расказвае нам з экрана, усміхаючыся, гледзячы на свой зялёны сад і агарод: «Усё ў нас ёсць: і ягады, і грыбы. Пеця іх любіць. Уся наша вёска чакае: «Калі ўжо гэта Пеця сядзе... Калі ўжо гэта Пеця сядзе...».

Такая ж лірычная танальнасць і ў фільме рэспубліканскага тэлебачання «Хлопец з вёскі Белае», прэм'ера якога адбылася нядаўна на малым экране. Аўтары (А. Вялюгін, У. Арлоў, Л. Броўтман) знаёмяць нас з роднымі, сваякамі і аднавяскоўцамі Уладзіміра Кавалёнка. Да гэтага мы бачылі ўжо стужку Цэнтральнага тэлебачання «140 сутак над планетай». Фільм здымалі самі касманаўты, яны ж выступілі і ў якасці сцэнарыстаў, адабраўшы самае цікавае з 50 рулонаў відэаплёнкі, знятай у час іх 140-дзённага палёту над планетай. Праўда, самыя эфектныя кадры зняла... сама камера ў час вольнага палёту ў бязважкасці. Але галоўным у фільме стаў цікавы навуковы каментарый лётчыкаў-касманаўтаў Уладзіміра Кавалёнка і Аляксандра Іванчэнкава.

У стужцы беларускіх тэледакументалістаў «Хлопец з вёскі Белае» тэма космасу засталася амаль за кадрам. Хутчэй, яна гучыць у падтэксце, надаючы танальнасць кантрастнага супастаўлення бясконцай нябеснай прасторы і прыгажосці зямной прыроды. Галоўнае ж у фільме — людзі беларускай вёскі Белае: маці касманаўта Вольга Іванаўна, бабуля Ульяна, яго дзядзькі, землякі, суседзі, першая вясковая настаўніца Кацярына Пятроўна.

«У касмічным экіпажы «Зямля» — 9,5 мільёна беларусаў», — гэтыя словы дыктара аб'ядноўваюць тэму касмічную і зямную. Пра гэта ж задуменна гаворыць Уладзімір Кавалёнак. Для яго дом—гэта маці, аднавяскоўцы. Касманаўт успамінае, як у абодва палёты ён браў з сабой зямлю Хатыні. І гэта быў не прадмет сімволікі, гэтая зямля для яго — увасабленне цяжкіх гадоў і ахвяр.

Тэма ваеннага дзяцінства, тэма памяці гучыць у фільме тонка, амаль музычна — у пластыцы кадра, у фотаздымках сваякоў у зашклёнай рамцы на сцяне вясковай хаты, у расказах старой бабулі Ульяны, што так ласкава, па-добраму ўспамінае дзяцінства ўнука, жадае шчасця ўсім людзям на зямлі...

Фільм прываблівае сваім паэтычным настроем, цікавымі рэпартажнымі здымкамі. Але, бадай, самы выразны ў карціне невялічкі эпізод. Уладзімір Кавалёнак дзеліцца з тэлеэкрана самым запаветным: «Ёсць у мяне такое паняцце: размова са сваім сумленнем. Пасля цяжкага палёту трэба рашыцца — на такі ж палёт ці больш доўгі. Я рыхтуюся»... Мы бачым касманаўта ў стане роздуму, псіхалагічнай засяроджанасці. Ідзе вялікая ўнутраная работа, напружаны працэс думкі. А гэта ў дакументалістыцы заўсёды самае цікавае.

Менавіта гэтай якасцю асабліва каштоўны для нас і двухсерыйны дакументальны тэлефільм Цэнтральнага тэлебачання «Звычайны космас» (сцэнарысты П. Клімук і В. Севасцьянаў, рэжысёр С. Зялікін, аператар А. Савін). Выяўленчы рад фільма складаюць бартавыя здымкі і тэлерэпартажы, зробленыя касманаўтамі з «Салюта-4». Многія з іх тэлегледачы ўбачылі ўпершыню. Клімук і Севасцьянаў, як і многія іх калегі, праявілі сябе добрымі кінематаграфістамі, яны прафесійна здымаюць і манцыруюць кінастужку. Але найбольш захапляючае ў фільме — сам расказ касманаўтаў, іх дыялог. Размова ідзе на гэты раз не пра тэхніку палётаў, не пра складанасць медыцынскіх, біялагічных і інжынерных эксперыментаў. Сябры ўспамінаюць разам складаныя сітуацыі, «звычайны» касмічны быт, экстрэмальныя ўмовы, якія выяўляюць асаблівасці псіхалагічнай сумяшчальнасці. Мы чуем смех касманаўтаў, бачым іх слёзы, калі ім трэба расставацца з касмічнай станцыяй. У адказ на пытанне аб галоўнай якасці, патрэбнай члену касмічнага экіпажа, яны адказваюць аднолькава. Гэта—дабрата, клопат пра сябра-паплечніка. Космас выпрабоўвае не толькі тэхніку, але і чалавека. «Звычайны космас» — гэта фільм пра звычайнага чалавека ў незвычайных абставінах, якому патрэбна і тэхнічная, навуковая дасведчанасць, і фізічная трэніраванасць, і высокія маральныя якасці. Дарэчы, шматграннасць касманаўтаў, іх шырокі навукова-тэхнічны і эстэтычны погляд на сусвет, на праблемы космасу і зямлі выявіўся ў шэрагу вельмі цікавых напісаных імі кніг. У іх ліку—і кніга беларускага касманаўта Пятра Клімука, адрасаваная маладому чытачу, — «Зоры — побач». «Мы, касманаўты, — тыя нямногія пакуль што людзі, пагляд якіх раптам пашыраўся настолькі, што страчваў усе адзнакі зямной звычнасці і ператвараўся ў макрапагляд. З вышыні 300—350 кіламетраў зрок наш ахопліваў такую прастору, што міжволі з грудзей вырываўся воклiч захаплення і здзіўлення. Да гэтага немагчыма прывыкнуць»,—піша Пётр Клімук. І дадае: «Аднак макрапагляд не перакрэсліваў і мікрапагляду».

Вось гэтае сумяшчэнне макрапагляду і мікрапагляду, бадай, найбольш каштоўнае ў лепшых стужках на касмічную тэму. Зроблены толькі самыя першыя крокі ў дакументальнай экраннай распрацоўцы касмічных праблем. Паступова намячаюцца шляхі больш глыбіннага даследавання чалавечай асобы ў сітуацыях найвялікшага выпрабавання фізічных і духоўных сіл. Паступова аўтары экранных работ пазбаўляюцца непатрэбнай парадкасці, ілюстрацыйнасці, пералічальнасці. Здзіўляючыся магчымасцям тэхнікі, яны не перастаюць здзіўляцца і магчымасцям чалавечага духу, невычэрпным рэзервам мужнасці і дабрыні.

Пэўна, з цягам часу з'явяцца на экране і зробленыя ў рэспубліцы мастацкія фільмы на тэмы касмічных палётаў — і рэалістычныя, і навукова-фантастычныя, і прыгодніцкія, і філасофскія. Яны гэтак жа патрэбны аўдыторыі, як і аператыўнія, строга навуковыя тэлерэпартажы і дакументальныя стужкі, у якіх раскрыта псіхалогія касманаўтаў.

**Вольга НЯЧАЙ.**

---

*ПА СЛЯДАХ ВЫСТУПЛЕННЯЎ «ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА»*

## «ГЭТА ЦЯЖКАЯ, ЦУДОЎНАЯ КЛАСІКА»

**Пад такім загалоўкам у газеце «Літаратура і мастацтва» ад 13 ліпеня 1979 года быў змешчаны артыкул М. Бандарэнкі, у якім закраналіся пытанні паляпшэння канцэртна-лекцыйнага абслугоўвання насельніцтва, выхавання музычных густаў у маладога пакалення.**

**Рэдакцыя атрымала рэагаванне на выступленне ад намесніка начальніка ўпраўлення па справах мастацтваў Міністэрства культуры БССР К. І. Белавусава, у якім гаворыцца, што Гомельскай абласной філармоніяй распрацаваны план мерапрыемстваў па паляпшэнні тэатральна-канцэртнага абслугоўвання моладзі на канцэртны сезон 1979—80 гг. Прадугледжана завяршэнне работы па стварэнні на базе Мазырскага музычнага вучылішча філіяла філармоніі, што дазволіць палепшыць канцэртна-лекцыйнае абслугоўванне раёнаў Палескай зоны. Будуць працаваць групы музычнага лекторыя ў цыкле «Школьная музычная гадзіна» ў раённых і сельскіх універсітэтах культуры, клубах-спадарожніках, Рэчыцкім ГДК.**

**Зацверджана тэматыка лекторыя для паказу ў сярэдніх школах, ПТВ, універсітэтах культуры, інтэрнатах. Прадугледжваецца ўвесці ў праграмы вакальна-інструментальнага ансамбля «Сябры» і рэвю «Музыкі» спецыяльныя раздзелы, прысвечаныя моладзі, якая вучыцца і працуе. Будуць рэарганізаваны калектывы «Вясёлыя галасы», «Балалайка» з улікам уядзення ў іх праграмы раздзелаў, прысвечаных моладзі.**

**Улічваючы важнасць закранутых у артыкуле праблем і наяўнасць асобных недахопаў у рабоце канцэртных арганізацый, Міністэрства культуры БССР у кастрычніку бягучага года правядзе савет дырэктараў тэатральна-відовішчных прадпрыемстваў па пытаннях далейшага паляпшэння ідэйна-эстэтычнага выхавання моладзі і школьнікаў.**

## «ЗАБЫТАЯ СЛАВУТАСЦЬ»

**— Выканком Мінскага гарадскога Савета народных дэпутатаў,—піша ў рэдакцыю намеснік старшыні выканкома Савета М. Д. Жукоўскі, — уважліва разгледзеў апублікаванае 1 чэрвеня ў газеце «Літаратура і мастацтва» пісьмо А. Кузняцова «Забытая славутасць». Выканком падтрымлівае прапанову аб устанаўленні мемарыяльнай дошкі на доме № 31 па Ленінскім праспекце, пры будаўніцтве якога была закладзена прывезеная дэлегацыяй горада Сталінграда цэгла, узятая з гераічнага Дома сяржанта Якава Паўлава.**

**Упраўленню культуры Мінгарвыканкома даручана ўзгадніць тэкст мемарыяльнай дошкі і падрыхтаваць праект рашэння выканкома аб яе ўстанаўленні.**

АБМЯРКОЎВАЕМ АРТЫКУЛ «ЗАМАХ НА ПОМНІК»

# КУРГАНЫ ГАВОРАЦЬ...

**ПРАМЧАЎСЯ ПА ГОРАДЗЕ КОННІК...**

Ён прамчаўся галопам па вуліцах Мінска, гэты невядомы коннік, пагодным летнім днём шаснаццатага стагоддзя. Паўз ратушу, Паўз царкву Святога духа. Асадзіў скакуна каля гандлёвых радоў, што акружалі бернардынскі манастыр. Ён дужа спяшаўся. Так, што зачапіўся, спешваючыся, за стрэмя шпорай і грымнуў на пыльны брук. Праходзілі недалёка манахі, хіхікнулі. Пажадаўшы ім лютым шэптам пекла на тым свеце, небарака падняўся і пакульгаў у крамку. Раззлаваны, ён не заўважыў, што шпору такі згубіў. Адарвалася. Цудоўная шпора, доўгая, фарсістая, з маленькай зорачкай на канцы...

Вось яна, гэтая шпора. Яшчэ не ачышчаная ад іржы стагоддзяў, яна ляжыць у акуратным папяровым пакеце побач з другой шпорай, на сто гадоў маладзейшай, побач з падковамі — чые гарачыя коні іх згубілі? — побач з нажом, на якім захаваліся рэшткі зжаўцелых касцяных тронак, побач з акоўкай рыдлёўкі, ключом, абломкам чапялы. Тут жа — кучка гліняных чарапкоў, тут жа — рыльцы старадаўніх бутляў — вялікіх, цяжкіх, з тоўстага шкла цёмна-зялёнага колеру. Смецце — у шаснаццатым стагоддзі. Навуковая каштоўнасць — у дваццатым.

— Бачыце, на бутлі кляймо — надпіс лацінскімі літарамі: «Лондан». Не бярыце адразу на веру — звычайны гандлёвы хітрык. Штоф зроблены ў нас, а не ў Брытаніі...

Валянцін Енісеевіч Собаль, навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі Акадэміі навук БССР, асцярожна кладзе аскялепак бутлі на месца.

— Смешна, але такімі знаходкамі мы абавязаны той акалічнасці, што ў сярэднявеччы ў гарадах не было сметнікаў, — расказвае ён далей. — Пабіўся ў гаспадыні гладыш — чарапкі на вуліцу. Пераламаўся нож — за акно. А смецце такое — частка таго, што археолагі называюць «культурным пластом». Рэчы, якія вы бачыце, знойдзены пры раскопках колішніх гандлёвых радоў вакол колішняга ж бернардынскага манастыра. Крамкі ў гэтых радах шмат разоў перабудоўваліся, але будыніны былі невысокімі, катлаваны для іх падмуркаў неглыбокімі. таму культурны пласт застаўся незачэпленым.

Экспедыцыя тут была комплексная. Складалі яе навуковыя супрацоўнікі Інстытута гісторыі Акадэміі навук — Зянон Станіслававіч Пазняк і я, а таксама работнікі Спецыяльнай вытворчай навукова-рэстаўрацыйнай майстэрні Алег Анатольевіч Трусаў і Ігар Мяфодзьевіч Чарняўскі. Месца, дзе мы працавалі, — цяперашняя плошча Свабоды і навакольныя вуліцы, — было да XVI ст. гістарычным цэнтрам Мінска. Тут стаялі ратуша, дамініканскі манастыр, старажытная царква Святога духа, вежа з гадзіннікам. Да гэтага часу захаваліся будынкі мужчынскага і жаночага базыліанскіх кляштараў, кафедральнага касцёла, бернардынскага манастыра.

Ці паспяхова мы папрацавалі? Лічым, што паспяхова. Вунь унізе, на глыбіні больш за чатыры метры, відзён пласт буйнога неачэсанага каменя. Гэта кладка канца XVII — пачатку XVIII стагоддзяў, а пад ім — культурны пласт XII — XIII стагоддзяў. А раней лічылася, што жыхары з'явіліся тут пазней — у XVI стагоддзі. Апроч таго, мы ўдакладнілі гістарычную тапаграфію горада. Такое ўдакладненне вельмі важнае на выпадак, калі гэтыя гандлёвыя рады будуць аднаўляцца.

Справа ў тым, што беларускім гісторыкам вельмі хочацца, каб гэтае месца стала гістарычным запаведнікам. Прыкра ж — у горадзе, мінулае якога налічвае больш як дзевяцьсот гадоў, помнікаў гісторыі засталося вельмі мала. І самае крыўднае, многія з іх зніклі адносна нядаўна...

Валянцін Енісеевіч бярэ ў рукі бурую ад іржы падкоўку ад бота (шаснаццатае стагоддзе!) і кладзе да шпоры, з якой мы пачалі гэты расказ, да ключа, да нажа. Сёлетнія раскопкі на вуліцы Бакуніна скончаны. Землякопы (школьнікі, актывісты гістарычных гурткоў) складаюць рыдлёўкі. Заўтра яны пачынаюць капаць на Замчышчы — ёсць такое месца паблізу ад Палаца спорту.

**МІНСК — МЕНСК—МЕНКА!**

— Скажыце, дзе тут працуюць археолагі?

— Ды вунь, на вале...

Нечаканы дожджык буйнымі кроплямі прыбівае да зямлі пыл, порстка стукае па рыдлёўках. Жылістыя загарэлыя хлопцы схаваліся пад дрэвам.

— Археолагі будзеце?

— Археолагі.

Тут, у Гарадзішчы, вёсцы каля Мінска, працуе экспедыцыя пад кіраўніцтвам аднаго з вядучых беларускіх археолагаў Георгія Васільевіча Штыхава. Самога Георгія Васільевіча не было, паехаў па справах у горад, і я гутару з яго памочнікам Васілём Андрэевічам Карпекам.

— Чаму зацікавіліся Гарадзішчам? А гэта, з пункту гледжання археалогіі, адно з самых цікавых месцаў у Беларусі. Тутэйшы вал — амаль восем метраў вышыні — быў колісь магутным абарончым умацаваннем. Раскопкі курганоў паблізу, такія знаходкі, як скарбы з арабскімі манетамі (гандлёвыя сувязі!), як металічны абразок, як кераміка з трызубцам, што быць магла толькі на княскім двары, — усё гэта сведчыць, што ў пракаветныя часы стаяла тут немалое паселішча аднаго са славянскіх плямёнаў, найхутчэй дрыгавічоў. А гэтае сведчанне, у сваю чаргу, падтрымлівае думку, што тут, на тэрыторыі цяперашняга Гарадзішча, стаяў пры нараджэнні сваім Мінск. Што толькі пазней войны або стыхійныя бядоты адсунулі яго да берагоў Нямігі. Што ранейшая назва горада — Менск — паходзіць не ад слова «мяняць», як многія вучоныя лічаць, а ад назвы мясцовай рачулкі Менкі.

Наша экспедыцыя зрабіла прарэзку вала, што памагло ўдакладніць час яго насыпу. Гэта дзесятае - адзінаццатае стагоддзе. Раскапана таксама колькі курганоў. Знаходкі? Можна паказаць...

У маленькім вагончыку («Надзвычай зручная рэч!» — хваліць яго Карпека) ляжаць на ўслончыку два чэрапы. Містычных пачуццяў гэта не выклікае. Магчыма, таму, што інтанацыя ў Васіля Андрэевіча будзённая: маўляў, чэрапы як чэрапы, не самае цікавае са знойдзенага, — лепш зірніце на сякеру адзінаццатага стагоддзя. Ці на фібулу (спражку) ад паяснога набору. А вось, бадай, сапраўды каштоўнае — срэбраны пярсцёнак адзінаццатага стагоддзя. Срэбра не ржавее, і пярсцёнак зусім не выглядае, як гаворыцца, на свае гады.

— Можна прымераць?

— Толькі асцярожна.

Насоўваю пярсцёнак на палец. Думка аб тым, што апошні раз яго надзявалі дзевяць стагоддзяў назад, казыча нервы.

— Срэбра, а асабліва золата, знаходзяць пры раскопках на тэрыторыі Беларусі рэдка. Мусіць, гэта і ратавала нашы курганы ад грабежнікаў. Пасля нядобрай памяці Татура — быў да рэвалюцыі такі, шукаў, скарбы і здабычу прадаваў аматарам - прыватнікам — археолагі доўга з такімі «калекцыянерамі» амаль не сустракаліся. Але апошнім часам выпадкі зладзейскіх налётаў на археалагічныя помнікі пачасціліся. Настолькі пачасціліся, што мы баімся ўжо расказваць пра пошукі і знаходкі.

Вось вам прыклад. Георгій Васільевіч Штыхаў неяк выступаў па тэлебачанні і расказваў пра курганы каля Заслаўя. Паказаў, дзе яны і як выглядаюць. І што? Калі неўзабаве туды накіравалася экспедыцыя, то ўбачыла на месцы курганоў ямы. Паспелі разрабаваць...

Ды каб адны «скарбашукальнікі»!.. Яшчэ большую шкоду археалогіі прыносіць безадказнасць некаторых кіраўнікоў прадпрыемстваў, устаноў, калгасаў. У «Літаратуры і мастацтве» ў артыкуле «Замах на помнік» прыгадваецца факт знішчэння групы курганоў у Крычаўскім раёне. На жаль, кожны археолаг можа прывесці такіх фактаў яшчэ і яшчэ.

Вось хоць бы тут, у Гарадзішчы. На вале, дзе мы з вамі стаім, згледзелася была камусьці пляцоўка пад футбольнае поле. Прыехаў бульдозер, разгарнуўся, зраўнаваў, зрэзаў лішняе, тое, што футбалістам, лічылася, будзе замінаць, — і... найкаштоўны культурны пласт загінуў. На вале засталася вялізная «лысіна» — бачыце, тут і трава не расце. А пад футбольнае поле, між іншым, знайшлі потым месца прыдатнейшае...

Ці яшчэ. Пад валам ладны кавалак зямлі засаджваецца бульбай. Яшчэ нядаўна там стаяла некалькі курганоў. Трактарыстам была з імі лішняя марока, паскардзіліся старшыні калгаса, той зноў жа прыслаў бульдозер... Каштоўных гістарычных захаванняў як не было.

А ведалі ж людзі, што гэтыя «капцы» цікавяць вучоных, бачылі пад нажом бульдозера косці і чарапкі!..

...Тым часам кончыўся дождж. Хлопцы з экспедыцыі пабралі рыдлёўкі. Стрэсваючы з брызентавых штармовак кроплі, пайшлі капаць далей.

Развітваюся з Карпекам.

— Пад'едзьце ў Заслаўе, — раіць Васіль Андрэевіч. — Там Юрый Заяц, адшукайце яго. Летась яму здорава пашанцавала.

...Еду ў Заслаўе.

**ЗАМЫЧАК СКАРДЗІЦЦА**

Летась Юрый Апанасавіч Заяц выкапаў булаву. Самую сапраўдную бронзавую булаву дзесятага стагоддзя, сімвал улады, знак вышыні становішча. Да гэтага археолагі маглі пахваліцца толькі булавой, знойдзенай у Растоўскай вобласці. Яшчэ адкапаў, даследаваўшы дваццаць курганоў, рэшткі ўзбраення, манеты.

Яго сёлетнія знаходкі — пацеркі, чарапкі, бронзавыя ўпрыгожанні — не такі эфектны «ўлоў», хоць і не менш цікавы для навукі. Але вынікі падводзіць яшчэ рана — Юрый Апанасавіч мае намер разварушыць за сезон покрыва стагоддзяў на плошчы аж у чатырыста квадратных метраў...

Працуе Заяц цяпер на Замычку — так у Заслаўі называюць вялікі земляны вал на ўскраіне. Замычак вельмі пацярпеў у вайну: немцы набудавалі ў ім шмат бліндажоў, у часе бою за горад тут паўзрывалася шмат снарадаў. А раны зямлі загойваюцца доўга. Канавы, акопы, варонкі, як шрамы, не зацягваюцца гадамі, дзесяцігоддзямі, стагоддзямі.

Замычак церпіць і цяпер.

— Вось глядзіце, — паказвае Юрый Апанасавіч, — схіляла ўзараны. Увішны гаспадар павялічыў свой агарод — выцягнуў і перанёс вышэй знак са словамі «Археалагічны помнік! Ахоўваецца дзяржавай!» Ужо больш як два гады Міністэрства культуры даймае і самога гаспадара, і мясцовыя органы ўлады пісьмамі. Маўляў, спыніце разбурэнне Замычка. А вынік — бачыце самі... І гэты гаспадар не адзін. Следам платы іншых агародаў лезуць на вал...

Наогул, склалася не зусім нармальнае становішча. Хто канкрэтна адказвае за непарушнасць гістарычных помнікаў і скарбаў зямлі? За гэты самы Замычак? За навакольныя курганы? Залетась сюды прынесла нейкіх спрытнюг, перакапалі, перапаролі аж трынаццаць курганоў, прытым па ўсіх правілах археалогіі, — хто ведае, можа, знайшлі і знеслі што-небудзь важнае для даследчыкаў?

Могуць сказаць: маўляў, ёсць жа Таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры. Правільна, ёсць. Ёсць таксама добрыя строгія законы. Але не памятаю, каб хто-небудзь быў, згодна з гэтымі законамі, пакараны за ўрон, зроблены помніку, і значыць, народнай памяці, або за злачынную да іх абыякавасць.

Можа, часткова гэта тлумачыцца тым, што даручаецца дзе-нідзе работа па захаванні помнікаў мінулага людзям, не вельмі ў гэтай справе дасведчаным. У Дзяржынскім раёне, памятаю, — было гэта некалькі гадоў назад, — пачалі руйнаваць гарадзішча Кальвініішча, што стаяла на тэрыторыі колішняга адзінага ў Беларусі кальвінісцкага манастыра. Я прыйшоў з гэтай турботай да тагачаснага старшыні раённага савета аховы помнікаў Мурзіча. Дарэчы, ён быў тады намеснікам старшыні райвыканкома і не мог не ведаць пра работы, якія на тэрыторыі гарадзішча вяліся. Дык што, думаеце, пачуў?

— На тэрыторыі нашага раёна гістарычных помнікаў няма!

— Як! А курганы, а гарадзішча!

— Гэта зямля, яе капаць трэба...

Мабыць, людзям, якія прыходзяць на работу ў органы Таварыства аховы помнікаў, трэба пачынаць з нейкіх курсаў, каб яны атрымлівалі хоць першапачатковае ўяўленне, што такое курган, што такое гарадзішча, што такое культурны пласт і г. д.

...Нямала ў археолагаў клопатаў і праблем. Патрабуюць яны абмеркавання і вырашэння.

◆

Лета. Самы сезон раскопак.

«...Курганы шмат чаго нам гавораць».

Неўміручы Купалаў радок пісаўся не ў дачыненні да археолагаў. А вось прыйшоў у галаву, калі я глядзеў, як яны працуюць.

Можа, і зараз, калі вы чытаеце гэты рэпартаж, дзе-небудзь пад Мінскам, пад Гроднам, пад Гомелем на раскопках чуецца шчаслівы воклічь «Ёсць!» — і рабочыя абкружаюць археолага, які ўсхвалявана паказвае знойдзеную манету, чарапок, завушніцу...

**С. НЯХАМКІН.**

# АФІЦЫЙНЫ АДКАЗ

**Рэспубліканскі савет Беларускага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры паведамляе, што пытанне пра захаванне помніка ў Салтанаўцы, узнятае ў артыкуле М. Замскага «Замах на помнік» (ЛіМ № 27 г. г.), разглядалася на вызной нарадзе камісіі ў саставе прадстаўнікоў Міністэрства культуры БССР, Міністэрства будаўніцтва і эксплуатацыі аўтамабільных дарог БССР, Рэспубліканскага савета таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры. У мэтах захавання помніка вырашана выканаць наступныя мерапрыемствы:**

**— адвесці вось трасы ўлева ад праектнага рашэння не менш чым на 3—4 м.;**

**— прадугледзець будаўніцтва падпорнай сценкі ля помніка з боку дарогі ў мэтах захавання пляцоўкі ля помніка;**

**— абмежаваць хуткасць руху транспарту па аб'язным шляху да 40 кіламетраў у гадзіну;**

**— пасля заканчэння работ па будаўніцтве дарогі ліквідаваць аб'язны шлях, што праходзіць ля помніка.**

**Гомельскаму філіялу «Белгіпрадора» прапанавана запраектаваць зрух восі трасы, узвядзенне падпорнай сценкі для ўмацавання пляцоўкі перад помнікам, добраўпарадкаванне тэрыторыі, якая прылягае да помніка. Будзе праведзены рамонт самога помніка. Праектныя рашэнні ўзгоднены з Міністэрствам культуры БССР.**

**Па ўзнятым у артыкуле пытанні аб разбурэнні помнікаў археалогіі ў вёсцы Кошань Крычаўскага раёна Магілёўскай вобласці (аналагічныя факты ёсць і ў іншых абласцях) Рэспубліканскі савет таварыства аховы помнікаў у мэтах папярэджання разбурэння помнікаў археалогіі накіраваў у абласныя саветы Таварыства і ўпраўленні культуры рэкамендацыйныя пісьмы для прыняцця неабходных мер па ўдакладненні спісаў помнікаў археалогіі па раёнах і давядзення іх да ведама ўсіх гаспадарчых, дарожных і меліярацыйных арганізацый, у раёне дзейнасці якіх знаходзяцца помнікі археалогіі.**

**Рэкамендавана ўнесці ў мясцовыя Саветы народных дэпутатаў прапановы аб замацаванні помнікаў археалогіі за гаспадаркамі-шэфамі; актывізаваць прапаганду савецкага заканадаўства аб ахове і выкарыстанні помнікаў гісторыі і культуры ў будаўнічых арганізацыях, калгасах і саўгасах.**

Анатоль КАЗЛОВІЧ

# Вяртанне да сябе

ПАД ГНЕЎНЫМ пісьмом стаяла дваццаць подпісаў, у тым ліку старшага прараба (начальніка ўчастка). Меліяратары скардзіліся на грубасць начальніка будаўніча-мантажнага ўпраўлення, які ў начальніках без года тыдзень, а насаліў калектыву дастаткова: у палявую сталоўку не завозяцца прадукты, меліяратары вымушаны збіраць шчаўе, выпрошваць у мясцовым калгасе бульбу...

Меліяратараў я паважаю. Бацька мой правёў у балотах паўтара дзесятка гадоў, і сам я пакаштаваў нялёгкага хлеба меліяратара, таму застацца глухім да скаргі сваіх калег не мог.

Начальнік БМУ сустрэў мяне насцярожана. Дыпламат з яго быў кепскі, свае пачуцці таіць ён не ўмеў. За рабочым сталом сядзеў ён у балоневай куртачцы, быццам заскочыў сюды на хвілінку. Размаўляючы са мной, нецярпліва круціў на пальцы капялюш, яўна паказваючы, што ён павінен некуды ісці, што я замінаю. Аднак жа гэты яго капялюш на пальцы сведчыў, які юны яшчэ начальнік, які наіўны і нявопытны. Толькі тры месяцы ён быў начальнікам БМУ, а да таго працаваў старшым прарабам у другім упраўленні. Было яму 27 гадоў, а на выгляд нават меней...

Калі зазваніў тэлефон, ён абрадавана схапіў трубку, але паведамілі яму нешта непрыемнае. Ён скрывіўся, злосна крыкнуў у трубку: «Я ж табе сказаў — рабі!» — і кінуў яе на апарат. «А з падначаленымі ён не цырымоніцца», — падумаў я і папрасіў падкінуць мяне на аб'ект, з якога прыйшла скарга: «Пажыву там, пагляджу, пагавару з людзьмі». «Пагаварыце-пагаварыце!» — падкалоў ён і пачаў званіць, перадаручаць камусьці «аднаго тут карэспандэнта»...

На ўчастак я дабраўся прыцемкам; усе былі ў зборы, гаманілі пад яркай лямпачкай у альтанцы-курылцы. Вакол альтанкі стаяла пяць спальных вагончыкаў, адзін вагончык — кухня-сталовая. Наводшыбе пыхкаў рухавічок, даючы ў вагончыкі святло, а яшчэ далей быў густы алешнік, які звычайна расце на беразе балота. З усім светам гэты астравок жыцця быў звязаны рацыяй і ахрыплым, нібы пастарэлым у эфіры, голасам начальніка. Старшы прараб, уручаючы мне для начлега просціны ў дзірачках і рыжых плямах, сказаў: «Які начальнік, такія і просціны. Іх даўно б выкінуць пара...». «Дык што ж вам замінае выкінуць?». «Я ж не начальнік. Не маем-с правоў, — пажартаваў прараб, ды замест жарту пачулася застарэлая крыўда. — Без яго ведама кроку ступіць не дазволена-с. Ну, адпачывайце з дарогі».

Адпачыў бы я з прыемнасцю, ды не мог заснуць пры такім тлуме. З альтанкі раз-пораз даносіліся выбухі рогату, каля вагончыка чуліся шолахі, крокі, стрыманы смех... І чаму не спяць? Заўтра ж падымацца на золку... Успомнілася, як мы прыязджалі да свайго экскаватара разам з ранішнім сонцам, і той стаяў увесь мокры ад ружовай расы...

Калі прачнуўся, сонца ў небе было ўжо не ружовае, а асляпляльна белае. З вагончыкаў выходзілі меліяратары, жмурыліся, пазяхалі, нетаропка мыліся, цягнуліся ў сталоўку. На сняданак былі смажаная бульба і чай — больш нічога.

— Рэдка мяса бывае, — сказаў старшы прараб. — Мы ж вам пісалі.

— А чаму не завозяць, не спрабавалі даведацца?

— У яго дазнаешся? Гэта ж дыктатар. «Табе сказана: выкарыстоўвай мясцовыя рэсурсы — выконвай!» — Прараб паспрабаваў імітаваць голас начальніка.

— А што за рэсурсы ён меў на ўвазе?

— У калгасе браць, — растлумачыў прараб. — Сам бяры, сам рэж, сам вязі... А яго навошта ў крэсла пасадзілі? У яго — намеснік па быце, спецмашына, аддзел рабочага забеспячэння. Не ўмее арганізаваць — на другіх валіць...

Пазней высветлілася: меліярацыйны ўчастак знаходзіцца за пяцьдзесят кіламетраў ад канторы БМУ, вазіць на такую адлегласць па палескім бездарожжы мяса было клопатна, неразумна, хоць пры ранейшым начальніку вазілі з горам напалам. Новы начальнік папрасіў старшыню калгаса, на тэрыторыі якога працавалі меліяратары, адпускаць мяса. Старшыня просьбу задаволіў, толькі з умовай: мяса будзе адпускаць у жывым выглядзе, да катлеткі даводзьце самі. Для начальніка БМУ гэта былі ўжо дэталі, па рацыі ён аддаў распараджэнне прарабу: «Мяса браць у калгасе!». «А хто будзе браць?». «Самі! — быў катэгарычны адказ. — Што, яшчэ мясніка вам выдзяляць?»

Уладарны тон начальніка не спадабаўся прарабу. Яшчэ не спадабаліся яму лішнія клопаты: трэба шукаць транспарт, чалавека, які паехаў бы ў калгас, прывёз мяса... Начальнік, сустрэўшы такі «сабатаж», не стаў тлумачыць, што выгадна, а што нявыгадна, закаціў прарабу разнос. Пачалася вайна характараў і нерваў...

Пасля сняданку меліяратары сабраліся ў альтанцы. Прыслухоўваліся да перагавораў па рацыі свайго прараба і начальніка.

Скрозь шум і трэск эфіру на дальні ўчастак даляцеў голас начальніка БМУ, нікольки не страціўшы сваёй уладарнасці:

— Далажы, як расстаўлены механізмы. Прыём!

— Як пастаўлены ўчора, так і расстаўлены. Бульдозерам няма фронту работ, таму што ў экскаватары паляцеў рэдуктар, а новы вы абяцаеце ўжо тры дні. Прыём!

— Чаму стаяць бульдозеры?—гнеўнай траскатнёй пасыпалася з рацыі. — Чаму не перавядзеш на сажалку? Прыём!

— Сажалка прынята. Прыём! — коратка адказаў прараб, а рабочыя ў альтанцы разам засмяяліся.

Як даведаўся я пазней, сажалка была прынята з недаробкамі, вышыня земляной дамбы аказалася недастатковай, неабходна было паднімаць яе. Але паколькі акт прыёму быў падпісаны начальнікам БМУ, ён не мог сваёй уладай патрабаваць ад прараба ліквідаваць недаробкі, ён мог толькі прасіць. А прасіць не дазваляў характар, ён загадваў.

— Сёння ж перавядзі на сажалку бульдозеры! Прыём!

— Пісьмовы загад будзе? Прыём!

«Вайна самалюбстваў» прымала зацягнуты характар. Занятыя гэтай вайной, абодва бакі не думалі, што бульдозеры прастойваюць, што дамба недароблена, што аб'ект не будзе закончаны ў тэрмін.

«І што ты зробіш з імі, што яны не падзялілі?».

З гэтай думкай ад'язджаў з аб'екта.

Вадзіцель бензавоза, што вёз мяне ў кантору БМУ, даводзіўся нашым начальнікам у бацькі, пра скаргу ў рэдакцыю ведаў. Ён сказаў:

— Замнога начальства, таму і спрачаюцца. Я вось адзін, ды яшчэ руль са мной,— ён пагладзіў чорны руль цяжкімі далонямі, — няма з кім спрачацца! Сказалі, прывязі на аб'ект салярку — прывёз. Сказалі, адвязі карэспандэнта — адвёз.

— А калі б вам загадалі пасля мяне везці на аб'ект гаручае? Вы ж толькі ноччу сюды прыехалі б...

— А мне загадваць не трэба, — сказаў ён пакрыўджана, павольна. — Сам бачу, што і калі трэба. — Яшчэ памаўчаў трошкі. — Я ў вайну таксама руль круціў. На палутарцы, пры батарэі. Яны, мае пушкары, паляць на высотцы, а я ў ляску стаю з машынай. Адчуваю, снарады вось-вось скончацца. А як падвязеш? Высотка тая ўся пад прыцэлам, пекла навокал. Чую, перасталі мае бухаць. Значыць, снарадаў няма. Паслухаў яшчэ — ціха. Што тут рабіць будзеш? Паплываў на далоні, сеў, паехаў... Праскочыў! Езджу, як бачыш. — Ён зноў пагладзіў руль, як гладзяць руку любімага чалавека. — Тут непадалёк наш экскаватар стаіць. Яму сёння патрэбна салярка. Я гэта і без начальства ведаю. Вунь, справа, гляньце, яго страла...

У кустах вербалозу я заўважыў стралу экскаватара.

— Дык вы прывезяце сёння салярку?

— А як жа! Дамоўленасць...

— Тады стойце! Я пабуду тут!

Я выбраўся з кабіны і напрасткі, праз балота, пайшоў да стралы.

Экскаватар прабіваў магістральны канал праз кусты і багну, вёў за сабой роўненькі парэз на чорным балотным тарфяніччы. Гэта Э-652, я пазнаў яго адразу. Забытым пахам гарачага рухавіка дыхнула на мяне, і столькі ўспамінаў ажыло! Такі ж канал на такім жа экскаватары мы пракладвалі непадалёк адсюль, у балотах Драгічынскага раёна. Працавалі папарна, у дзве змены: бацька, Сяргей, Сцяпан, я. Дзень і ноч экскаватар быў у забоі. Толькі адно замінала нам — нясвоечасовы падвоз гаручага ці якой запчасткі...

Машыніст заўважыў мяне, спыніў работу,спусціўся на зямлю. Быў ён у майцы і ў тапачках. Калі спускаўся з кабіны, насунуў гумавыя боты. Я сказаў пра сябе. Ён, бачу, не надта каб паверыў. Глядзіць на мяне недаверліва, гаворыць з някрыўднай патрабавальнасцю:

— А пакажыце дакуменцік!

Дастаў з кішэні кавалак анучкі, выцер рукі, асцярожна разгарнуў мае «корачкі», уважліва прачытаў. І па-сяброўску працягнуў мне руку:

— Андрэй Сямёнавіч Кашалевіч! Па якой патрэбе да нас?

— Быў на вашым участку. Праязджаў міма, думаю, пагляджу. Я некалі на такім працаваў, — кінуў я ў бок экскаватара. — Дайце некалькі каўшоў выкінуць!

Ён недаверліва ўсміхнуўся:

— Дам! Калі атрымаецца, — дадаў шматзначна.

Я сеў за рычагі. Ён па-ранейшаму глядзеў з недаверам.

— Што гэта? — спытаў ён, паказваючы на рычаг.

— Заборны трос.

— А гэта?

— Пад'ёмны трос, — адказаў я няўпэўнена. — Толькі... у нас неяк не так было...

— У вас гэты рычаг стаяў вось так, быў карацейшы?

— Ага, так!

— Зразумела! Заводская канструкцыя, — сказаў ён. — А я змяніў. Дайце руку! Глядзіце, як было ў вас: здымаеце руку з гэтага рычага і пераносіце на гэты — назірайце за яе рухам. Бачыце, ідзе ўправа, уверх, а затым уніз. Бачыце, колькі часу траціцца! І нязручна, і рука стамляецца хутка. Я гэты рычаг зрабіў даўжэйшым, прыгнуў яго ўправа. Глядзіце — рраз! І рука адразу на гэты рычаг! Зразумелі? — У блакітных вачах было бацькоўскае жаданне растлумачыць мне сутнасць удасканалення.

— Зразумеў! — адказаў я. — Але без трэніроўкі, мусіць, нічога ў мяне не атрымаецца.

— Ага, трэба набіць руку, — згадзіўся ён. — Тут жа яшчэ тармазы перароблены. Глядзіце. Пераставіў педалі, крыху прыгнуў гэту рэйку, памяняў нагрузку на ногі. Цяпер нагам лягчэй, а справа ідзе весялей. — Ён таксама павесялеў. Яму падабалася паказваць мне свае няхітрыя хітрасці і назіраць за маёй рэакцыяй. — А паглядзіце яшчэ коўш, — прапанаваў ён.

Мы пайшлі да таго каўша.

— Вось коўшык, — сказаў ён і пнуў нагой жалеза, якое мокра блішчала. — У вас такі быў?

— Такі. Толькі вось тут былі зубы, а гэта...

— Суцэльная рэжучая кромка! Я выкаваў яе з трактарнай рысоры, паставіў замест зубоў. З тымі зубамі была адна марока. Зямлю яны грызуць спраўна, а пянькі, кустоўе імі не перарэжаш. Нацягаюць пад коўш купу, валэндаешся, пакуль адкінеш ад канала. А час бяжыць... Затое цяпер я даганяю яго, мой ножык чыкае ўсё падчыстую.

— Някепска! — сказаў я, разглядаючы той «ножык».

— А тут, бачыце, дзіркі, — пнуў ён наском бота ў заднюю сценку каўша. — Выбіралі грунт з-пад вады?

— Выбіраў...

— Успомніце, якая марока была! Вада запоўніць коўш, не саступае грунту яго законнае месца. Круціш машыну дарэмна, чэрпаеш пустыя каўшы. Дык я тут чатыры дзіркі прабіў, праз іх грунт выціскае ваду.

— Няблага! Вы, бачу я, і гусеніцы перарабілі?

— Ага, шырокія паставіў, са спісанага шэсцьсот пяцьдзесят трэцяга. Ідзе хоць куды! О! — тупнуў ботам. — Нават па гэтай кашы паўзе. А раней, са сланямі, адна бяда была...

Была бяда, праўда. Слані — гэта бёрны, якія падсцілаюцца пад экскаватар на багнішчы. Быццам гаць, якую бервяно за бервяном пераносіць страла экскаватара. Перыядычнасць была такая: дзесяць хвілін працы, тры-чатыры хвіліны перанос бёрнаў. Уяўляю, колькі часу сэканоміў Кашалевіч! Я не ўтрымаўся і спытаў пра гэта.

Адказ у яго быў падрыхтаваны:

— У год атрымліваецца дзве з паловай тысячы эканоміі, калі перавесці ў рублі. Гэта мне ў бухгалтэрыі сказалі, як прэмію давалі. Дык вы тут паглядзіце, калі ахвота, а я палезу... — Ён узяўся за парэнчы, каб падняцца ў кабіну.

— Я пабуду тут, пачакаю машыну. Ён салярку абяцаў вам прывезці сёння. Прывязе?

— Прывязе? Закон!..

Кашалевіч сеў за рычагі. Працаваў ён дакладна. Коўш не хістаўся на тросах у пошуках месца, а падаў туды, дзе трэба было, без перадыху ўгрызаўся ў зямлю, затым на імгненне застываў і перакульваўся далёка ад канала, бліснуўшы адпаліраваным донцам. Чыстая работа! Вось так працаваў і мой сусед Сцяпан Казловіч. Сцяпан і цяпер працуе, а бацькі раптоўна не стала...

...Салярку знаёмы шафёр прывёз пад вечар. Да экскаватара па балоце ён не пад'ехаў. Кашалевіч дастаў з машыны металічныя саначкі, на іх загрузілі бочку з гаручым і лёгка дацягнулі да экскаватара.

— А другую бочку вязі...

Кашалевіч задумаўся. Разгарнуў прамаслены план-макет. Удвух яны пачалі меркаваць, куды даставіць бочку, каб не кацілі яе перад экскаватарам. Яны прыкідвалі і так і гэтак, і нават сонца, што заходзіла ўжо за кустоўе, не падганяла іх. Нейкая вельмі ўплывовая сіла затрымлівала механізатараў каля экскаватара, на балоце, патрабавала бездакорнага выканання яе загадаў. Гэта была ўлада справы, якой абодва служылі.

Не прараб і не начальнік загадалі шафёру ехаць наўперад начы на балота. Машыністу Кашалевічу не майстар даў указанне вычэрчваць графік сваёй працы на тыдзень наперад, перарабляць экскаватар, эканоміць грошы і час, а падказалі інтарэсы справы, загадала ўлада справы.

Знайшліся такія, што лічылі начальніка БМУ няўмелым кіраўніком, а Кашалевіч не мае скаргаў і прэтэнзій?

— А на што скардзіцца? — здзівіўся ён. — Праца ідзе... А што гарачы начальнік — дык гэта характар. Усе мы з мухамі. Не, справу ён знае. Гэта — не прараб. Той гарцуе пры справе, пісьмы піша, а бульдозеры стаяць.

Дваццаць чалавек пісалі пра начальніка БМУ зусім адваротнае, але я паверыў аднаму — экскаватаршчыку Кашалевічу. Таму паверыў, што ўбачыў: з дзелавым чалавекам у начальніка БМУ дзелавыя ўзаемаадносіны, канфліктаў не ўзнікае. Калі так — можа начальнік аддзяліць свае эмоцыі ад сваёй улады, паставіць паміж імі справу. А калі змог, значыць, сам стаў падуладным у вышэйшага начальства — справы.

У свядомым імкненні раздзяліць сябе, ва ўменні падпарадкавацца справе і ёсць, напэўна, талент кіраўніка. У гэтым я ўпэўніўся яшчэ раз пасля сустрэчы са старшынёй палескага калгаса імя Калініна Аляксеем Сцяпанавічам Сутарыкавым.

Спачатку ён моцна мяне збянтэжыў. У калгас я прыехаў летам, на ўборку. У рэдакцыі атрымаў устаноўку: калгасы павінны жаць у першую чаргу высокаўрадлівыя ўчасткі; пакуль стаіць добрае надвор'е, разумна выхапіць лепшае, горшае — як атрымаецца, якая будзе абстаноўка ў далейшым. У калгасе імя Калініна жалі дружна, як нідзе, усе камбайны былі ў полі ў дзевяць гадзін і чакалі, пакуль падсохне раса. Калі раса спадала, яны ехалі ў загон. Толькі не на высокаўрадлівыя ўчасткі, а на самыя бедненькія. Прычына для рэзкай крытыкі няўмелай тактыкі старшыні была ў наяўнасці.

— А вы на зуб паспрабуйце «сваю ўстаноўку»! — прапанаваў Сутарыкаў без хітрыкаў. — Вось каласок з высокаўрадлівага ўчастка. А вось — з бедненькага. Пакаштуйце, не саромцеся.

Прыйшлося паспрабаваць. Высокаўрадлівае зерне яшчэ не акруглілася як належыць, яшчэ белая вадзіца з яго цяк-

(Заканчэнне на стар. 14).

# ПАЧАТАК ШЛЯХУ

Таццяна Малышава—з маладога пакалення мастакоў славутага шклозавода «Нёман». Яна прыйшла на завод сем гадоў назад, адразу пасля інстытута, дзе вучылася на факультэце мастацкага шкла і керамікі. Прыйшла ў знаёмы ўжо калектыў—на «Нёмане» працавала яна над дыпломнай работай, над вітражом «Музыка».

Пачатак творчай дзейнасці на такім прадпрыемстве наўрад ці мог быць лёгкім. Асвоіць спецыфіку работы мастака на вытворчасці, вывучыць тэхналагічныя магчымасці завода, зразумець і прадоўжыць выпрацаваныя мастацкія традыцыі — не проста і адказна.

Хуткаму станаўленню маладой мастачкі, акрамя яе несумненнай таленавітасці, спрыяла і пастаянная ўвага вядучых мастакоў завода У. Мурахвера і Л. Мягковай, і творчая атмасфера ў калектыве, і наяўнасць выдатнай эксперыментальнай базы і майстроў-выканаўцаў. У гэтых умовах фарміруюцца творчыя погляды Т. Малышавай, яе эстэтычная праграма.

Самая важная задача калектыву мастакоў — праектаванне ўзораў посуду і бытавых рэчаў для масавай вытворчасці. І тут Малышава дэманструе своеасаблівае, строгае, рацыянальнае разуменне дэкаратыўнасці. Набор посуду, які яна прапаноўвае для кафэ і рэстаранаў, можна выкарыстоўваць у некалькіх варыянтах сервіроўкі. Рытмічныя чаргаванні канструктыўных яго частак, аб'ёмаў — простыя мэтазгодныя формы лёгка групуюцца ў асобныя малыя прыборы.

У праектаванні бытавых рэчаў мастачка ўмела выкарыстоўвае дэкаратыўныя і пластычныя магчымасці менавіта гладкага шкла. Посуд амаль празрысты, святло свабодна пранізвае яго сценкі, афарбоўваючы шкло ў пяшчотныя паўтаны. Гэткія ж прыгожыя формы і дэкор маюць яе мадэлі крышталёвых вырабаў для прэса: попельніцы, салатніцы, дэсертныя наборы, вазы.



Набор «Дэсертны».



Дэсертны набор (мадэль для прэса).



Попельніца (мадэль для прэса).

Набор посуду для кафэ і рэстарана.



Дэкаратыўныя формы «Ракавіны».

У першых работах Малышавай, выкананых на заводзе,—ці то гэта бытавыя формы, ці то ўнікальныя творы,— адчуваецца ўплыў традыцый. Шукаючы разнастайныя формы, дэкор, колеравыя рашэнні, Малышава звяртаецца да розных тэхналогій, розных прыёмаў апрацоўкі шкла. Яна ўжывае каляровыя наклады — ад празрыстых лінзачак на каляровым фоне да арыгінальных жывапісных колеравых разліваў у тоўшчы бясколернага шкла. Работа над унікальнымі творамі дапамагае ёй у рабоце над узорамі для масавай вытворчасці, вучыць думаць вобразна, смялей эксперыментаваць. Але калі ў бытавых рэчах Малышава часцей імкнецца да строгай выразнасці формы, працуючы з бясколерным шклом, выкарыстоўваючы пэўныя метады апрацоўкі для атрымання выразных сілуэтаў, то для яе унікальных твораў характэрна павышанае пачуццё дэкаратыўнасці, узбуйненне форм і прапорцый (дэкаратыўныя формы «Ракавіны»). Мастачка нібыта сцвярджае самакаштоўнасць такіх работ.

На пытанне аб вытоках сваёй творчасці Таццяна Малышава адказала, што хацела б прадоўжыць творчую лінію такіх цікавых майстроў савецкага шкла, як «нёманскія» мастакі У. Мурахвер і С. Раудвеэ.

Наборы посуду «Святочны», «Бэзавы», «Летні», вазы «Крышталі», дэкаратыўныя камплекты «Канцэнтрычны», «Архітэктоніка», «Адбітак»... Пералік можна было б прадоўжыць. Творчыя поспехі Малышавай значныя. Яе работы экспанаваліся на рэспубліканскіх і ўсесаюзных выстаўках, у экспазіцыях савецкага шкла на выстаўках у Фінляндыі, Даніі, Англіі, Індыі. Яе творчасць менш за ўсё вымагае канчатковай высновы — яна маладая, эмацыянальная, поўная праблем, што яшчэ чакаюць свайго вырашэння. І надалей у творчасці маладой мастачкі хацелася б знайсці пацвярджэнне нашых лепшых спадзяванняў.

**Р. ВАЛАДЗЬКО.**

# ВЫСТАЎКА Ў ГАСЦЯХ У БАБРУЙЧАН

У бабруйскай выставачнай зале адкрылася выстаўка выяўленчага мастацтва «Па ленінскаму шляху». Яна створана па матэрыялах Усесаюзнай выстаўкі, прысвечанай 60-годдзю Вялікага Кастрычніка, якая экспанавалася ў Цэнтральнай выставачнай зале Масквы ў Манежы ў 1977 годзе. За два гады з творамі, прадстаўленымі на гэтым усесаюзным вернісажы, мелі магчымасць азнаёміцца жыхары Запарожжа, Ялты, Валгаграда, а сёння зрабіць гэта пашчасціла бабруйскім аматарам выяўленчага мастацтва.

У экспазіцыі выстаўкі — звыш 120 твораў жывапісу, графікі і скульптуры. Аўтарамі іх з'яўляюцца мастакі і скульптары з усіх саюзных рэспублік. Сярод іх народныя мастакі СССР, лаўрэаты Ленінскай прэміі Е. Е. Маісеенка і Ю. І. Піменаў, народныя мастакі СССР, лаўрэаты Дзяржаўнай прэміі СССР У. М. Джапарыдзе і А. А. Мыльнікаў, народныя мастакі СССР М. М. Божы і У. Т. Тансыкбаеў, народны мастак Расійскай Федэрацыі В. К. Нечытайла, народны мастак Латвійскай ССР І. А. Зарынь, заслужаны мастак РСФСР В. М. Сідараў і іншыя. Нашу рэспубліку сваімі творамі прадстаўляюць Б. І. Казакоў, А. І. Кроль, З. В. Літвінава і Л. М. Марчанка.

Выстаўка выклікала вялікую цікавасць у бабруйчан, зала заўсёды перапоўнена наведвальнікамі, а кніга водгукаў поўніцца словамі шчырай удзячнасці.

**В. ЗЯМСКОЎ.**

# ВЯРТАННЕ ДА СЯБЕ

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 13).

ла, а нізкаўрадлівае ўжо хрумсцела.

— Якая будзе ўстаноўка? — хітравата спытаў Сутарыкаў. — Пшанічка тут радзейшая, кожны каласок асобна, а не сцяной стаіць. Вецер яго аблашчыць, сонейка прыпаліць, ён і паспее раней, і ўбіраць яго трэба раней. А пакуль мы яго змахнём, глядзіш, і высокаўрадлівыя да кандыцыі дойдуць. Лагічна? — спытаў ён, стоячы нада мною, высокі і грузны.

— Лагічна, — сказаў я і збянтэжыўся.

— А крытыкаваць не будзеце? — дапякаў ён.

Свой загад ён аддаў дзеля справы, а не дзеля ўстаноўкі.

Другое раздзяленне старшыні Сутарыкава адбылося на рыбалцы.

У калгасе імя Калініна многа сажалак, азёр. Старшыня адзін з першых у Беларусі на практыцы даказаў перавагу польдэрнага асушэння (раку не спрамляюць, не ператвараюць у мёртвы канал, а бяруць у дамбы, помпамі ваду з участка, што асушаецца, выкачваюць у раку). У сажалкі запусцілі малькоў, з іх выгулялася рыба. І Сутарыкаў запрасіў нас на юшку, дарэчы, і час абеду прыспеў.

Калі рыбка ўжо плавала ў чыгунку, мы пачулі з бліжняй дарогі рокат матора — кудысьці ішоў камбайн. Куды? Навошта? Што здарылася, калі ў разгар рабочага дня камбайн не на полі, а на дарозе? Я думаў, старшыня кінецца яму наперарэз; закрычыць, запатрабуе растлумачыць: куды, чаго? А затым кінецца ў майстэрню, пачне даваць распараджэнні: ты рабі гэта, а ты — тое...

Сутарыкаў нікуды не пабег. Ён прыўзняў ад юшкі галаву, прыслухаўся да дарогі, спакойна пацвердзіў:

— Камбайн паехаў. Пэўна, нешта стрэслася. Ну, ладна. Там дзяжурыць рамонтная брыгада. Я ім не патрэбен. Прашу да стала!

«Я ім не патрэбен!» Я арганізаваў справу — і на гэтым улада мая скончылася.

Майстар, прараб, начальнік БМУ ў пэўнай сітуацыі не патрэбны былі экскаватаршчыку Кашалевічу. А рамонтнікам калгаса імя Калініна не патрэбен быў старшыня Сутарыкаў. Яго такая акалічнасць не бянтэжыла, ён пацвердзіў: так, не патрэбен.

Уладарнічала справа.

Ведаеце, як Сутарыкаў камандаваў? Ён бярэ механізатара за локаць і гаворыць яму міралюбна:

— Я цябе папрашу, Пятро, вазьмі прычэп і падвязі разы тры саломы.

— Пазнавата ўжо, Сцяпанавіч, — кажа Пятро, — не паспею тры разы.

— Гэта мая просьба, Пятро. Трэба паспець! У Грышы зламаўся трактар, ферма без саломы. Не падвядзі, Пятро!

І Пятро бярэ прычэп, і робіць тры рэйсы.

А перад гэтым Пятро крычаў загадчыку гаража:

— А ты не загадвай! Я змену сваю адбарабаніў, не маеш права пасылаць мяне за нейкай там саломай, на ферме пастаянны возчык ёсць.

«Асабістая просьба» старшыні аказалася мацнейшай, чым загад адміністратара. Чалавечыя ўзаемаадносіны мацней за функцыянальныя.

Галоўны інжынер аднаго мінскага завода расказаў мне:

— Здавалася б, тэхналогія сама дыктуе, што каму рабіць. Усё адладжана, распісана — выконвай. Але выконваць можна з душой і без душы. І вось што я заўважыў. Як загадаеш — так і выканаюць. Прыйшлі ў цэх новыя аўтаматычныя станкі, паміж сабой яны звязаны трубкамі. Многа трубак, радоў пяць, масла праз іх цячэ, звязвае станкі ў адну лінію. Трубкі трэба акуратна ўкласці, прыгожа выгнуць на паваротах. Начальнік цэха даручыў гэтую справу Сашу Турчыну. Сашу я ведаю, некалі слясарылі разам. Слесар што трэба. А трубкі замацаваў абы-як. Саша, кажу, ты што гэта? Ды вось, адказвае, выклікаў у кабінет начальнік цэха, корпаецца ў сваіх паперках і загадвае, не гледзячы на мяне: «Каб заўтра да вечара было гатова, паняў? Выконвай!» Ладна, кажу, Саша, не крыўдуй ты на яго, навучыцца, як з людзьмі трэба. Ад сябе асабіста прашу, зрабі як паложана. Зрабіў! Вось так! Загадам цяпер не пройдзеш, з душой загадваць трэба...

З галоўным інжынерам я згодзен. Хачу толькі ўдакладніць: не толькі цяпер, але і раней з душой загадвалі.

У моманты вострай небяспекі, у хвіліны вышэйшай неабходнасці героі Юрыя Бондарава, Васіля Быкава, военачальнікі, якія мелі велізарную ўладу над людзьмі, пра гэта чамусьці забывалі і звярталіся да падначаленых: галубочак, я цябе прашу... ад сябе асабіста прашу...

Студэнт Міша Мароз заўважыў на транспарцёры бульбаўборачнага камбайна заржавелы снарад, але не кінуўся ўцякаць ад небяспекі. Ён схапіў і панёс яго далей ад людзей. Цаной свайго жыцця Міша выратаваў сяброў. Хто загадаў камсамольцу несці снарад, якая ўлада існавала над ім у той момант?

Вышэйшая ўлада, якая існуе на зямлі,— улада чалавека над самім сабой.

**Саюз пісьменнікаў БССР смуткуе з прычыны смерці літаратара Рыгора ХАЦКЕВІЧА і выказвае глыбокае спачуванне родным і блізкім нябожчыка.**

# З ВЕРАЙ У ЧАЛАВЕКА

З нагоды месячніка савецка-індыйскай дружбы ў Дзяржаўным мастацкім музеі БССР адкрылася выстаўка Мікалая Канстанцінавіча і Святаслава Мікалаевіча Рэрыхаў, бацькі і сына, творчасць якіх даўно вядомая і прываблівае шматлікіх гледачоў. У экспазіцыі, якая прыбыла з Масквы, 201 карціна з калекцыі сям'і мастакоў у Індыі. Работы розных гадоў, яны характарызуюць творчы шлях двух выдатных жывапісцаў нашага часу.

Аднак гаварыць пра іх толькі як пра мастакоў нельга. Іх творчыя і чалавечыя біяграфіі багацейшыя і больш значныя, яны цесна спалучаны паміж сабой.

Мікалай Рэрых нарадзіўся ў 1884 годзе ў Пецярбургу, у сям'і натарыуса. Атрымаў гуманітарную адукацыю на юрыдычным і гісторыка-філалагічным факультэтах Пецярбургскага універсітэта. Адначасова вучыўся ў майстэрні Куінджы ў Акадэміі мастацтваў, дзе і пачаў выяўляцца яго мастацкі стыль. Заканчваў жа навучанне ў Парыжы, у майстэрні Ф. Кармона. Ужо дыпломная работа мастака «Ганец. Паўстаў род на род» паказала незвычайную для акадэміі таго часу цікавасць да вытокаў рускай культуры і народнай творчасці, стаўшы першай у шэрагу карцін Мікалая Рэрыха пра язычніцкіх славян, пазначыўшы рамантычную навізну яго светапогляду.

Паспяхова працаваў ён і ў тэатры.

Але ў маі 1918 года фінскі ўрад закрыў граніцу з Савецкай Расіяй. Мастак, які знаходзіўся ў Фінляндыі на лячэнні, быў адрэзаны ад радзімы. Пераадольваючы ўзнікшыя цяжкасці, ён працягвае працаваць. Выстаўкі прыносяць поспех, прыносяць сродкі для паездкі ў Індыю, пра якую ён даўно марыў. Пачынаюцца гады навукова-мастацкіх экспедыцый па гарах і пустынях Індыі, Кітая, Манголіі. У 1928 годзе Мікалай Рэрых назаўсёды пасяляецца ў Індыі ў лагчыне Гулу, каля Гімалайскага хрыбта. Але вызначае творчасць мастака любоў да сваёй зямлі, сувязь з рускай культурай. Ён піша поўную рамантычнага пачуцця карціну «Васіліса Прыгожая». Патухаючыя матавыя фарбы гэтага палатна, яго кампазіцыйны рытм перадаюць пявучасць, глыбокую задуменнасць рускай казкі.

Вабілі мастака і ўсходнія паданні. Цэлы шэраг работ: «Іскандэр і самотнік», «Кушру і Шырын», «Мангольскія цуды», «Кліч настаўніка», — гэта не захапленне экзотыкай, а прачулыя, створаныя з добрым веданнем культуры Азіі, творы. Мікалай Рэрых інстынктыўна збліжае традыцыйна-чужыя мастацкія ўяўленні Еўропы і Усходу, ён імкнецца да аб'яднання і ўзаемаразумення людзей. Вобразы індыйскага бажаства Ламы ён успрымае ў духу старажытнарускай іконы. А ў невялікай карціне «Барыс і Глеб» лодка са святымі князямі паказана на фоне Цібецкага пейзажу...

У часе сваіх вандровак Мікалай Рэрых вывучае помнікі культуры і філасофскія вучэнні ўсходніх народаў, піша партрэт старажытнага кітайскага філосафа Лао-Цзы— сярод вяршынь Цібета думае той пра лёсы свету, пра мэту чалавечага існавання.

Цібет, Гімалаі... Як шмат сам мастак перадумаў, гледзячы на магутныя вяршыні! Узнікла серыя пейзажаў, якой, здаецца, няма канца. Мы толькі крайком вока ўспрымаем розны стан горнай прыроды: вечар, раніцу, туманны ці ясны дзень. У гэтых работах значна важнейшая велічная карціна прыроды, прыроды, якая не падуладна часу.

Рэзка кантрастуе з гармоніяй названых твораў трагізм карціны «Апошні анёл», напісанай у 1938 годзе. Яна нібы папярэджанне мастака, усхваляванага прадчуваннем блізкай вайны. Мікалай Рэрых і ў гэтыя гады працягвае сваю гуманную місію. Ён распрацоўвае нормы міжнароднага права па ахове культурных каштоўнасцей чалавецтва: прынцыпы «Пакту Рэрыха» дзейнічаюць і сёння.

Толькі смерць у 1947 годзе перапыніла гэту плённую дзейнасць.

Сын, Святаслаў Рэрых, працаваў побач. Мастацкі і вобразны лад яго твораў з'яўляецца працягам і развіццём творчасці Мікалая Рэрыха. Тонка адчуваючы прыроду, культуру, людзей Індыі, ён шукаў новыя ідэі і мастацкія сродкі — незвычайна яркі каларыт яго карцін, ім уласціва высокае эмацыянальнае гучанне. Буйныя фарбы вясновай прыроды падхопліваюць усхваляваную мелодыю пачуццяў («Вясна», адна з самых выразных работ у экспазіцыі).

Фарбы імклівымі патокамі заліваюць палатно, стройныя постаці індыйскіх дзяўчат нібы паўтараюць рухі марскіх хваляў і схіленых пальмаў («Дочкі мора»). Радасць, каханне, шчасце, мір — вось вобразная гама яго жывапісу.

Святаслаў Рэрых — выдатны партрэтыст. Партрэты бацькі, вядомых дзеячаў Індыі глыбока псіхалагічныя, адзначаны духоўнай чысцінёй. Мастак помніць, нагадвае пра пастаянную пагрозу міру («Мы самі будуем сваю турму», «Папярэджанне чалавецтву»), але зноў і зноў жыццё, цудоўнае і светлае, пануе ў яго палотнах.

**В. БУЙВАЛ.**



М. Рэрых. «Армагедон».



С. Рэрых. «Свяшчэнная флейта».

ЗАЙМАЛЬНАЯ ПРОЗА

(Працяг. Пачатак у №№ 14—32).

Працягваецца пошук забойцы свецкай прыгажуні Сусаны Дзіас. Прыватны дэтэктыў Арэс трапляе ў паліцыю: на яго падае падазрэнне, што ён забіў карліка, прадаўца латарэйных білетаў Сесара Бламбіна. Арэсу ўдаецца вырвацца з рук паліцыі.

## 20. «ХАЙ БУДЗЕ СВЯТЛО...»

Непагадзь скончылася. Праз прачыненае акно нейкай заняпалай гасцінічкі я ўзіраўся ў празрысты блакіт неба. Але на душы было змрочна.

Зноў лёг у ложак. Уключыў радыё. У апошніх навінах на ўсе лады скланялася маё імя. Я зноў выплыў на паверхню... Закурыўшы, я ачмурэла сачыў, як пад столлю паступова растаюць воблачкі дыму.

Я паглыбіўся ў роздум, супастаўляў і параўноўваў самыя важныя пункты гэтай праклятай загадкі. Разважаў я прыблізна так:

Першае. Сусану забілі з мэтай забраць у яе нейкую рэч, якую яна хавала разам з пісьмамі і каштоўнасцямі ў прадаўгаватай шкатулцы. Што гэта за рэч?

Другое. Усё ў спальні Сусаны сведчыла аб тым, што забіў яе чалавек, які быў з ёю ў інтымных адносінах. Хто?

Трэцяе. Не любы з яе палюбоўнікаў, а той, хто ведаў, што рэч каштоўная і дзе яна ляжыць.

Чацвёртае. Па словах Лю-мей, яны з Батлерам прысутнічалі ў той момант, калі Сусана атрымала нейкую вестку. Якую? Што рэч мае вялікую каштоўнасць?

Пятае. Верцьентэс перад тым як памерці ад рукі карліка напісаў на паперцы: «Білеты...» Што за білеты? Банкавыя? Непадобна на тое, таму што, як сказала Лю-мей, рэччу гэтай нельга было б карыстацца, калі б яна ці Батлер пра нешта заявілі паліцыі.

Шостае. Карлік, забойца Верцьентэса, быў распаўсюджвальнікам латарэйных білетаў.

І тут у галаве пачалі бязладна круціцца не зусім абгрунтаваныя здагадкі. Перад ад'ездам у Мексіку Верцьентэс падарыў Сусане камплект латарэйных білетаў, на адзін з якіх потым выпаў вялікі выйгрыш. Значыць, «рэч» і ёсць гэты білет. У каго купіў яго Верцьентэс? У карліка. Пасля забойства Сусаны карлік меў нейкую падставу падумаць, што Сусану забілі з-за гэтага білета. Пры продажы той серыі білетаў, магчыма, прысутнічаў нехта іншы, і карлік западозрыў яго ў забойстве. Ён адшукаў яго, і яны разам згаварыліся пазбавіцца ад усіх, хто мог што-небудзь ведаць пра выйграўшы білет. Менавіта таму, напэўна, і забілі Верцьентэса і спрабавалі забіць мяне. «Цудоўна, Арэс, — сказаў я сабе, — але хто ж гэты забойца і саўдзельнік карліка?» Батлер? Ён, ён і цяпер упэўнены, што білет у шкатулцы, і наогул навошта б тады спатрэбіўся яму Шасціпалец? Шасціпалец таксама не — ён нічога, здаецца, не ведае пра білеты. Акрамя таго, дапусціць, што ён быў палюбоўнікам Сусаны — абсурд. Сенатар? Зусім неверагодна: у яго выдатнае алібі. Рамераль? Гэты і мухі не раздушыць. І што можа значыць для яго выйгрыш — для такога багацея! Сота Падуа? Навошта яму гэты білет? У яго і так грошы куры не клююць. Хто ж астаецца? Супакойся, Арэс! А што, калі ў Сусаны былі і іншыя палюбоўнікі? Напрыклад, яе шафёр Макейра. А ці магчыма гэта? Пачнём спачатку. Шасціпалец? Не, не лагічна. Шасціпалец палюбоўнік Сусаны! Тады вернемся да першапачатковых здагадак. Увесь ход разважанняў выключае яго з ліку западозраных, асабліва калі ўлічыць час, які прайшоў ад моманту смерці Сусаны да таго моманту, калі ён ударыў мяне па галаве... А што, калі Шасціпалец па нейкай невядомай мне прычыне, забіўшы Сусану, затрымаўся ў яе доме даўжэй, чым хацеў? Скажам, адразу не заўважыў шкатулку, шукаў у іншых пакоях альбо, пайшоўшы ўжо без яе, вярнуўся, бо ўспомніў, што пакінуў нейкі след, ці...

Я ўсміхнуўся: у роспачы мой мозг ліхаманкава нагрувашчваў адну версію на другую.

Калі з Шасціпальцам сапраўды было так, як я сабе малюю, апошняя версія набывае сэнс. Ударыўшы мяне, ён уцёк з урнай, якая, паводле легенды пра Лонгаў, пачутай ім ад Батлера, мела вялікую каштоўнасць. Але тут не ўсё лагічна: у спальні Сусаны нішто не сведчыла аб тым, што паміж ахвярай і забойцам была барацьба, — у пакоі панаваў парадак, а зусім відавочна, што ніхто не дасць забіць сябе без аніякага супраціўлення. А можа, Сусана спала? О, тады б усё стала на месца! Калі сенатар з Кайтай пайшлі з асабняка, Сусана засталася ляжаць у ложку і заснула. Тут уваходзіць Шасціпалец і... Ага! Трэба з ім пагаварыць! Можа, потым, разглядаючы шкатулку і круцячы яе ў руках, ён незнарок націснуў на спружыну і адкрылася другое сакрэтнае аддзяленне? Але, каб так здарылася, навошта ён шукаў сустрэч з Лю-мей? А можа, усё гэта выдумка і другой тайнай спружыны не існуе? Чарговая хлусня Батлера?..

За доўгія гадзіны дабравольнага зняволення мая здольнасць лагічна мысліць пайшла на спад, і пад вечар я, нарэшце, заснуў. Але раптоўна прачнуўся: калі мая версія пра Шасціпальца правільная, хто ж тады забіў карліка? Таксама Шасціпалец? Але ж ён нічога не ведаў пра латарэйны білет... З кожнай хвілінай нарастала маё хваляванне... а таксама і разгубленасць.

А дзесятай гадзіне я прыняў душ і пайшоў з гасцініцы.

## 21. ПОМСТА ШАСЦІПАЛЬЦА.

А палове адзінаццатай ночы таксі, якое я наняў, праехаўшы па дузе, што злучае вуліцу Эхіда з Дэсампарадас, паволі рухалася па прыморскай Авенідзе дэль Пуэрта, мінаючы прытоны, шынкі і маленькія гасцініцы. Я шукаў адну з іх — «Ронду».

За руінамі царквы св. Паўла светлавая шыльда паказала, дзе знаходзіцца «Ронда». Трохпавярховая гасцініца стаяла ў адным з самых малаасветленых месцаў набярэжнай. Едучы паўз яе, я пільна ўзіраўся ў змрок, у якім патанаў будынак. Усярэдзіне панавала цішыня, і выгнутыя ўверсе аркай дзверы здаліся мне ўваходам у патаемную пячору.

Калі машына павярнула назад, я ўважліва ўглядаўся ў прыстань насупраць гасцініцы. Папрасіўшы вадзіцеля пачакаць мяне на рагу, я пайшоў да гасцініцы.

Увайшоў. Маленькі чалавечак з зеленавата-жоўтым тварам, што сядзеў за закратаваным акенцам злева, адарваў вочы ад газеты і зірнуў на мяне.

— Што вам трэба? — запытаў ён.

— Даведка.

— Тут пансіён, — прабурчаў чалавечак.—Два песа за ноч.

— У мяне ёсць дзе начаваць, — я сунуў скрозь краты паперку ў пяць песа. — Шукаю адну кітаяначку. Маладзенькую, невысокую. па імені Лю-мей.

— Такой не ведаю — адказаў дзяжурны, адсоўваючы грошы. — Ніякіх кітаянак тут няма.

— Тады, можа, тут жыве элегантна апрануты чалавек, у якога на правай руцэ адзін лішні палец.

— Магчыма,—чалавечак ашчэрыў ва ўсмешцы свае жоўтыя зубы і даволі красамоўна паварушыў двума пальцамі.

Я да канца прасунуў крэдытку ў акенца.

— Вельмі элегантны чалавек зняў у нас пакой некалькі дзён таму назад. У яго сапраўды адзін лішні палец... Ён у сябе, даўно не выходзіў. Нумар 5, другі паверх. — Дзяжурны зноў няшчыра ўсміхнуўся. — Ён ваш прыяцель?

— А калі не?

— Тады вы толькі пойдзеце за яго труной, — адказаў чалавечак і ўжо ад душы засмяяўся.

Я падняўся на другі паверх і знайшоў пяты нумар. Трымаючы ў адной руцэ пісталет, я свабоднай рукой павярнуў ручку дзвярэй, але яны не адчыніліся. Тады я пастукаў і адступіў убок. На парозе з'явілася Лю-мей.

— Уваходзьце, Арэс,— усміхаючыся, сказала яна.— Мы вас чакаем.

Я ўвайшоў. На невялікім століку стаялі шклянкі, бутэлькі з кока-колай і пляшка бакардзі. Шасціпалец адпіў са шклянкі, якую трымаў у руцэ, і пацвердзіў:

— Так, Арэс, мы вас чакаем. Сядайце. Хутка прыйдзе наш добры прыяцель і Батлер, і тады мы крыху пагаворым.

Я паставіў сваё крэсла так, каб сядзець тварам да дзвярэй. Лю-мей села на падлакотнік крэсла Шасціпальца і пачала пяшчотна варушыць яго чупрыну.

— Мы з Хуанам пакахалі адзін аднаго, — прастадушна абвясціла яна на даволі правільнай іспанскай мове. Вочы яе неяк дзіўна блішчэлі. — Батлеру давядзецца з гэтым змірыцца.

— Давядзецца, — падтрымаў яе Шасціпалец. — Без цябе, Лю-мей, не будзе ніякага дагавору, — ён прытуліў кітаянку да сябе. — Шкатулка ў мяне, і таму ўмовы ставіць буду я. Што на гэта скажаце, Арэс?

— З таго, што я ведаю пра Батлера, ён здасца, — адказаў я рашуча. — Ва ўсякім разе, каб атрымаць шкатулку, пойдзе на пэўныя ўступкі.

— Лю-мей пераканала мяне ў неабходнасці сяброўскай дамоўленасці з вамі. Мы нічога не выйграем, калі пачнём знішчаць адзін аднаго. Схавайце ж, Арэс, пісталет і вып'ем за дружбу. — Ён наліў крыху бакардзі ў пустую шклянку і спытаў: — Як вы любіце— неразбаўлены альбо «свабодную Кубу»?

— Я не п'ю, вялікае дзякуй.

З вачэй Шасціпальца пасыпаліся маланкі. Ён павярнуўся да Лю-мей:

— Ты ж казала, што будзе не так.

Лю-мей усміхнулася. Пусціла ў шклянку струменьчык кока-кола, і бледна-тапазавы колер бакардзі крыху пацямнеў.

— За шчырае ўзаемаразуменне, — сказала яна на жудаснай англійскай мове і выпіла. — Усё будзе, як трэба, даражэнькі. Арэс вып'е з намі за дружбу. — Лю-мей наліла ў шклянку бакардзі. — Выпіце, Арэс, — сказала прыязна і ласкава.

— Не, дзякуй, — зноў адмовіўся я.

Раптам Шасціпалец ударыў рукой па стале і скіраваў на мяне позірк. Потым ускочыў на ногі і схапіўся за жывот. Твар яго зрабіўся змярцвела-бледны. Спрабаваў выхапіць з-пад пахі пісталет, але рукі яго сутаргава закалаціліся, і ахопленае канвульсіямі цела грымнулася на падлогу.

Хоць я і чакаў нечага падобнага, але ў першы момант разгубіўся. Нахіліўся над целам, стараючыся выклікаць у Шасціпальца рвоту. Але гэта была памылка, нават горш таго — дурасць. Нешта цвёрдае раптам ударыла мяне па цемені, і пакой раскалоўся на тысячу зіхатлівых асколкаў...

(Заканчэнне ў наступным нумары).

# ТУДЭМА — СЮДЭМА...

Рыгор БОХАН

## СЛОВА

Жонна дагадзіла смачным абедам.

— Дзякуй, рыбачка! — пяшчотна сказаў муж.

— А якая?

Ён цёр лоб, успамінаючы марскія і рачныя рыбы. «Якая ж самая прыгожая?» — занепакоіўся і на момант уявіў беражон Гайны, здаецца, убачыў у ціхай затоцы трапяткую срэбную чародку.

— Плотачка! — вырвалася нечакана.

— Во яшчэ! — кінула яна і з твару зляцела ўсмешка. — Драбніца нейкая ў маленькай рачулцы.

Ён крыху збянтэжыўся, але спахапіўся і вымавіў нараспеў, з пачуццём:

— Чырванапёрачка!

— Ці ж я старамодная дама з пер'ямі ў капялюшыку? — кадзьмулася жонка.

Ён пацісну плячамі, нахмурыўся, прабубнеў:

— Траска, сардынела, скумбрыя....

— Сам ты мянтуз балотны! — ускіпела жонка.

Памаўчалі ўзбуджаныя, пачырванелыя. Яму чагосьці ўспомніліся Чэхаўскія «Мянтуз», «Конская прозвішча», паразважаў сам з сабой: «Не проста, аднак, злавіць і тую рыбіну, нялёгка таксама прыходзіць жаданае слова».

А яна ўздыхае, ян пакрыўджаная. Ён падумаў уголас:

— Салака, мойва, камбала...

— Што? — ускрыкнула, як уджаленая, жонка і ажно закалацілася: — Я аднавокая камбала? Сам ты шчупак здзерванелы, вугор капчоны, рак вараны.

Ён шумна ўздыхнуў, хапіўся за сэрца і грымнуў:

— Акула ты!

Змоўк, але бязгучна разяўлў рот, быццам рыбіна, якую выкінулі на пясок.

Жанчына ўсхліпнула, замітусілася:

— Я, я? Ты, ты... хек смажаны!

Падбегла да трумо, нервова паправіла модную прычоску, чамусьці тузанула адну, другую бліскучую завушніцу і войкнула ад болю.

Ён спадылба назіраў за жонкай, прамармытаў:

— А ёй да твару залатыя штучкі, — і раптам запляскаў у далоні: — Эўрыка! Ты — мая залатая рыбка.

Жонка палагоднела, з'явілася мядовая ўсмешка. І ўсё ж папракнула яго, што не адразу ўспомніў запаветнае слова. Але ўжо назвала серабрыстым хекам.

Яму палягчэла.

В. ЛІМАН

## ДЗЯМЯН І КАЗА

— Што гэта робіцца —
Каза ў капусце ходзіць!
І гэтулькі паесць,
А яшчэ больш нашкодзіць, —
Каля Казы на агародзе
Дзямян аж вые.—
А дзе, дзе вартавыя?
Я перцу ім задам,
Усіх іх разнясу!..

Дзямяне, не крычы, а выгані Казу.

## КОЛА

Знішчаючы усё наўкола,
Шумела і рыпела кола:
— Дзе ж праўда?
Дзе пачуцці агнявыя?
Чаму чужое гора не баліць?
Чаму рука руку, як кажуць, мые
І кожны хоча болей адхапіць?
Вось пакачуся, раскажу пра ўсё як ёсць!..
Калі ж яно ў «святой вадзе» памокла,
Адразу пацішэла і замоўкла,
Куды прапалі гнеў яго і злосць...

Пераклаў з рускай У. КАРЫЗНА.

Язэп ТАЧЫЛА

## БАНКЕТ

Не дай мне, бог, банкетнай смерці
Сярод закусак і віна.
У. ВЕРАМЕЙЧЫК.

Мо сню я сон, ці трызню крышку:
З нагоды выхаду у свет
Маёй яснюткай першай кніжкі
Ладкую з жонкаю банкет.

Банкет, ён розніцца з банкетам,
Ну, як більярд і спортлато.
А хто зраўняецца з паэтам
У банкетнай справе? Ды — ніхто!

А каб не сесці ў век ракетны
З банкетам прама ў крапіву,
Напяць фантазію патрэбна,
Нібы тугую цеціву.

Мне падказала бабка Прыпяць,
Дзе змог я ракаў закасіць,
Патрэбна ўмець не толькі выпіць,
Але, як след, і закусіць.

Сама не прыйдзе ў рот закуска,
Маўляў, глытай, такі-сякі!
Я прыхапіў у цешчы гусну,
Бычка прыгналі сваякі.

Не пакрыўдуюць, знаю, хлопцы
На самаробны мой нектар.
Па ментузу ды і па плотцы
Даваў мне прыпяцкі гектар.

Ну, а гасцей то, ёлкі-палкі!
Каго не стрэнеш толькі тут!
Хлапцы прыйшлі з сяла Міхалкі —
Мой першы клас! Рабочы люд!

Каб не было у тостах лішку,
Узяў я лейцы тамады.
Кульнём спачатку па кілішку
З мазутам прыпяцкай вады.

Ды штось падкралася знямога.
З усіх падкутых капытоў
Я раптам грымнуў на падлогу, —
Памёр. Скапыціўся. Гатоў!

Сыграў у скрынку, як ні горка.
Накрыла смерці барана.
І не гучала песня звонка
Сярод закусак і віна.

А госці п'юць, цярэбяць закусь,
Аж градам пот, нібы аруць.
Ад гусакоў ужо ні знаку.
Глядзіш і — крошкі падмятуць!

А трасцу! Хіба я цяцера?
На ногі ўскочыў і пры ўсіх,
Забыўшы рыфмы і паперу,
Пачаў я закусь сам касіць.

Цяпер пацверджу і ў анкеце:
Не дай бог з грукатам слана
Адкінуць ногі на банкеце
Сярод закусак і віна!

Аляксандр КАЛГАН

ЧУВАШЫЯ

## САРОКА

Сарока
Звоніць да Галубкі.
Пытаецца:
— Ці ты ля трубкі?
Эх ты...
Сядзіш сабе, дурнуля,
А на дварэ —
Такі дзянёк,
І твой харошы
Мужанёк
Гуляе у гаі
З Зязюляй.
Сядзяць абое
На суку.
І вярціхвостка Галубку
Усё пяе:
«Ку-ку, ку-ку»...
— Ды не мані!
І не мялі ты шмат.
Мой Галубок
Са мной
Гадуе галубянят.
Ён не бадзяецца
Нідзе.
Са мной на змену
Ён сядзіць ў гняздзе.

— Твой мужанёк
Ў гняздзе?
Ха-ха-ха-ха!
Нідзе не чула
Я такога.
Ў гняздзе мужчына,
Хоць памры,
Вось будзе смеху
У бары!
Я ўсіх сяброўак
Аблячу,
Пра гэта ўсім
Рассакачу.

Ляціць сарока-абібока:
— Ці чулі навіну.
Ну й ну!
Галубка Галуба
Прымацавала
Да гнязда.
Сама ж зляцела
Да любоўніка Дразда.

* * *

Сароцы мала веры.
Ды падчас,
Яна крадзе спакой
У нас.
У байкі гэтай
Усе словы
Навеяны мне плёткамі
Адной сарокі...
Саракагадовай.

Пераклаў В. ШЫМУК.

## Электрабрытва ў рамонце

У рамонт электрабрытву
Стась няголены аднёс,
Бо галіла вельмі брыдка
І гула, як паравоз.

Не пытайце, колькі часу
З той пары ў журбе прайшло.
Барада сягоння ў Стася,
Нібы тое памяло.

Х. ЛЯШКЕВІЧ.

## ПЫТАННІ-ГАЛАВАЛОМКІ

З чаго будуць рабіць сланоў, калі муху занясуць у «Чырвоную кнігу»?

●

Ці маглі нашы продкі адрозніць дзікую прыроду ад наваколь-нага асяроддзя?

●

Ці можа дубовая галава стаць ліпавай?

●

Якая існуе залежнасць паміж вопытам чытача і стажам тэлегледача?

●

Ці магчыма атрымаць прэмію за эканомію... творчай энергіі?

Р. РУМКО.

## З НЯМЕЦКАГА ГУМАРУ

У магазін «Прырода» заходзіць пакупніца і з абурэннем кажа прадаўцу:

— Надоечы я купіла ў вас папугая, які ўжывае розныя брыднія словы.

— Так, выхаванне ён меў кепскае, але затое не курыць і не п'е...

●

Ноччу ў паліцыю пазванілі, і нечы хрыплаваты голас залямантаваў:

— Ратуйце! Прыязджайце хутчэй. У пакоі — кот.

Разгневаны паліцэйскі ў адказ:

— Як вам не сорамна будзіць мяне па гэткай дробязі. Хто вы такі, уласна кажучы?

— Папугай!

●

Майер прачынаецца ноччу і бачыць злодзея, які корпаецца ў ягоным пісьмовым стале.

— Што вы там шукаеце?

— Грошы! — адказвае злодзей.

— А-а... Дык калі што знойдзеце, то і мяне пабудзіце, — адказаў Майер і захроп.

●

— Чаму вы адразу не занеслі пярсцёнак у бюро знаходак? — пытае суддзя ў абвінавачанага.

— Чаму я павінен быў яго аддаваць? — адказвае той. — На ім жа напісана: «Навекі твой»...

●

Уве скардзіцца раніцой на боль у жываце.

— А гэта ад таго, што ў цябе ў страўніку пуста, — кажа малому маці.

Удзень да іх наведаўся матчын брат і паскардзіўся на галаўны боль.

— А гэта ад таго, што ў цябе ў галаве пуста, — суцяшальна разважае малы.

●

Карл хваліцца свайму сябру:

— А мой бацька напаткаў аднойчы ў джунглях вялізнага льва, але ў таткі нават валасінна з галавы не ўпала.

— Нічога дзіўнага, твой жа бацька лысы.

●

— Калі жалеза ляжыць пад адкрытым небам, — тлумачыць настаўнік вучням, — то яно ржавее. А што робіцца ў такім выпадку з золатам?

— Яго крадуць, — адказвае Эміль.

Пераклаў М. ЛЯШЧУН.

## ДЗІВАК-ЧАЛАВЕК...




У грыбы...

Мал. П. КОЗІЧА.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск.

«ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА»

Выходзіць па пятніцах на шаснаццаці старонках.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.

Індэкс 63856 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12 / 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12 АТ 07682

Адрас рэдакцыі: 220600, ГСП, Мінск, вул. Захарава, 19.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная рэдакцыі — 33-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 33-25-25, адказнага сакратара — 33-19-85, аддзела грамадска-палітычнага жыцця — 33-22-04, аддзела прозы і паэзіі — 33-24-62, аддзела крытыкі і бібліяграфіі — 33-24-62, аддзела тэатра, кіно і музыкі — 33-21-53, аддзела выяўленчага мастацтва, архітэктуры і вытворчай эстэтыкі — 33-21-53, аддзела культуры — 33-19-65, аддзела інфармацыі, пісем і масавай работы — 33-22-04, аддзела мастацкага афармлення і машынапіснага бюро — 33-44-04, фоталабараторыі — 33-24-62, выдавецтва — 23-52-85, бухгалтэрыі — 23-77-65, карэктарскай — 32-20-64.

Рукапісаў рэдакцыя не вяртае.

Галоўны рэдактар Алесь АСІПЕНКА.

Рэдакцыйная калегія:

Заір АЗГУР, Ефрасіння БОНДАРАВА, Барыс БУР'ЯН, Мікола ГІЛЬ (адказны сакратар), Уладзімір ГНІЛАМЁДАЎ, Юрый ГРЫГОР'ЕЎ, Канстанцін ГУБАРЭВІЧ, Васіль ІВАШЫН, Віктар КАВАЛЕНКА, Аляксандр КАПУСЦІН (намеснік галоўнага рэдактара), Уладзімір НЯФЁД, Нічыпар ПАШКЕВІЧ, Аляксей ПЫСІН, Міхаіл САВІЦКІ, Барыс САЧАНКА, Язэп СЕМЯЖОН, Юрый СЕМЯНЯКА, Юлія ЧУРКО.